Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (Витебского горисполкома), иными словами – муниципализировались. Как свидетельствуют архивные документы, более половины от общего количества частных домов было национализировано в 1918 г. [4]. При горкомхозе в этом же 1918 г. был создан комитет по социализации имущества [3, л. 2].

Следует отметить, что государство, понимая всю сложность осуществления жилищной политики в условиях разрухи и финансового кризиса, активно искало оптимальные методы обслуживания и содержания жилищ в надлежащем виде. В этих целях в муниципализированных домах из числа квартирантов стали избираться специальные коллегиальные органы – домовые комитеты (домкомы), работа которых заключалась в расселении рабочих по квартирам, выдаче им продуктовых карточек и т. п. В случаях, когда в доме не избирался домком, городские власти назначали для него коменданта. В 1919 г. Витебским горисполкомом было издано «Обязательное постановление» № 13, которое дополнительно обязывало домкомы осуществлять надзор за текущим санитарным состоянием домов, дворов и прилегающих участков улиц; следить за своевременным вывозом мусора и очисткой отхожих мест и «делать раскладку уплаты за воду и очистку» [6, л. 99].

В учреждении «Государственный архив Витебской области» (далее – УГАВО) сохранились документы об образовании домовых комитетов в 1919–1920 гг. Создание их происходило на общем собрании жильцов. В основном оно проводилось по типовой схеме: собрались, обсудили необходимость создания домового комитета и избрали домком. Домкомы состояли их 3-х человек: председатель, товарищ председателя (совр. – заместитель) и секретарь. Для сбора платежей дополнительно избирался казначей [6]. Если жильцы не хотели подчиняться требованиям домкома и отказывались возмещать, например, коммунальные расходы, то домкому «оказывать всякое содействие» обязана была милиция [6, л. 79].

На вопрос о том, были ли должности членов домкома оплачиваемые, однозначно ответить нельзя, поскольку на собраниях данный вопрос почти не поднимался, хотя в некоторых протоколах зафиксированы факты обсуждения оплаты. Например, в протоколе жильцов дома под № 67 по Смоленской улице от 28.03.1919 г. сказано, что вопрос о вознаграждении членов домкома собрание оставило открытым [6, л. 42].

На каждый дом заводилась «Домовая книга», где учитывались все квартиронаниматели «на предмет обложения их [денежными взносами]

пропорционально квартирной плате, числу душ и удобствам данной квартиры» [6, л. 15 об, 79]. В книгу вписывались только те, кто постоянно проживал в доме, а также – арендаторы, которые пользовались нежилым фондом, например, магазинами, складами и т. п., если этот фонд являлся неотъемлемой составляющей дома. В книге также фиксировались поступавшие от квартирантов платежи [6, л. 78–79]. Что касается начисления платежей, то никаких льгот населению не предоставлялось [7]. В этом плане показателен протокол общего собрания жильцов дома № 20 по Советской улице, где рассматривался вопрос об уплате семьей инвалидов, которые никакого дохода не имели, взносов за пользование водой и за очистку помойных ям. Собрание приняло решение о том, что недопустимо «становиться на позиции частных благотворителей» и что в подобных случаях оплату должен на себя брать отдел социального обеспечения [6, л. 103].

Документы свидетельствуют, что создание домкомов не всегда находило поддержку. Подобные сведения обнаружены, например, в протоколе общего собрания квартирантов дома № 20 по Советской улице от 04.06.1919 г. В нем зафиксированы данные о том, что собрание состоялось только с третьего раза из-за плохой активности жильцов [6, л. 64]. Обязательное постановление № 13 разъясняло, что в тех случаях, когда квартиросъемщики не смогли организовать выборы домкома, горкомхоз сам вправе его назначить [6, л. 99]. Выявлен и другой документ – заявление жильцов дома № 44 по Нижне-Петровской улице от 13.07.1919 г. с отказом о выборах домкома в виду того, что горкомхоз в течение полугода не исполняет в отношении их дома своих обязанностей по уборке ретирад (отхожих мест) [6, л. 25], не производит ремонт водопровода. В фондах архива также имеется протокол жильцов дома № 42 по Володарской улице от 09.11.1919 г., где также говорится о недобросовестном отношении отдела городского хозяйства к обязанностям по ремонту водопровода, печей и погреба. Но в то же время наличие данных проблем ни как не повлияло на желание жильцов этого дома избрать домком. Наоборот, квартиросъёмщики высказали пожелание, чтобы домком не ограничивался сбором взносов и платежей, а выступал защитником их прав перед горкомхозом [6, л. 21–21а].

Интересен и протокол собрания девяти квартиронанимателей дома под № 67 по Смоленской улице (до муниципализации принадлежавшего семье Гуревичей) от 28.03.1919 г. [6, л. 42]. Помимо выборов домкома и обсуждения их обязанностей жильцами было установлено, что на первоначальные расходы по содержанию дома и на канцелярские расходы для домкома необходимо было внести единовременно по 10 руб.

Анализ документов о работе домкомов показал, что за счет жильцов производилось снабжение инвентарем дворников, обслуживавших муниципализированные дома. При этом оплата их труда осуществлялась за счет государства (из кассы горкомхоза). Жалование рассчитывалось на основе окладов, установленных профсоюзной тарифной комиссией [6, л. 15, 79]. Обнаружен протокол от 10.06.1919 г. заседания тарифной комиссии Витебского всеведомственного профессионального союза советских общественных и частных учреждений дворников и домашней прислуги для установления жалования дворникам конфискованных домов в собственность города [6, л. 103]. Анализ протокола показал, что дворники могли осуществлять уборку как территории одного дома, так и нескольких.

Для более успешной работы отдельные домкомы дополнительно объединялись в районные домовые комитеты (райдомкомы) [8, л. 27]. В 1919 г. в Витебске действовало 12 райдомкомов [9, л. 84; 10, л. 89–90]. Так же в архивных документах обнаружено заявление о создании 03.08.1919 г. в Витебске общегородского Совета домовых комитетов конфискованных домов в составе 6 человек [6, л. 59]. А в целях организации снабжения квартиронанимателей продовольствием и товарами жильцы домов объединялись еще и в другие кооперативные общественные объединения – уличные комитеты, о чем в фондах архива сохранилось постановление коллегии городского продовольственного комитета от 28.10.1919 г. [6, л. 19].

Но, несмотря на попытки организовать «правильное» обслуживание муниципализированных домов, итогом жилищной политики явилось резкое сокращение благоустроенного жилья: в Витебске к 1921 г. жилой фонд сократился почти на треть. Подобная ситуация была характерна для государства в целом, поэтому советское государство начало новую волну реорганизации. 08.08.1921 г. Совет Народных Комиссаров (СНК) РСФСР утвердил «Положение об управлении домами». По сути, с принятием данного документа в СССР начался процесс демуниципализации жилого фонда и передача его в коллегиальное управление жильцам путем создания жилищных товариществ (жилтовариществ) или вовсе – возврат в частную собственность. Этот документ положил начало ликвидации домкомов. Ликвидационный период для витебских домкомов продлился до конца до осени 1921 г. [5, л. 95–96; 9, л. 112], а райдомкомы хоть и были сохранены, но серьезно реорганизованы. В ходе реорганизации райдомкомам была передана вся практическая работа по управлению жилым фондом. Они ввели новый принцип управления домами: вместо домкомов стали

избирать уполномоченных от жильцов дома из расчета 1 уполномоченный – на 100 человек [13, л. 105–106, 109–112, 121; 14, л. 44; 15, л. 32–37]. В процессе реорганизации райдомкомы были сокращены до 3 единиц (по числу милицейских участков города) и переименование их в районные квартирные комитеты (райквартконы) [11, л. 61–62; 12, л. 24–25]. Данный процесс был одобрен постановлением коллегии отдела управления Витебского губисполкома сначала 09.02.1922 г., а затем 27.10.1923 г. [14, л. 44]. В фонде отдела коммунального хозяйства исполнительного комитета Витебского окружного Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (окркоммунотдела), являвшегося правопреемником отдела коммунального хозяйства Витебского губернского Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (губкоммунотдела), обнаружено объявление о распределении сети коммунальных домов и закреплении их за уполномоченными управдомами [15, л. 32–37]. Дополнительно обнаружен акт о распределении всех улиц города по образованным 3 районам [3, л. 87–88; 11, л. 61–62].

Так, с 1921 г. в Витебске часть муниципализированных домов управлялась через уполномоченных, избранных жильцами, а часть – через кооперативные органы – жилищные товарищества (жилтовариществa). Первые сведения о жилтовариществах относятся к 1922 г.

Окончательно муниципализация была остановлена постановлением 3-й сессии ВЦИК «Об основных частных имущественных правах», принятым в мае 1922 г. Часть из конфискованных домов возвращена частным лицам [21, л. 49 об]. Оставшиеся в собственности государства здания прошли повторное (юридическое) оформление и были переданы в аренду жильцам. Так, обнаружены выписки из газеты «Витебские известия губисполкома и губкома РКП(б)» № 127 от 07.06.1922 г. и № 130 от 10.06.1922 г. о сдаче муниципализированных домов в аренду коллективам (товариществам) жильцов [16, л. 218]. В фондах УГАВО имеются протоколы заседаний «Комиссии по рассмотрению материалов по вопросу об оформлении муниципализации домов Витебской губернии» за сентябрь 1922 г. В протоколе № 2 говорится о том, что комиссия организована 18.09.1922 г. в соответствии с приказом губкоммунотдела № 174 [16, л. 178]. Свидетельства о создании жилтовариществ имеются в докладе жилищно-земельного подотдела отдела коммунального хозяйства Витебского городского Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов о работе за период с 01.01.1923 г. по 18.04.1923 г. В нем говориться, что «главное внимание обращено на подготовительную работу… по сдаче коммунальных домов в аренду жилищным товариществам… выработан устав жилищных

товариществ, находящихся на утверждении» [17, л. 29]. Обнаружен также проект устава жилищных товариществ от 16.07.1923 г., утвержденный президиумом Витгубисполкома. Согласно ему жилищное товарищество создавалось из жильцов одного или нескольких смежных домов, «желающих взять на себя управление и эксплуатацию» [18, л. 223; 19, л. 149]. Также обнаружено постановление губкоммунотдела от 23.06.1923 г. № 51, в котором утверждаются договоры на сдачу в аренду муниципализированных домов жилищным товариществам [16, л. 116]. Дома в аренду сдавались специально для этого образованным Витебским управлением национализированных имуществ (ВУНИ). Однако образование товариществ в этот период не носило систематического характера: они возникали исключительно на добровольных началах [20, л. 215]. Эра ЖАКТов – жилищно-арендных кооперативов – началась с выходом 19.08.1924 г. постановления Центрального Исполнительного Комитета (ЦИК) и СНК СССР «О жилищной кооперации» и продолжилась до 1936 года.

Таким образом, домкомы представляли собой первый советский коллегиальный орган, призванный упорядочить процесс эксплуатации национализированных жилых зданий, организовать коммунальные платежи. Но вопросами технической эксплуатации домов домкомы не занимались, в результате чего жилой фонд Витебска сократилось почти на треть, а санитарное состояние города пришло в такое плачевное состояние, что губкоммунотдел в 1922 г. принял решение бесплатно произвести очистку городской территории от мусора и нечистот, и в первую очередь – именно в муниципализированных домах [5, л. 87; 9, л. 64]. После 1921 г. государство отказалось от содержания муниципализированного жилья. Начался процесс постепенной передачи государственного жилого фонда в собственность жилищных товариществ (кооперативов жильцов), в 1924 г. завершившийся.

### Список использованных источников и литературы

1 На момент начала национализации городского жилого фонда Витебская губерния с центром в г.Витебске была включена в состав Западной области. С провозглашением 1 января 1919 независимой Советской Социалистической Республики Белоруссии (далее – ССРБ) Витебская губерния включена в ее состав. В период со 2 февраля 1919 г. и до 3 марта 1924 г. губерния находилась в составе Российской Советской Федеративной Социалистической Республики (РСФСР).

2 Учреждение «Государственный архив Витебской области» (далее – УГАВО). – Ф. 1001 «Отдел коммунального хозяйства исполнительного

комитета Витебского городского Совета народных депутатов». Оп. 1. Д. 21.3. УГАВО. – Ф. 1001. Оп. 1. Д. 399.

3 Об итогах национализации жилья Витебска и передаче его в фонд горкомхоза в 1917–1921 гг. см. подробнее Буевич, Т. В. «Вы потеснитесь, граждане»: революционный жилищный передел Витебска в 1917–1921 годах / Т. В. Буевич //Великая Российская революция 1917 года в истории и судьбах народов и регионов России, Беларуси, Европы и мира в контексте исторических реалий XX–XXI века: материалы международной научной конференции. Витебск – Псков, 27 февраля – 3 марта 2017 года / Вит. гос. ун-т; редкол.: А. В. Егоров (гл. ред.) [и др.] – Витебск, 2017. – С. 184–190.

4 УГАВО. – Ф. 1001. Оп. 1. Д. 54.

5 УГАВО. – Ф. 1001. Оп. 1. Д. 27.

6 Бесплатное снабжение продуктами питания, промышленными товарами и обслуживание рабочих и служащих госпредприятий, членов их семей и красноармейцев по стране в целом было введено с 1 января 1921 г. в рамках реализации политики «военного коммунизма». Затем была отменена плата за топливо, коммунальные услуги.

7 УГАВО. – Ф. 302 «Отдел коммунального хозяйства исполнительного комитета Витебского окружного Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (Витебский окркоммунотдел)». Оп. 1. Д. 123.

8 УГАВО. – Ф. 67 «Отдел коммунального хозяйства исполнительного комитета Витебского губернского Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (Витебский губкоммунотдел)». Оп. 1. Д. 27.

9 УГАВО. – Ф. 955 «4-е отделение управления Витебской городской советской рабоче-крестьянской милиции».Оп. 1. Д. 4.

10 УГАВО. – Ф. 322 «Витебский городской Совет депутатов. Витебский городской исполнительный комитет». Оп. 1. Д. 236.

11 УГАВО. Ф. 56 «Витебский губернский Совет рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов и его исполнительный комитет (Витгубисполком)». Оп. 1. Д. 186.

12 УГАВО. Ф. 1821 «Отдел управления исполнительного комитета Витебского губернского Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов». Оп. 1. Д. 669.

13 УГАВО. Ф. 1821. Оп. 1. Д. 782.

14 УГАВО. Ф. 302. Оп. 1. Д. 37.

15 УГАВО. Ф. 302. Оп. 1. Д. 110.

16 УГАВО. Ф. 1001. Оп. 1. Д. 304.

17 УГАВО. Ф. 56. Оп. 1. Д. 223.

18 УГАВО. Ф. 56. Оп. 1. Д. 181.

19 УГАВО. Ф. 302. Оп. 1. Д. 148.

20 УГАВО. Ф. 67. Оп. 1. Д. 417.

УДК 27-9(476):929 Станкевіч

**С. Ф. ВЕРАМЕЕЎ**
(Гомель, УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)

# ПЫТАННІ ГІСТОРЫІ ХРЫСЦІЯНСТВА НА БЕЛАРУСІ Ў ПРАЦАХ АДАМА СТАНКЕВІЧА

*У дадзеным артыкуле вызначаецца, якія пытанні гісторыі хрысціянства на беларускіх землях і ў якой ступені знайшлі адлюстраванне ў працах Адама Станкевіча. Разгледзены погляды даследчыка на асноўныя падзеі гісторыі хрысціянства на Беларусі. Аўтар артыкула прыйшоў да высновы, што галоўную ўвагу А. Станкевіч надаў вывучэнню ролі хрысціянства ў гісторыі беларускага народа, праблемы выкарыстання беларускай мовы ў Рыма-Каталіцкай царкве, Уніі, беларускага хрысціянскага руху.*

Сярод айчынных даследчыкаў XX стагоддзя, займаўшыхся вывучэннем гісторыі Беларусі, вылучаецца постаць рыма-каталіцкага святара, грамадска-палітычнага дзеяча, філосафа, публіцыста Адама Станкевіча (1891–1949). За сваё жыццё святар паспеў напісаць 19 кніг і брашур, і больш за 2 тыс. эсэ, артыкулаў і нататкаў, у якіх значнае месца адводзілася пытанням гісторыі хрысціянства на беларускіх землях [1]. Яго працы публікаваліся ў Заходняй Беларусі ў часопісах «Крыніца» (з 1925 г. «Беларуская крыніца»), «Хрысціянская думка», выходзілі асобнымі выданнямі. У БССР працы А. Станкевіча былі невядомымі, іх публікацыя пачалася ў постсавецкі перыяд. Найбольш поўны збор твораў А. Станкевіча пад назвай «З Богам да Беларусі» быў выдадзены Інстытутам беларусістыкі ў Вільні ў 2008 г. [2]. Адзначым, што большую частку сваіх твораў А. Станкевіч напісаў на беларускай мове лацінкай. Цяперашнія выданні транслітараваны на кірылічны шрыфт.

У дадзеным артыкуле мы ставім за мэту прасачыць, якія пытанні гісторыі хрысціянства на Беларусі ўздымаў святар на старонках сваіх прац і якіх поглядаў пры гэтым ён прытрымліваўся.

Галоўнае значэнне для разгляду нашай тэмы маюць яго манаграфіі «Хрысціянства і беларускі народ (спроба сінтэзы)» і «Родная мова ў святынях». Праца «Хрысціянства і беларускі народ (спроба сінтэзы)» навукова-папулярнага характару, яна была разлічана на шырокія колы беларускіх чытачоў. А. Станкевіч імкнуўся паказаць у гэтай працы

ролю хрысціянства ў фарміраванні беларускага народа. Сучасны біёграф святара У. Конан назваў яе «адной з вяршыняў нашай філасофіі, гісторыі, грамадскай думкі» [3, с. 18].

Разгляд гісторыі хрысціянскай рэлігіі А. Станкевіч пачынаў ад Кірыла і Мятода, якія, выкарыстоўваючы славянскую (старабалгарскую) мову, «палажылі моцныя асновы для пашырэння навукі Хрыстовай і агулам прасветы па ўсіх славянскіх землях», а з'яўленне яе першых прыхільнікаў на беларускіх землях датаваў IX–X стст. [3, с. 38]. Пры гэтым даследчык прызнаваў, што да князя Уладзіміра былі толькі адзінкавыя выпадкі, калі мясцовыя жыхары станавіліся хрысціянамі [3, с. 18]. Хрышчэнне Русі ён адносіў да 988–989 гг. [3, с. 6]. Распаўсюджвалі новае рэлігійнае вучэнне на беларускіх землях баўгарскія, грэцкія і ўкраінскія святары на мове, якую даследчык назваў «баўгарскай (з дамешкам украінскай)» [3, с. 41–42].

А. Станкевіч, рыма-каталіцкі святар, высока ацэньваў значэнне прыняцця хрысціянства князем Уладзімірам, звязваючы з гэтай падзеяй пачатак «новай эры, новай праўды, новага жыцця» для продкаў беларусаў [3, с. 28]. Вынікам прыняцця хрысціянства ён лічыў змякчэнне нораваў насельніцтва, развіццё культуры, асветы, навукі, мастацтва, права, будаўніцтва, укараненне ў грамадстве паняцця грамадзянскай справядлівасці. Хрысціянства, на яго погляд, спрычынілася і да паўстання беларускай народнасці [3, с. 6–7, 36].

А. Станкевіч падкрэсліваў у сваёй працы, што князь Уладзімір знаходзіўся ў еднасці з Рымам, а «беларускае хрысціянства ў тыя часы было адзіным і непадзельным» [3, с. 21–22]. Увогуле, думка аб адзінстве хрысціянаў праходзіць праз увесь твор «Хрысціянства і беларускі народ (спроба сінтэзы)». Напрыклад, даследчык адзначаў той факт, што Еўфрасіння Полацкая лічыцца святой як у праваслаўных, так і ў Рыма-Каталіцкай царкве. А. Станкевіч звяртаў увагу на тое, што менавіта ў часы еднасці з Рымам з'яўляецца беларуская народнасць і ўзнікае першае палітычнае ўтварэнне на беларускіх землях – Полацкае княства. Еднасць хрысціянаў беларускіх зямель з Апостальскай сталіцай, на яго погляд, захоўвалася да пачатку XII ст. [3, с. 45, 49–50]. «Галоўнай апорай беларускай нацыянальнасці і культуры» ў XIII–XVI стст. ён называе праваслаўе [3, с. 58].

Значнае месца ў працах А. Станкевіча займае ўніяцкая праблематыка. Заключэнне ўніі ён лічыў заканамернай з'явай. Ён пісаў, што ідэя еднасці Праваслаўнай і Каталіцкай цэркваў атрымала распаўсюджванне на Беларусі ў XIV–XVI стст. У працы «Хрысціянства і беларускі народ (спроба сінтэзы)» разглядаліся абставіны склікання

Ферара-Фларэнційскага сабору і яго рашэнні. На думку даследчыка, Фларэнційская ўнія не атрымала развіцця на беларускіх землях з-за процідзеяння з боку Масквы і палякаў [3, с. 66–67].

XVI ст. ужо сучаснікі А. Станкевіча называлі «залатым стагоддзем» у гісторыі Беларусі. Ён згаджаўся з гэтым сцвярджэннем, але часткова: даследчык лічыў, што для Праваслаўнай Царквы гэта быў час крызісу і заняпаду, адным з наступствам якога і стала Берасцейская ўнія [с. 67–68]. Разглядаючы ў сваіх працах пытанне аб уніі, А. Станкевіч ніколі не закранаў дагматычных аспектаў аб’яднання Праваслаўнай і Рыма-Каталіцкай цэркваў. На думку А. Вашкевіча, ён не лічыў іх прынцыповымі [3, с. 122].

Берасцейскую ўнію А. Станкевіч называў «беларускай народнай верай», «апорай беларускай нацыянальнасці» ў XVII–XVIII стст. З уніяй ён звязваў адраджэнне царкоўнага жыцця, уздым асветы духавенства, развіццё беларускай народнай літаратуры [с. 70–75]. Разважаючы аб альтэрнатыўных шляхах гістарычнага развіцця, А. Станкевіч прыходзіў да высновы, што калі б уніі не было, то будучыня для беларускай Царквы (Праваслаўнай – С.В.) была б яшчэ больш горшай. На яго думку, «калі б не гэтая унія, дык сёння ўжо не было б беларускай нацыі, яна ці такім ці іншым чынам патанула б у маскоўскім нацыяналізме і імперыялізме» [3, с. 72–73].

На наш погляд, нельга лічыць, што А. Станкевіч ідэалізаваў унію. Высока ацэньваючы яе гістарычную ролю, ён, разам з тым, не адмаўляў і некаторых адмоўных фактаў, звязаных з ёй. Напрыклад, ён прызнаваў, што «часта унія распаўсюджвалася сілай», а палякі праз унію імкнуліся замацаваць польскасць і лацінства на беларускіх землях. Гісторык пісаў, што ў канцы свайго існавання Ўніяцкая царква была «многа ўжо злацiненая і зпольшчаная», аб чым, на яго думку, сведчылі пастановы Замойскага сабору 1720 г. [3, с. 72].

Знайшло асвятленне ў яго працах і пытанне аб ліквідацыі ўніі. А. Станкевіч раскрытыкаваў Я. Сямашку, назваўшы яго «адступнікам ад уніі і народнасці», а скасаванне ўніі расійскімі ўладамі ў 1839 г. лічыў памылковым. На думку А. Станкевіча, Я. Сямашка павінен быў не ліквідаваць унію, а ачысціць яе ад маскоўскіх і польскіх «наростаў» [3, с. 79]. У сваёй працы «Родная мова ў святынях» даследчык адзначаў, што біскупы Язэп Сямашка, Антоні Зубко і Васіль Лужынскі «здрадзілі веру і народ». У сваю чаргу, расійскія ўлады «паўтара мільёна беларусаў-уніятаў, не пытаючыся іх, а часта падганяючы казацкай нагайкай, запісалі ў праваслаўе» [3, с. 136–137]. А. Станкевіч адным з першых у беларускай гістарыяграфіі звярнуўся да пытанне аб

супраціўленні скасаванню ўніі. Ён пісаў, што беларускі народ шмат дзе «актыўна бараніў» Уніяцкую царкву [3, с. 78].

А. Станкевіч з'яўляўся сучаснікам адраджэння ўніі (так званай «неаўніі») у Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Ён вітаў гэты працэс, але яго ход і вынікі ацэньваў рэалістычна. Даследчык звяртаў увагу на складанасці, з якімі ў тыя часы сутыкнуліся ўніяты: адсутнасць асобнага біскупа-беларуса і, адпаведна, іх падначаленасць польскім лацінскім біскупам, недасканаласць выдаваемай рэлігійнай літаратуры. Памылковым, на яго погляд, было тое, што галоўная роля ў распаўсюджванні ідэй ўніі належыла не беларусам, а езуітам, якія былі пераважна палякамі [3, с. 102–105].

У сваіх працах А. Станкевіч разглядаў і гісторыю каталіцтва на беларускіх землях, аналізаваў яго ролю ў гістарычным мінулым Беларусі. Каталіцтва ён называў «лацінскім хрысціянствам», а пачатак яго гісторыі на беларускіх землях адносіў да X ст., калі з'явіліся першыя хрысціяне лацінскага абраду ( у асноўным замежныя купцы, місіянеры, у адзінкавых выпадках мясцовыя дружыннікі, баяры) [3, с. 81].

Даследчык слушна адзначаў, што значна болей каталікоў было ў XIII–XIV стст. У сваёй працы «Хрысціянства і беларускі народ (спроба сінтэзы)» ён вылучаў асноўныя перыяды, калі канверсія праваслаўных у рыма-каталіцызм прымала найбольш маштабны характар (часы Кацярыны II, генерал-губернатарства М. М. Мураўёва і інш.) [3, с. 81–86]. А. Станкевіч падкрэсліваў, што каталікі з ліку жыхароў беларускіх зямель – гэта тыя ж самыя беларусы, а не палякі. Рыма-Каталіцкая царква на беларускіх землях, на яго погляд, стала апорай беларускай нацыянальнасці ў XIX ст., асабліва пасля ліквідацыі ўніі [3, с. 87].

Асаблівую ўвагу А. Станкевіч сканцэнтраваў на вывучэнні праблемы выкарыстання беларускай мовы ў хрысціянскіх цэрквах. Гэтай праблеме ён прысвяціў сваю працу «Родная мова ў святынях», у якой імкнуўся даказаць бесперарыўнасць ўжывання беларускай мовы ў Рымска-Каталіцкай царкве. А. Станкевіч прыйшоў да высновы, што беларуская (старабеларуская – Аўт.) мова выкарыстоўвалася ў Рыма-Каталіцкай і Ўніяцкай цэрквах даволі шырока да канца XVII ст. У прыватнасці, у XVI – пачатку XVII ст. каталіцкае духавенства карысталася ёй ў урадавай і прыватнай перапісцы. Абмежаванне яе выкарыстання назіралася з канца XVII ст. А. Станкевіч тлумачыў гэта распаўсюджваннем пасля Люблінскай уніі польскай мовы, якая няўхільна выціскала са сферы як публічнага, так і касцёльнага жыцця мову беларускую (старабеларускую) [3, с. 131]. Даследчык адзначаў, што ўжыванне беларускай мовы ў Рыма-Каталіцкай і Уніяцкай

цэрквах у XVIII ст. значна аслабла, але цалкам ніколі не спынялася, прычым як у уніятаў, так і ў каталікоў [3, с. 131–133]. У яго працах прыводзяцца факты, якія падмацоўваюць дадзеную выснову. Прычынай захавання мовы ў вышэйазначаных цэрквах, на яго думку, з'яўлялася наднацыянальнасць Святога Пасаду [3, с. 88, 91].

Даследчык адзначаў, што у канцы XVIII ст. Рыма-Каталіцкая царква была ўжо «шчыльна звязана з польскасцю» і з'яўлялася «адзінай, дужа сільнай, апорай польскіх інтарэсаў у Літве і Беларусі». Гэты яе характар асабліва ўзмацніўся ў другой палове XIX ст. На думку А. Станкевіча, замацаванню польскасці ў Касцёле спрыялі самі расійскія ўлады: іх імкненне ўкараніць расейскую мову прывяло да яшчэ большага ўкаранення польскай [с. 85, 139–141]. Але, разам з тым, на працягу XIX ст. знаходзіліся святары, якія выкарыстоўвалі беларускую мову [3, с. 95]. Ён адзначаў, што ўжыванне беларускай мовы ў Касцёле дазвалялася Рымам: «з волі Св. Айца на пачатку нашага стагоддзя мова беларуская ў касцёле ў дадатковых набажэнствах мае поўнае права, абы толькі гэтага народ пажадаў і дамагаўся» [3, с. 147].

А. Станкевіч, з'яўляючыся сучаснікам беларускага нацыянальнага адраджэння, высока, нават з пэўным піетэтам адзываўся пра тых каталіцкіх ксяндзоў, якія ў пачатку XX ст. займалі нацыянальныя пазіцыі і прамаўлялі казанні па-беларуску: Фр. Будзька, А. Астрамовіч, К. Стаповіч, З. Якуць, Ф. Абрантовіч, В. Гадлеўскі, В. Шутовіч, П. Татарыновіч, А. Цікота, І. Рэшэць і інш. А. Станкевіч пісаў, што яны «на алтары Касцёла і Бацькаўшчыны Беларусі складаюць свой розум, сваё сэрца, усе свае сілы» [3, с. 146]. Ён адзначаў, што падобная пазіцыя магла мець цяжкія наступствы. Напрыклад, ксёндз Аляксандр Астрамовіч (паэт А. Зязюля) за сваю беларускасць быў пазбаўлены парафіі і на працягу двух гадоў жыў дзякуючы дапамозе іншых святароў. Аднак пры гэтым ён «заўсёды аставаўся верным і Касцёлу і народу» [3, с. 150–152]. А. Станкевіч паведамляе ў сваёй манаграфіі і пра справу аднога з самых знакамітых беларускіх ксяндзоў – В. Гадлеўскага, зняволенага польскімі ўладамі ў межваенны перыяд [3, с. 186–190].

Вялікае значэнне А. Станкевіч надаваў з'езду беларускага каталіцкага духавенства, які адбыўся ў Менску ў траўні 1917 г. На яго думку, «з'езд гэты меў вялізарнае значэнне. Ён разбудзіў да працы і тых з ксяндзоў, якія ўжо даўно былі забыўшыся аб сваёй беларускасці» [3, с. 157].

А. Станкевіч у сваіх працах ахарактэрызаваў адносіны сучасных яму каталіцкіх іерархаў да ўжывання беларускай мовы ў касцёльным

жыцці. Так, ён адзначаў, што біскуп-суфраган Магілёўскай архідыяцэзіі С. Данісевіч прыхільна ставіўся да беларускай мовы, сам выкарыстоўваў яе ў казаннях, заахвочваў выдаваць рэлігійную літаратуру на ёй [3, с. 148]. Біскуп Эдвард Роп таксама садзейнічаў пашырэнню ўжывання беларускай мовы ў Касцёле, і, тым самым, «стварыў як бы новую эпоху» у гэтай справе [3, с. 157]. Высока ацэньваў даследчык ролю пінскага біскупа З. Лазінскага ў справе пашырэння выкарыстання беларускай мовы ў царкоўным жыцці, і, асабліва, ролю віленскага біскупа Ю. Матулевіча. Апошняга ён называў нават святым чалавекам (у сучаснай Рыма-Каталіцкай царкве Ю. Матулевіч лічыцца блажэнным), падкрэсліваў, што ў адносінах да беларускай мовы той працягнуў справу Ропа [3, с. 165, 169–171]. У сваю чаргу, дзейнасць пераемніка Ю. Матулевіча, віленскага біскупа Р. Ялбжыкоўскага, вялікага патрыёта Польшчы і праціўніка беларускага нацыянальнага руху, А. Станкевіч ацэньваў адмоўна [3, с. 179–180].

Адзначым таксама, што А. Станкевіч разглядаў праблему ўжывання беларускай мовы ў Рыма-Каталіцкай царкве не толькі на беларускіх землях, але і ў дыяспары: сярод беларусаў-каталікоў, якія жылі на тэрыторыі Латвіі, Паўночнай Амерыкі [3, с. 199–200].

Асобная праца А. Станкевіча ўяўляе сабой гістарычны нарыс беларускага хрысціянскага руху [2, с. 453–568]. «Прадвесьнікамі» сучаснага яму беларускага нацыянальнага адраджэння даследчык называў прафесараў Віленскага ўніверсітэта, у тым ліку святароў М. Баброўскага і П. Сасноўскага, а таксама ксяндза Магнушэўскага [2, с. 455, 458]. А. Станкевіч падкрэсліваў, што беларускае адраджэнне пачалося перадусім ў асяроддзі беларусаў-каталікоў, аналізаваў прычыны гэтага [2, с. 463]. Вялікую ўвагу ў сваім нарысе ён надаў удзельнікам нацыянальнага руху, якія былі свядомымі хрысціянамі-каталікамі, а таксама падрабязна разгледзеў гісторыю партыі БХД.

Увогуле, А. Станкевіч шматразова падкрэсліваў у сваіх працах вялікае значэнне хрысціянства ў беларускай гісторыі. Адказваючы сваім апанентам, заяўляўшым, што ён перабольшвае ролю хрысціянства як «сінтэзуючай народ сілы і сілы, творачай народнасць», святар адзначаў безпадстаўнасць іх крытыкі, бо, з яго пункту гледжання, хрысціянства трэба ўспрымаць у «самой яго сутнасці», да чаго ён і імкнуўся ва ўласных працах [3, с. 25–26].

Такім чынам, А. Станкевіч у сваіх творах разгледзеў даволі шырокі спектр пытанняў, звязаных з гісторыяй хрысціянства на беларускіх землях. Асноўную ўвагу пры гэтым ён надаў вывучэнню ролі

хрысціянства ў гісторыі беларускага народа, праблемы выкарыстання беларускай мовы ў Рыма-Каталіцкай царкве, уніяцкай праблематыцы, беларускага хрысціянскага руху. Яго даследаванні захоўваюць сваю актуальнасць і ў цяперашні час, а змешчаны ў іх фактычны матэрыял можа быць запатрабаваны навукоўцамі.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1 Конан, У. Каталіцкае адраджэнне ў Беларусі: Адам Станкевіч (1891–1949) / У. Конан. – Львоў, 2006. – 89 с.
2 Станкевіч, А. З Богам да Беларусі: зб. твораў / А. Станкевіч. – Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2008. – 1097 с.
3 Станкевіч, А. Выбранае / А. Станкевіч ; укл. У. Конан. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – 360 с.



УДК 94(476)



**І. В. ГРАБЯНЧУК**
(Мінск, ДУА «Інстытут пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь»)


## ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І АРХІЎНЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БАБРУЙСКАЙ ВОБЛАСЦІ


*У артыкуле даецца агляд гістарыяграфіі і крыніц па гісторыі Бабруйскай вобласці, якая існавала ў 1944–1954 гг. Асноўная ўвага надаецца аналізу ступені інфарматыўнасці розных груп гістарычных крыніц па азначанай тэме.*


У 2017 г. Бабруйск адзначыў сваё 630-годдзе. За сваю больш чым паўтысячагадовую гісторыю гэты горад перажыў шмат падзей. Фактычна на працягу ўсяго свайго гістарычнага шляху ён выконваў пэўныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя функцыі. Спачатку Бабруйск быў цэнтрам староства ў часы Рэчы Паспалітай, пасля – павятовым цэнтрам (1795–1924 гг.) у складзе Расійскай імперыі і да ўтварэння СССР. З 1924 г. Бабруйск – цэнтр 1-га Бабруйскага і 2-га Бабруйскага раёнаў, а таксама Бабруйскай акругі (да 1930 г.). У 1927 г. у сувязі з узбуйненнем раёнаў у БССР быў утвораны адзіны Бабруйскі раён, які існуе да сённяшняга дня. Аднак гэта не ўвесь пералік этапаў гісторыі Бабруйска як адміністрацыйна-тэрытарыяльнага цэнтра.

Найбольш высокі статус у гэтай якасці ён меў з 1944 па 1954 гг., з'яўляючыся цэнтрам Бабруйскай вобласці.

Першыя спробы асэнсавання гісторыі Бабруйскай вобласці былі зроблены яшчэ ў часы яе існавання. Значную каштоўнасць маюць звесткі па гісторыі Бабруйскай вобласці, пададзеныя ў кандыдадацкай дысертацыі У. Р. Воўк-Левановіча [1; 2]. Аўтар падае эканоміка-геаграфічную характарыстыку Бабруйскай вобласці ў кантэксце гісторыі развіцця Цэнтральнай і Усходняй Беларусі. Важна і тое, што ён не абмяжоўваецца толькі аналізам эканамічных паказчыкаў, але і дастаткова падрабязна характарызуе становішча адукацыі, устаноў культуры, аховы здароўя.

Асобныя звесткі па гісторыі Бабруйска і Бабруйскай вобласці паведамлялі аўтары шматлікіх публікацый на старонках перыядычных выданняў у другой палове 40-х – першай палове 50-х гг. XX ст.: абласной газеты «Савецкая Радзіма», рэспубліканскіх газет «Звязда», «Советская Белоруссия», «Настаўніцкая газета» і інш. Пераважна яны прысвячаліся пэўным датам, як правіла, звязаным з рэвалюцыйнай тэматыкай і будаўніцтвам сацыялістычнага грамадскага ўкладу.

Пасля скасавання Бабруйскай вобласці ў 1954 г. спынілася і праца па яе вывучэнні. Зразумела, з таго часу да нашых дзён выйшла шмат разнастайных публікацый па гісторыі Бабруйска і Бабруйскага раёна, але вось тэма Бабруйскай вобласці ў іх не атрымала належнай распрацоўкі.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі даследаваў беларускі юрыст, гісторык і сацыёлаг В. А. Круталевіч [3], але выключна ў гісторыка-юрыдычным ракурсе. Адпаведна, распрацоўка іншых аспектаў гэтай вельмі шырокай тэмы не ўваходзіла ў кола задач узгаданага аўтара.

Пэўнае значэнне для даследавання тэмы Бабруйскай вобласці меў гісторыка-эканамічны нарыс, прысвечаны Бабруйску, які вытрымаў два выданні [4; 5]. Раздзел гэтага нарыса, прысвечаны пасляваеннаму аднаўленню і развіццю горада, вельмі кароткі. Прычым, у другім выданні тэкст быў скарочаны – менш стала інфармацыі па выдатных асобах. Так што ў плане персаналій першае выданне больш інфармацыйнае ў параўнанні з другім.

Гісторыка-дакументальныя хронікі «Памяць», прысвечаныя гораду і раёну, на сённяшні дзень з'яўляюцца найбольш грунтоўнымі выданнямі па гістарычнаму краязнаўству Бабруйшчыны, але тэма Бабруйскай вобласці і ў іх таксама не атрымала належнага асвятлення

[6; 7]. Фактычна, як і ў вышэйузгаданым гісторыка-эканамічным нарысе, справа абмежавалася канстатацыяй факта стварэння вобласці ў 1944 г. і яго станоўчым уплывам на развіццё горада [5, с. 148; 5, с. 678, 687].

Такім чынам, у даследаваннях па гісторыі Бабруйска парадаксальным чынам перыяд Бабруйскай вобласці асветлены вельмі сцісла і схематычна. Звычайна аўтары робяць акцэнт на эканамічным развіцці горада, найважнейшых падзеях ў сацыяльнай сферы, прыводзяць шмат статыстычных звестак, даюць характарыстыку найбольш выдатных асоб, жыццё якіх было звязана з Бабруйскам. У той жа час у публікацыях фактычна нічога не сказана непасрэдна пра дзейнасць абласных органаў улады і іх персанальны склад, пра тыя шматлікія складаныя пытанні, якія даводзілася вырашаць у працэсе штодзённага адміністравання. Напрыклад, адным з такіх пытанняў было рэлігійнае, якое набывала асаблівую актуальнасць для Бабруйска, дзе пражывалі прадстаўнікі некалькіх канфесій. Тэма жыцця яўрэйскай рэлігійнай абшчыны ў часы Бабруйскай вобласці знайшла сціслае асвятленне ў англамоўным артыкуле беларускага і ізраільскага даследчыка Л. Смілавіцкага [8].

Варта адзначыць, што нават і ў тых публікацыях па азначанай тэме, якія вышлі ў Беларусі пасля 1991 г., захоўваецца вельмі моцны ўплыў метадалагічных падыходаў савецкай гістарыяграфіі, які выяўляецца ў ідэалізацыі ролі Камуністычнай партыі, працоўнага энтузіязму мас, ідэалагічнай маналітнасці грамадства і інш. Пры гэтым праблемы, якія мелі месца ў вывучаемы перыяд, або разглядаюцца вельмі павярхоўна, або замоўчваюцца наогул. Таму для сучасных даследчыкаў актуальнай з’яўляецца задача больш глыбокага аналізу працэсаў, якія адбываліся ў савецкім грамадстве ў пасляваенны перыяд.

Што датычыць архіўных крыніц па гісторыі Бабруйскай вобласці, то найбольшую колькасць дакументаў утрымлівае фонд Бабруйскага абласнога выканаўчага камітэта, які захоўваецца ў Бабруйскім занальным дзяржаўным архіве [9]. У ім ёсць усе пратаколы пасяджэнняў Бабруйскага аблвыканкама і матэрыялы да гэтых пратаколаў. Апошнія ўкладзены ў 180 тамоў! Гэта найбольш інфармацыйная група крыніц. У іх знайшлі адлюстраванне самыя розныя пытанні: аднаўленне і развіццё рэгіянальнай эканомікі, вырашэнне праблем сацыяльнай сферы, развіццё адукацыі, эфектыўнасць працы дзяржаўнага і партыйнага апарату, рэлігійная палітыка савецкай дзяржавы і шмат іншых. Аднак трэба улічваць, што пратаколы пасяджэнняў Бабруйскага

абласнога выканаўчага камітэта і матэрыялы да іх маюць «белыя плямы»: частка пытанняў парадку дня разглядалася ў рэжыме сакрэтнасці і іх змест не адлюстраваны ў названых дакуметах.

Інфармацыя па эканамічных аспектах гісторыі Бабруйскай вобласці ўтрымліваецца ў фондах абласных трэстаў [10; 11], банкаўкіх устаноў [12–14], прафсаюзаў [15; 16]. Асабліва важнае значэнне для вывучэння гаспадаркі горада і вобласці маюць матэрыялы фонда планавай камісіі Бабруйскага аблвыканкама [17]. Яны ўтрымліваюць абласныя планы па выпуску валавай прадукцыі на 1946–1950 гг., бухгалтарскую справаздачнасць і эканамічныя паказчыкі Бабруйскай вобласці па гадах азначанага перыяду, спісы прамысловых прадпрыемстваў і выніковыя лічбы пасляваеннага аднаўлення эканомікі вобласці.

Сярод фондаў Бабруйскага занальнага дзяржаўнага архіва, якія адлюстроўваюць працэсы ў сферы адукацыі можна вылучыць наступныя зборы.

У фондзе Бабруйскага педагагічнага вучылішча дакументы падзелены на два перыяды: 1) 1944–1949 гг.; 2) 1954–1957 гг. [18]. Такі падзел звязаны з тым, што ў 1949 г. на базе ўзгаданага вучылішча быў адкрыты Бабруйскі настаўніцкі інстытут, а пасля яго ліквідацыі ў 1954 г. Бабруйскае педвучылішча было адноўлена на кароткі тэрмін. Дакументы гэтага фонда падаюць інфармацыю аб прынцыпах арганізацыйнай пабудовы навучальнай установы, яго кіраўніцтве, выкладчыках і навучэнцах. Агульныя ўяўленні аб тэндэнцыях развіцця сярэдняй педагагічнай адукацыі можна атрымаць са зместу загадаў Міністэрства асветы БССР. Найбольш інфармацыі аб розных аспектах дзейнасці Бабруйскага педагагічнага вучылішча сканцэнтравана ў пратаколах яго педагагічнай рады. Варта адзначыць, што да 1949 г. пратаколы вяліся на беларускай мове, а з 1954 г. – на рускай.

Шмат цікавых дакументаў па гісторыі развіцця вышэйшай адукацыі ў пасляваенны перыяд знаходзіцца ў фондзе Бабруйскага настаўніцкага інстытута [19]. Агульная характарыстыка гэтай групы крыніц была намі пададзена ў ранейшых публікацыях [20; 21]. Акрамя таго, відавочна, узнікае неабходнасць параўнальнага аналізу гісторыі дзвюх вышэйшых навучальных устаноў – Бабруйскага настаўніцкага інстытута (1949–1954 гг.) і Бабруйскага філіяла Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, які быў зачынены 1 верасня 2017 г., якраз напярэдадні свайго 20-ці годдзя…

Вывучаючы гісторыю адукацыі ў перыяд існавання Бабруйскай вобласці нельга абыйсці ўвагай дзейнасць Інстытута ўдасканалення настаўнікаў аддзела адукацыі Бабруйскага аблвыканкама [22]. У яго

фондзе знаходзяцца разнастайныя крыніцы: планы і справаздачы аб працы аддзела, дакладныя запіскі аб аказанні метадычнай дапамогі школам вобласці, пратаколы нарад і семінараў загадчыкаў раённых педагагічных кабінетаў, матэрыялы навукова-практычных канферэнцый настаўнікаў і інш.

Намі выяўлены некаторыя крыніцы па гісторыі Бабруйскай вобласці ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь: Міністэрства народнай асветы (ф.42), Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР (ф. 119), Камітэта па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў БССР (ф.799), Упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР (ф.952) і шэрагу іншых фондаў. Дадзеныя дакументы паказваюць жыццё Бабруйскай вобласці ў кантэксце працэсаў дзяржаўнага кіравання ў маштабах БССР і СССР.

Для вывучэння гісторыі Бабруйскай вобласці важнае значэнне маюць фотадакументы, якія знаходзяцца ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў і Бабруйскага раённага краязнаўчага музея. У іх адлюстраваны стан Бабруйска адразу пасля выгнання нямецка-фашысцкіх акупантаў, аднаўленне прадпрыемстваў, развіццё сельскай гаспадаркі, народнай адукацыі, падзеі грамадскага жыцця і г. д.

Такім чынам, пры наяўнасці вялікай колькасці крыніц, гісторыя Бабруйскай вобласці застаецца недастаткова вывучанай у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі. У дадзеным артыкуле пададзены вельмі сціслы агляд найважнейшых даследаванняў і асобных груп крыніц па гісторыі Бабруйскай вобласці. Вялікая і разнастайная колькасць крыніц дазволіць гісторыкам яшчэ зрабіць шмат цікавых назіранняў і высноў ў вывучэнні як гісторыі Бабруйскай вобласці у прыватнасці, так і гісторыі Беларусі ў цэлым.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1 Волк-Леванович, В. Г. Экономико-географический обзор Бобруйской области : дис. … канд. географ. наук / В. Г. Волк-Леванович; Белорусский государственный университет им. В. И. Ленина. – Минск, 1950. – 370 с. // Бабруйскі занальны дзяржаўны архіў (далей – БЗДА). – Ф. 254. – Воп. 9. – Спр. 1.

2 Волк-Леванович, В. Г. Экономико-географическая характеристика районов бывшей Бобруйской области: (в границах 1953 г.) : автореф. дис. … канд. географ. наук / В. Г. Волк-Леванович; Белорусский государственный университет им. В. И. Ленина. – Минск, 1955. – 30 с.

3 Круталевич, В. А. Административно-территориальное устройство БССР / В. А. Круталевич. – Минск : Наука и техника, 1966. – 133 с.;

Круталевич, В. А. Республика Беларусь: административно-территориальное устройство / В. А. Круталевич. – Минск : Право и экономика, 2001. – 268 с.
4 Бобруйск: Историко-экономический очерк. – Минск : Беларусь, 1965. – 218 с.
5 Бобруйск. Историко-экономический очерк. 2-е, переработанное издание. – Минск : Беларусь, 1970. – 212 с.
6 Памяць : Бабруйск: Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: В. П. Алімбачкаў і інш.. – Мінск : Вышэйшая школа, 1995. – 765 с.
7 Памяць : Бабр. р-н: Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / [Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; рэд.-склад. У. А. Салановіч]. – Мінск : БелЭН, 1998. – 604 с.
8 Smilovitsky, Leonid. Jewish religious life in Bobruisk,1944–1954. – Jerusalem, 1995. – 43–54 p. – (Jews in Eastern Europe / The Hebrew Univ.of Jerusalem,Centre for Research a.Doc.of East Europ.Jewry ; N. 2(27)).
9 БЗДА. – Ф. 254. Бабруйскі абласны выканаўчы камітэт.
10 БЗДА. – Ф. 148. Бабруйскі абласны будаўнічы трэст.
11 БЗДА. – Ф. 1178. Бабруйскі абласны трэст лесахімічнай прамысловасці.
12 БЗДА. – Ф. 339. Бабруйская абласная кантора Дзяржбанка СССР.
13 БЗДА. – Ф. 568. Бабруйская абласная кантора гандлёвага банка СССР.
14 БЗДА. – Ф. 1373. Бабруйская абласная кантора камунальнага банка СССР.
15 БЗДА. – Ф. 1143. Бабруйскі абласны савет прафсаюзаў працаўнікоў пачатковай і сярэдняй школы.
16 БЗДА. – Ф. 1148. Бабруйскі абласны савет прафсаюзаў.
17 БЗДА. – Ф. 140. Планавая камісія Бабруйскага абласнога выканаўчага камітэта.
18 БЗДА. – Ф. 795. Бабруйскае педагагічнае вучылішча.
19 БЗДА. – Ф. 1170. Бабруйскі настаўніцкі інстытут.
20 Грабянчук, І. В. Крыніцы па гісторыі Бабруйскага настаўніцкага інстытута ў фондах Бабруйскага дзяржаўнага занальнага архіва / І. В. Грабянчук // Ad jubilaeum: да 70-годдзя стварэння гістарычнага факультэта: зб. навуковых артыкулаў : у 2 ч. Ч. 1 / рэдкал.: В. А. Міхедзька (адк. рэд.) [і інш.]; М-ва адукацыі РБ; Гом. дзярж. ўн-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2015. – С. 205–210.
21 Грабянчук, І. В. Пратаколы рады (савета) Бабруйскага настаўніцкага інстытута (1949-1954): крыніцазнаўчы аспект / І. В. Грабянчук // Научно-методическое сопровождение повышения квалификации педагогов: опыт, проблемы, перспективы: сборник материалов II Республиканской научно-практической конференции, посвященной 75-летию со дня основания Могилевского государственного областного

института развития образования. 26-27 мая 2016 года, г. Могилев / редкол.: И. А. Старовойтова [и др.]; под общ. ред. М. В. Ладутько, В. Н. Гириной. – Могилев : УО «МГОИРО», 2016. – С. 34–37.
22 БЗДА. – Ф. 1161. Інстытут удасканальвання настаўнікаў аддзела народнай адукацыі Бабруйскага абласнога выканаўчага камітэта.

УДК [94(476)+061.2(476)(091)] «199»

**А. П. ГРОС**
(Мінск, ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі»)

# ДА ПЫТАННЯ АБ УДЗЕЛЕ ГРАМАДСКІХ АБ’ЯДНАННЯЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У ПРАЕКТАХ МІЖНАРОДНАЙ ТЭХНІЧНАЙ ДАПАМОГІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1990-х ГАДОЎ

*Дзякуючы развітым міжнародным кантактам грамадскія аб’яднанні Рэспублікі Беларусь выступалі ініцыятарамі інавацыйных праектаў і праграм міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў галіне аховы здароўя, адукацыі, рэабілітацыі і культурна-асветніцкай дзейнасці.*

У Рэспубліцы Беларусь была сфарміравана адасобленая ад гуманітарнай дапамогі сістэма каардынацыі, уліку і кантролю міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

У 1997 г. была зацверджана Нацыянальная праграма міжнароднага тэхнічнага супрацоўніцтва на 1997–1999 гг. Яна вызначыла наступныя прыярытэтныя напрамкі тэхнічнага супрацоўніцтва: структурныя пераўтварэнні ў эканоміцы, рэфармаванне галоўных сфер эканомікі, рэформы ў сацыяльнай сферы, ахова навакольнага асяроддзя і мінімізацыя наступстваў Чарнобыльскай катастрофы, развіццё інавацыйнай і навукова-тэхнічнай дзейнасці. У названы перыяд была створана дзяржаўная структура кіравання міжнародным тэхнічным супрацоўніцтвам – Камісія па пытаннях міжнароднага тэхнічнага супрацоўніцтва пры Савеце міністраў Рэспублікі Беларусь.

У перыяд 1997–1998 гг. у рэспубліцы было рэалізавана 329 праектаў тэхнічнай дапамогі, 32 з іх грамадскімі аб’яднаннямі. Акрамя шматпрофільных праектаў, якія складалі 20 % ад агульнага аб’ёму рэалізаваных праграм, асноўнымі абласцямі дзейнасці донараў у 1997–1998 гг. з’яўляліся сацыяльная абарона і развіццё (14 %), энергетыка, ядзерная бяспека, наступствы Чарнобыльскай катастрофы (20 %), прыродныя рэсурсы, навакольнае асяроддзе (20 %). Па колькасці

зарэгістраваных праектаў і аб’ёму сродкаў, што былі накіраваны на іх рэалізацыю, ключавым партнёрам у працэсе міжнароднага тэхнічнага супрацоўніцтва з боку Рэспублікі Беларусь выступалі дзяржаўныя органы і арганізацыі.

Донарамі міжнароднай тэхнічнай дапамогі няўрадавым арганізацыям Рэспублікі Беларусі ў другой палове 1990-х гг. выступілі Хрысціянскі дзіцячы фонд, Праграма развіцця ААН, Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, Шведскі федэральны офіс па міжнародных эканамічных пытаннях, Фонд «Еўразія» і інш.

**Табліца 1 – Размеркаванне міжнароднай тэхнічнай дапамогі паміж рэцыпіентамі ў 1997–1998 гг.**

| Рэцыпіенты | Абавязацельствы (тыс. дал. ЗША) | Выдаткі (тыс. дал. ЗША) |
|---|---|---|
| Дзяржаўныя арганізацыі | 47,950 | 14,342 |
| Недзяржаўныя арганізацыі | 16,904 | 11,000 |
| Іншыя | 35,602 | 27,387 |

Найбольш буйнымі праектамі былі праект па стварэнню Цэнтра здароўя жанчын (Прадстаўніцтва Хрысціянскага дзіцячага фонду ў Рэспубліцы Беларусь, кошт – 125 тыс. дал. ЗША); шэсць праектаў, рэалізаваных Беларускім Таварыствам Чырвонага Крыжа агульным коштам больш 1,7 млн. дал. ЗША; навучанне дзяцей-інвалідаў па слыху (Беларуская рэспубліканская асацыяцыя бацькоў дзяцей-інвалідаў па слыху «Рост», кошт – 906 тыс. дал. ЗША.) [5, с. 3, 12, 15].

Хацелася б больш падрабязна спыніцца на характарыстыцы найбольш знакавых праектаў, якія былі рэалізаваны ў вызначаны перыяд.

У 1996 г. Прадстаўніцтва Хрысціянскага дзіцячага фонду ў Беларусі сумесна з Цэнтрам гендарнай інфармацыі і палітыкі пры аддзеле сям’і і гендарных праблем Міністэрства сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь і Праграмай развіцця ААН пачало праект стварэння Цэнтра здароўя жанчын. Ён займаўся прапагандай здаровага ладу жыцця, праводзіў гутаркі па пытаннях планавання сям’і, кантрацэпцыі, хвароб, якія перадаюцца палавым шляхам, догляду за дзецьмі і інш. Пры Цэнтры дзейнічала бібліятэка па пытаннях жаночага і дзіцячага здароўя. Адным з напрамкаў дзейнасці Цэнтра з’яўлялася падтрымка праектаў грамадскіх арганізацый, накіраваных на развіццё сістэмы аховы жаночага і дзіцячага здароўя [3, с. 107–108].

З 1990 г. Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа пры падтрымцы Міжнароднай федэрацыі таварystваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца ажыццяўляла Чарнобыльскую праграму гуманітарнай дапамогі і рэабілітацыі (CHARP). У рамках гэтай праграмы прадстаўлялася медыцынская, сацыяльная і псіхалагічная дапамога насельніцтву, якое пражывала ў рэгіёнах, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Праводзілася медыцынскае абследаванне жыхароў найбольш аддаленых забруджаных раёнаў Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей з мэтай выяўлення паталогіі шчытападобнай залозы з дапамогай перасоўных дыягнастычных лабараторый у тых, каму на момант аварыі не споўнілася 18 гадоў. Штогод перасоўныя дыягнастычныя лабараторыі праводзілі ўльтрагукавое даследаванне не менш за 45 тысяч чалавек. У 1998 г. у рамках гэтай праграмы Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа атрымала 699,910 дал. ЗША [4, с. 8].

Яшчэ адным праектам, які штогод рэалізоўвалі валанцёры і супрацоўнікі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа, быў праект «Надзвычайны прызыў», накіраваны на забеспячэнне ў халодную пару года асоб без пэўнага месца жыхарства гарачым харчаваннем, коўдрамі і адзеннем. Дапамогу ў яго рэалізацыі аказвалі замежныя донары. Напрыклад, у 1997 г. было атрымана 72 тыс. дал. ЗША [2].

Пры падтрымцы Шведскага федэральнага офіса па міжнародных эканамічных пытаннях Грамадская дабрачынная арганізацыя «Беларускі дзіцячы хоспіс» (грамадская дабрачынная арганізацыя, якая аказвае медыцынскую, псіхалагічную і сацыяльную дапамогу сем’ям, якія маюць безнадзейна хворых дзяцей, як у перыяд догляду за імі, так і пасля смерці) атрымала ў 1998–2000 гг. у межах міжнароднай тэхнічнай дапамогі 185 тыс. дал. ЗША на развіццё праграм паліятыўнай дапамогі. У канцы 1990-х – пачатку 2000-х гг. грамадскае аб’яднанне пры падтрымцы замежных партнёраў стварыла ў Рэспубліцы Беларусь сістэму паліятыўнай дапамогі. Гэта сістэма мерапрыемстваў, накіраваных на падтрыманне якасці жыцця пацыентаў з невылечнымі, пагражаючымі жыццю і цяжка працякалымі захворваннямі, на максімальна магчымым, пры дадзеным стане пацыента, камфортным для чалавека ўзроўні. Акрамя гэтага, аб’яднанне займалася арганізацыяй навучальных трэнінгаў у Вялікабрытаніі і іншых краінах для супрацоўнікаў аб’яднання і візітаў замежных спецыялістаў. Была праведзена работа па распаўсюджванню беларускай мадэлі аказання паліятыўнай дапамогі дзецям на краіны Усходняй Еўропы і краіны былога СССР [1].

3 Протоколы заседаний бюро Гомельского обкома КПБ № 10, 11 и материалы к ним, 1965 г. // Государственный архив общественных объединений Гомельской области (ГАООГО). – Ф. 144. Оп. 124. Д. 14.
4 Воспоминания Н. В. Замыко, 1971 г. // Зональный государственный архив в г. Мозыре (ЗГАМ). – Ф. 286. Оп. 1. Д. 27.
5 Васько, А. Ю. Не скарыліся ворагу / А. Ю. Васько // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мазыра і Мазырскага раёна / уклад.: М. А. Капач, В. Р. Феранц: маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. – С. 235–244.
6 Васько, А. Ю. Падпольная група Ц. Я. Абрамава / А. Ю. Васько // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мазыра і Мазырскага раёна / уклад.: М. А. Капач, В. Р. Феранц: маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. – С. 245–247.
7 Ветраў, І. Д. Незламаная воля / І. Д. Ветраў, А. З. Духанін, А. Л. Жыльскі // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мазыра і Мазырскага раёна / уклад.: М. А. Капач, В. Р. Феранц: маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. – С. 247–248.

УДК 94(476) «1918-1939»:930(438) «193»

**М. М. МЯЗГА**
(Гомель, УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ 1918–1939 ГАДОЎ У ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ МІЖВАЕННАГА ЧАСУ

*У артыкуле выяўленыя асноўныя праблемы гісторыі Беларусі найноўшага часу, якія сталі прадметам даследавання польскай міжваеннай гістарыяграфіі. Ахарактарызаваны тыя палажэнні, якія былі сфармуляваны польскімі аўтарамі па ўказанай праблематыцы. Паказана, што вывучаючы палітычна актуальныя праблемы, польская гістарычная навука перш за ўсе абслугоўвала палітычныя патрэбы сваёй дзяржавы.*

Беларусь у міжваенны час апынулася ў ролі тэрыторыі, за якую ішла актыўная барацьба паміж Савецкай Расіяй/СССР і Польшчай. Гэта ў многім абумовіла цікавасць польскай гістарыяграфіі 1920-х – 1930-х гг. да шэрагу праблем беларускай найноўшай гісторыі. Польская

гістарыяграфія шмат увагі надала беларускай праблематыцы пры высвятленні прычын узнікнення польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. Яна не адмаўляла наяўнасці захопніцкіх планаў у Польшчы ў дачыненні да «ўсходнім крэсаў» і імкнулася абгрунтаваць і апраўдаць названыя планы. Для гэтага польскія даследчыкі даказвалі этнічную самастойнасць беларусаў у дачыненні да рускіх і іх блізасць да польскай культуры. Так, С. Кутшэба ў 1919 г. у адной са сваіх прац сцвярджаў, што рускія несправядліва лічаць беларусаў часткай свайго этнаса. Беларусы складаюць асобнае этнаграфічнае славянскае племя, беларуская мова з'яўляецца асобнай, яна «напоўнена польскімі словамі і лепш разумеецца палякамі, чым рускімі» [1, s. 187–190]. Тым самым падкрэслівалася этнічная блізкасць беларусаў з палякамі для апраўдання далучэння да Польшчы беларускіх земляў. Я. Чэканоўскі лічыў, што этнічная мяжа паміж палякамі і беларусамі выразна не вызначылася і польскімі па характары з'яўляюцца нават такія размешчаныя далёка на ўсходзе паветы, як Барысаўскі, Сененскі [2, s. 29–30]. У. Студніцкі пісаў, што тэрыторыі Беларусі могуць быць інтэграваныя ў склад польскай дзяржавы, бо яны засталіся пад уплывам польскай культуры і магчыма іх каланізацыя палякамі ў сувязі з нізкай шчыльнасцю насельніцтва [3, s. 23–27].

Яшчэ адзін аргумент, які прыводзяць польскія даследчыкі для абгрунтавання прасоўвання на беларускія землі, – тэза аб вызваленчай і цывілізатарскай місіі Польшчы. К. Алендскі, напрыклад, кажа ў сваіх працах аб імкненні Польшчы прынесці на «ўсходнія крэсы» палітычныя і грамадзянскія свабоды, пазбавіць іх насельніцтва ад голаду. Перавага выбару суседзяў на карысць аб'яднання з Польшчай, па яго меркаванню, у тым, што «лепш ісці з асвечаным Захадам, чым варварскім усходам, які … з ідэй камунізму ўчыніў сумесь крыві, ганьбы і прыгнёту» [4, s. 10, 8].

Польская гістарыяграфія акцэнтавала ўвагу на слабасці беларускага нацыянальнага руху. Л. Васілеўскі адзначаў, што падчас вайны беларусы не былі ў стане стварыць сілу, здольную рэалізаваць ідэю незалежнасці [5, s. 394]. С. Казіцкі пісаў, што беларусы «…яшчэ нікім за народ не былі прызнаныя, не ўтварылі адзінай масы і былі перамяшаныя з літоўцамі, палякамі, украінцамі» [6, s. 114]. С. Кутшэба таксама адзначае слабасць беларускага нацыянальнага руху і нацыянальнай свядомасці беларусаў, што не дазваляла Ю. Пілсудскаму стварыць неабходнае асяроддзе для рэалізацыі ідэі федэрацыі [7, s. 167]. Ю. Гласко адзначаў, што беларусы арыентуюцца на суседнія краіны ў залежнасці ад сваёй рэлігійнай веры, таму тую частку Беларусі,

дзе пераважае каталіцкае насельніцтва, ён прапаноўваў непасрэдна далучыць да Польшчы [8, с. 39]. Па меркаванні Л. Васілеўскага, Ю. Пілсудскі ў сваёй беларускай палітыцы зыходзіў з таго, што беларускі нацыянальны рух слабы. Таму пакуль трэба было стварыць «беларускі П'емонт у Польшчы», які стаў бы цэнтрам росту беларускага нацыянальнага руху, даць беларусам магчымасці для развіцця культуры, але не прызнаваць урад БНР [9, s. 216, 218].

Польскія даследчыкі сцвярджалі, што палітыка их краіны ў адносінах да ўсходніх земляў не была імперыялістычнай, а адпавядала інтэрасам мясцовага насельніцтва. Пры гэтым яны спасылаліся на віленскі зварот Ю. Пілсудскага ад 22 красавіка 1919 г., сцвярджаючы, што ў ім начальнік польскай дзяржавы абвясціў права ўсіх народаў былога ВКЛ самастойна вызначаць свой лёс і даў ім для гэтага ўсе магчымасці [10, s. 84]. С. Кутшэба ўказвае на тое, што польскія ўлады на акупаванай тэрыторыі Беларусі дазвалялі свабоднае карыстанне беларускай мовай, у тым ліку і пры звароце ва ўладныя структуры, хоць прызнаваў, што мова ўлады была польскай [7, s. 163]. С. Ельскі сцвярджаў, што польская адміністрацыя на беларускіх землях садзейнічала развіццю беларускага школьніцтва, і значная частка беларускага насельніцтва падтрымала «польскую ўладу і разлічвала на рашэнне лёсу Беларусі ў цесным саюзе з Польшчай» [11, s. 42].

Для польскай гістарыяграфіі характэрна імкненне паказаць, што Польшча аказвала падтрымку беларускаму нацыянальнаму адраджэнню, вяла вайну «не толькі за свае ўласныя інтэрасы, але і імкнулася дапамагчы беларускаму насельніцтву, стагнаўшаму пад крывавым ярмом бальшавіцкай няволі» [10, s. 98]. С. Ельскі адзначаў, што ў беларускім руху сфармавалася прапольская плынь, якую ўзначальвала Найвышэйшая рада. Аднак левыя палітычныя сілы, аснову якіх складалі беларускія эсэры, выступілі супраць супрацоўніцтва з Польшчай [11, s. 46, 45, 48]. Палажэнне польскай гістарыяграфіі аб адпаведнасці палітыкі Польшчы на акупаваных тэрыторыях на ўсходзе інтэрасам мясцовага насельніцтва ў святле шырока вядомых фактаў не выглядае пераканаўчым [12].

Беларуская праблематыка прысутнічала ў польскай гістарыяграфіі пры вывучэнні пытання аб усталяванні ўсходняй мяжы Польшчы. Па меркаванні А. Пшыбыльскага, Ю. Пілсудскі лічыў неабходным авалодаць «чыгуначнай лініяй Лунінец – Баранавічы – Ліда – Вільня, заняць пераправы праз Нёман, наблізіцца да Мінска, і, нарэшце, стварыць калідор, які, з аднаго боку, аддзяляў бы Літву ад Савецкай Расіі, а з іншага, дазволіў бы злучыць польскую мяжу з Латвіяй».

Акрамя таго, па палітычных меркаваннях неабходна было авалодаць Вільняй [13, с. 226]. А. Верны ў сваіх даследаваннях канстатаваў, што паводле Рыжскай дамовы не ўдалося Польшчы атрымаць мяжу, якая «адпавядае лініі Дмоўскага», у прыватнасці, усходней яе застаўся Мінск. Прычыну гэтага ён бачыў у тым, што большасць у польскай дэлегацыі на мірных перамовах складалі прадстаўнікі левых партый, а С. Грабскі, хоць і прадстаўляў эндэцыю, быў праціўнікам далучэння да Польшчы астатніх беларускіх земляў з Мінскам. Ён дамагаўся стварэння калідора з паўночна-заходніх земляў Беларусі, які аддзяляў бы Расію ад Літвы [14, s. 116, 117–119].

Найважнейшай для польскіх даследчыкаў на працягу ўсяго міжваеннага перыяду навуковай праблемай з’яўлялася гісторыя Заходняй Беларусі. Яны адзначалі няўстойлівасць становішча Польшчы на гэтай тэрыторыі. С. Сракоўскі лічыў, што Рыжская дамова з’яўлялася далёка недастатковай, каб забяспечыць трывалае далучэнне «ўсходніх крэсаў» да Польшчы, бо паслябальшавіцкая Расія яе не прызнае. Дадзены аўтар прагназаваў магчымасць новага ваеннага канфлікту Польшчы і Расіі на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў тым выпадку, калі Масква стане праводзіць палітыку «збірання рускіх земляў». Ён указваў на неабходнасць для Польшчы ўтрымаць за сабой «усходнія крэсы», абгрунтоўваючы гэта тым, што да падзелаў гэтыя землі на працягу шматлікіх гадоў належалі Рэчы Паспалітай, яны падвержаныя польскаму культурнаму ўплыву, і на іх пражывае значны працэнт польскага насельніцтва [15, s. 4].

Шматлікія польскія гісторыкі прызнавалі адмоўнае стаўленне насельніцтва «ўсходніх крэсаў» да польскай дзяржавы. Адну з прычын гэтага С. Мілкоўскі бачыў у тым, што гэтыя адносіны засноўваліся на стаўленні беларускіх сялян да абшарніка, які, як правіла, з’яўляўся палякам. Нянавісць да польскага абшарніка перарастае ў нянавісць да польскай дзяржавы [16, s. 66]. С. Грабскі, адзначаючы наяўнасць моцных прарасійскіх настрояў у насельніцтва «крэсаў», віну за гэта спрабаваў ускласці на сваіх палітычных апанентаў, якія ідэямі федэрацыі з Украінай і Беларуссю падтрымлівалі ўкраінскі і беларускі нацыяналізм [17, s. 42, 43]. Ю. Гертых адзначаў, што толькі пры знешняй падтрымцы сепаратызм на «ўсходніх крэсах» можа паспяхова развівацца [18, s. 109–110]. С. Мацкевіч лічыў, што створаныя бальшавікамі савецкія ўкраінская і беларуская дзяржавы ўсё ж даюць правы беларусам і ўкраінцам ужываць сваю мову. Адпаведна, украінскі або беларускі нацыяналізм зараз не можа быць выкарыстаны для разчлянення Расіі і можа аслабіць толькі Польшчу [19, s. 135].

Па меркаванні С. Ельскага, створаныя савецкім урадам «псеўданезалежныя рэспублікі Беларуская і Украінская» маюць мэтай дыскрэдытаваць палітыку Польшчы на яе ўсходніх землях і заваяваць сімпатыі беларускіх і ўкраінскіх палітыкаў [11, s. 57–58]. Л. Васілеўскі паказваў, што праз стварэнне «савецкай беларускай рэспублікі» Расія стварыла «беларускі П’емонт», да якога будуць імкнуцца ўсе беларусы, перш за ўсё тыя, якія пражываюць у Польшчы [5, s. 395].

С. Ельскі прызнаваў, што «ўсходнія крэсы» апынуліся ў стане анархіі і тлумачыў гэта выключна ўмяшаннем звонку, а не развіццём беларускага нацыянальнага руху на гэтых тэрыторыях, які вельмі слабы і не знаходзіць падтрымкі ў масах. Названы аўтар бачыў кіруючую сілу антыпольскага руху ў Заходняй Беларусі выключна ў КПЗБ, якая прыкрывалася легальнымі арганізацыямі, такімі, як БСРГ [11, s. 42, 58–59, 63, 66]. У. Банчкоўскі сцвярджаў, што дзейнасць камуністычных партый Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны накіравана на адарванне гэтых тэрыторый ад Польшчы і далучэнне іх да Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны [20, s. 32, 43].

Указваючы на падрыўную дзейнасць СССР як на прычыну беспарадкаў на «ўсходніх крэсах», С. Ельскі імкнуўся давесці, што польская палітыка на тэрыторыі Заходняй Беларусі адпавядала беларускім нацыянальным інтэрасам і не стварала перадумоў для незадаволенасці. Па яго меркаванню, закон 1924 г. даваў беларусам магчымасць адчыняць школы з беларускай мовай навучання. Ён адзначаў таксама высілкі польскага ўрада, накіраваныя на забеспячэнне паспяховага эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі [11, s. 80, 86]. Па меркаванні дадзенага даследчыка, гэтая палітыка была паспяховай, што прадэманстравалі выбары ў сойм 1922 г., падчас якіх кандыдаты ад блока нацыянальных меншасцяў набралі на «крэсах» толькі 26,2 % галасоў. Гэта сведчыла аб жаданні нацыянальных меншасцяў у большасці сваёй заставацца ў складзе польскай дзяржавы [11, s. 59–60]. У. Студніцкі таксама спрабаваў паказаць поспехі ў развіцці школьнай справы, спрыяльны ўплыў палітыкі польскай дзяржавы на гаспадарчае развіццё Заходняй Беларусі. Па яго меркаванню, дадзеныя землі ў рамках польскай дзяржавы атрымалі лепшыя магчымасці для развіцця сельскай гаспадаркі, чым мелі ў рамках Расійскай імперыі [21, s. 13–14, 21, 26]. Але сярод польскіх даследчыкаў меліся і тыя, хто досыць крытычна і рэалістычна ацэньваў польскую палітыку на «ўсходніх крэсах». С. Віславух, блізкі да лагера «санацыі», указваў на цяжкае эканамічнае становішча гэтых тэрыторый, сацыяльны і нацыянальны прыгнёт, чым і былі

абумоўленыя пракамуністычныя сімпатыі насельніцтва Заходняй Беларусі [22].

Польскія гісторыкі і публіцысты, вывучаючы сітуацыю на «ўсходніх крэсах», актыўна займаліся распрацоўкай рэкамендацый адносна палітыкі, якую польская дзяржава павінна праводзіць на гэтай тэрыторыі. С. Грабскі адстойваў пункт гледжання, што беларускае і ўкраінскае пытанні ў Польшчы можна вырашыць толькі стварэннем на ўсіх землях дзяржавы польскай нацыянальнай большасці. Калі гэта не атрымаецца, то хуткім часам Польшчы пагражае страта «ўсходніх крэсаў» [23, s. 69–70]. Ён лічыў, што праблем з асіміляцыяй насельніцтва «ўсходніх крэсаў» не будзе, бо «катастрофа кіеўскага паходу паказала, што ўкраінскага народа не існуе… Яшчэ менш існуе беларускі народ» [17, s. 42]. Е. Барташэвіч галоўную задачу польскай палітыкі ў Заходняй Беларусі бачыў у тым, каб не даць нацыянальным меншасцям ператварыцца ў меншасці палітычныя. Для гэтага варта паказаць беларусам, што яны маюць такія ж магчымасці ў сферы гаспадарчай дзейнасці, адукацыі, як і палякі, далучыць іх праз школу да польскай мовы [24, s. 95].

Е. Гертых у адной з сваіх прац адзначаў рэальную небяспеку страты Польшчай «усходніх крэсаў», лічачы гэта недапушчальным. Польская палітыка ў такіх умовах павінна быць накіраваная на барацьбу з рускім сепаратызмам і далучэнне беларусаў да еўрапейскіх каштоўнасцяў [18, s. 8–9]. Ён адзначаў няўдачу праводзімай у 1920-я гады ва ўсходніх ваяводствах палітыкі і пісаў у сувязі з гэтым: «Усё заявы аб праходжанні на «крэсах» вялікіх асіміляцыйных працэсаў – ёсць поўнае няведанне сітуацыі на «крэсах». Тым не менш, аўтар паказваў, што палітыка Польшчы на «крэсах» павінна быць усё ж палітыкай асіміляцыі [18, s. 22, 52]. Для яе ажыццяўлення неабходна было весці рашучую барацьбу з сепаратызмам на гэтых тэрыторыях, але ў той жа час дазволіць мясцоваму насельніцтву карыстацца сваёй мовай як бытавой і літаратурнай, але не адміністрацыйнай, дамагацца павелічэння на «ўсходніх крэсах» польскага насельніцтва [18, s. 78]. У. Студніцкі падтрымліваў ідэю інтэграцыі беларусаў у склад Польшчы праз асіміляцыю. Па яго меркаванню, гэта магчыма дзякуючы таму, што беларусы не з’яўляюцца самастойным этнасам, а ўяўляюць пераходную форму паміж палякамі і ўкраінцамі [25, s. 198]. Р. Кноль пісаў, што беларусы павінны растварыцца ў польскім народзе як адна з яго частак [26, s. 334, 336]. З пераходам у другой палове 1930-х гадоў «санацыі» да палітыкі нацыянальнай асіміляцыі, пазіцыі гісторыкаў-пілсудчыкаў і іх калегаў, блізкіх да эндэцыі, пры вывучэнні

праблем «усходніх крэсаў» зблізіліся. Прадстаўнікі абодвух кірункаў лічылі, што польскі цывілізацыйны ўплыў і моўная блізкасць дазволяць вырашыць задачу нацыянальнай асіміляцыі беларусаў у Польшчы [18, s. 134].

Сярод польскіх даследчыкаў існаваў пункт гледжання, што палітыка Польшчы ў дачыненні да беларускіх земляў пасля падпісання Рыжскага міру вызначалася, акрамя іншага, і «ягелонскай ідэяй» [27, s. 54–55]. Т. Галуўка лічыў стварэнне незалежнай Беларусі і незалежнай Украіны лепшым спосабам забяспечыць бяспеку Польшчы з боку СССР. Пры гэтым мелася на ўвазе, што яны будуць створаны за кошт БССР і УССР, а Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна застануцца ў складзе Польшчы. Задачу польскай дзяржавы ён бачыў у тым, каб заваяваць сімпатыі насельніцтва дадзеных тэрыторый. Ён сцвярджаў, што сярод беларусаў прыкметны рух па шляху нацыянальнай асіміляцыі, але лічыў такую палітыку памылковай і выступаў за дзяржаўную асіміляцыю [28, s. 82–83, 164]. А. Бахеньскі ў сваю чаргу казаў аб магчымасці вырашэння праблемы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны праз стварэнне незалежных беларускай і ўкраінскай дзяржаў. Па яго меркаванню, такі варыянт развіцця падзей з’яўляўся спрыяльным для развіцця польска-савецкіх адносін, бо ў гэтым выпадку знікне агульная мяжа паміж Польшчай і СССР, і знікне, адпаведна, асноўная прычына канфліктаў паміж гэтымі краінамі [29, s. 71].

Такім чынам, польская міжваенная гістарыяграфія, звяртаючыся да праблем найноўшай гісторыі Беларусі, вырашала не столькі навуковую задачу, колькі імкнулася прывесці аргументы на карысць той палітыкі, якую праводзіла тагачасная польская дзяржава на беларускім напрамку. Такі падыход вёў да таго, што польскія гісторыкі адыходзілі ад пошуку навуковай ісціны і не змаглі ў многіх выпадках сфармуляваць палажэнні, якія аб’ектыўна адлюстроўвалі б падзеі і працэсы беларускай гісторыі 1918–1939 гг.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры

1 Kutrzeba, S. Kongres, traktat i Polska / S. Kutrzeba. – Warszawa : Gebetchner i Wolff, 1919. – 198 s.
2 Czekanowski, J. Wschodnie zagadnienia graniczne Polski i stosunki etniczno-społeczne / J. Czekanowski. – Łwów : Druk. «Slowa polskiego», 1921. – 144 s.
3 Studnicki, W. Połnocno-wshodnie ziemie dawnej Rzeczypospolitej Polski / W. Studnicki. – Warszawa : Druk Synów St. Niemiry, 1919. – 28 s.

4 Olęndzki, K. Kresy wshodnie a Polska / K. Olęndzki. – Warszawa : Druk. Z. Swięntóńskiego, 1919. – 16 s.
5 Wasilewski, L. Białoruś i ruch białoruski / L. Wasilewski // Przegląd Wspolczesny. – 1920. – № 9. – S. 389–403.
6 Kozicki, S. Sprawa granic Polski na konferencji pokojowej w Paryży / S. Kozicki. – Warszawa : Przyński, Niklewicz i Sp?lka, 1921. – 176 s.
7 Kutrzeba, S. Polska odrodzona 1914–1922 / S. Kutrzeba. – Kraków : Gebethner i Wolff, 1922. – 264 s.
8 Гамулка, К. Паміж Польшча і Расіяй. Беларусь ў канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918–1922) / К. Гамулка; пераклад з польскай мовы. – Вільня : Выд-ва Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, 2008. – 256 с.
9 Wasilewski, L. J?zef Pilsudski. Jakim Go znałem / L. Wasilewski. – Warszawa : Wyd. «Roj», 1935. – 235 s.
10 Polska wyzwołona. 1918–1933. – Warszawa: Wyd. Karola Merperta, 1933. – 245 s.
11 Ełski, S. Sprawa bialoruska. Zarys historyczno-polityczny / S. Ełski. – Warszawa : b. w., 1931. – 105 s.
12 Мязга, М. М. Пытанне беларускай дзяржаўнасці ў палітыцы Польшчы ў час польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў / М. М. Мязга // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны : зб. навук. арт. / рэд. калегія Р. Р. Лазько (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Гомель: УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», 2013. – Вып. 2. – С. 59–66.
13 Пшибыльский, А. Войны польского империализма 1918–1921 / А. Пшибыльский. – М. : Государственное военное издание, 1931. – 255 с.
14 Werny, A. Na szlahach dziejowych Romana Dmowskiego / A. Werny. – Warszawa : Druk. T. Dobrzyńskię, 1939. – 136 s.
15 Srokowski, S. Uwagi o kresach wschodnich / S. Srokowski. – Kraków : Dr. «Czasu», 1925. – 26 s.
16 Miłkowski, S. Walka j nową Polskę / S. Miłkowski. – Warszawa : «Radom», 1925. – 79 s.
17 Grabski, S. Z zagadnień polityki narodowo-państwowej / S. Grabski. – Warszawa : Perzyński, Niklewicz i s-ka, 1925. – 134 s.
18 Giertych, J. O program polityki kresowoj / J. Giertych. – Warszawa : Wyd. «Patria», 1932. – 148 s.
19 Mackiewicz, S. Historia Polski od 11 listopada 1918 r. do 17 wrześnja 1939 r. / S. Mackiewicz. –London : M.I. Kolin, 1958. – 347 s.
20 Bączkowski, W. O wschodnich problemach Polski / W. Bączkowski. – Kraków : Księgarnia Akademicka, 2000. – 226 s.
21 Studnicki, W. Ziemie wshodnie. Stan gospodarczy i widoki rozwoju / W. Studnicki. – Warszawa : Nakladem tygodnika Przemysl i gandel, 1929. – 81 s.

22 Wysłouch, S. Rola komunistycznej partii Zachodniej Białorusi w ruchu narodowym Bialorusinów w Polsce / S. Wysłouch. – Wilno : Instytut Naukowo-Badawczy Europy Wschodnej w Wilno, 1933. – 71 s.
23 Grabski, S. Uwagi o bieżącej historycznej chwili Polski / S. Grabski. – Warszawa : Nakładem księgarni Perzyński, Niklewicz i s-ka, 1922. – 160 s.
24 Bartoszewicz, J. Zagadnienia polityki Polskiej / J. Bartoszewicz. – Warszawa : Tow. Wydawnicze Patria, 1929. – 151 s.
25 Gzela, J. Traktat ryski w ocenie Władysława Studnickiego / J. Gzela // Traktat ryski 1921 roku po 75 latach: studia / Pod red. M. Wojciehowskiego. – Toruń : Wyd. Uniwersytetu Mikolaja Kopernika, 1998. – S. 193–208.
26 Parus, W. Od konsolidacji panstwowej do konsolidacji narodowej w myśli politycznej obozu piłsudczykowskiego (1926–1939) / W. Parus. – Lublin : Wyd. Uniwersytetu Marii Curi Sklodowskiej, 1997. – 424 s.
27 Gawroński, J. Zagadnienie czarnomorski / J. Gawroński. – Warszawa : Glowna drukarnia wojskowa, 1931. – 57 s.
28 Chojnowski, A. Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921–1939 / A. Chojnowski. – Wrocław – Warszawa – Gdańsk : Wyd. Polskiej Akademii Nauk, 1979. – 262 s.
29 Bochieński, A. Między Niemcami a Rosja / A. Bocheński. – Warszawa : Księgarnia F. Hoesiek, 1937. – 185 s.

УДК 94(476) «19/1914»

**В. А. МІХЕДЗЬКА**
(Гомель, УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)

## «ПОЛЬСКАЯ ПРАБЛЕМА» І РАСІЙСКАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ Ў ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ

*У артыкуле разгледжаны некаторыя аспекты дачыненняў расійскай адміністрацыі з польскімі землеўладальнікамі Паўночна-заходняга краю на пачатку ХХ ст. Урад і мясцовыя польскія землеўладальнікі збліжаліся на аснове агульнай зацікаўленасці ў захаванні саслоўнай і маёмаснай іерархіі грамадскага і эканамічнага жыцця краю, аднак ва ўмовах дзейнасці Дзяржаўнай Думы адбываецца паступовае вяртанне да антыпольскай рыторыкі.*

Пасля паўстання 1863–1864 г. на працягу трох дзесяцігоддзяў ў краі дзейнічала складаная сістэма заканадаўчых абмежаванняў

польскага насельніцтва ў гаспадарчым, грамадскім і культурна-рэлігійным жыцці. Асабліва жорсткім абмежавальны рэжым стаўся ў 80-я гг. XIX ст. [1; 2].

Пачатак царавання Мікалая II многімі польскімі землеўладальнікамі Паўночна-Заходняга краю быў успрыняты з надзеяй на памякчэнне абмежавальнага рэжыму. Цар, акрамя спагадлівых жэстаў у бок каталіцкай царквы, загадаў скасаваць кантрыбуцыйны грашовы збор, які польскія землеўласнікі плацілі ад часоў Мураўёва [3, с. 153; 4, с.143–144]. На фоне захавання абмежаванняў у сфера зямельнай уласнасці, антыпольскае стаўленне з боку мясцовай адміністрацыі да пачатка XX ст. выяўляецца адзінкавымі, часцей сімвалічнымі, выпадкамі. Як сведчаць справаздачы губернатараў беларускіх губерняў, у першыя гады XX ст. польскія землеўладальнікі ўспрымаліся як кансерватыўны асяродак, на які ўрад мог абаперціся перад набіраўшым моц сацыяльным рухам [5, арк. 3 адв.; 6, арк. 5адв–6]. Заможныя землеўласнікі края таксама бачылі ў асобнах саноўніках-прадстаўніках вышэйшай адміністрацыі натуральных саюзнікаў. Па ўспамінах І. Корвін-Мілеўскага, віленскі генерал-губернатар М. Троцкі (канец 1897 – вясна 1901 гг.) «як заможны землеўладальнік Цверскай губерні пачуваўся значна бліжэй землеўласніку і кансерватару Корвін-Мілеўскаму», чымсьці немаёмасным "канцылярскім шаўкам" губернскай канцылярыі [3, с. 159]. Падобна ўспрымалася гэтая блізкасць і з рускага ўрадавага боку: «Рускай ўладзе польская арыстакратыя імпанавала сваім багаццем, раскошай, сваяцтвам з арыстакратычнымі сем'ямі Еўропы. Руская ўлада … разумела да таго ж,…што гэта адзіны клас польскага грамадства, на які магчыма спадзявацца» [7, с. 30].

Віленскі генерал-губернатар П. Дз. Святаполк-Мірскі ў дакладзе Мікалаю II у маі 1904 г. таксама адзначаў кансерватыўнасць польскіх землеўладальнікаў, якія, на ягоную думку, ператварыліся у апору расійскага ўрада [8, арк. 7 адв., 60, 63 адв., 100].

Рускія памешчыкі, павялічэння колькасці якіх у краі ўрад дамагаўся з дапамогай абмежавальнага заканадаўства, такую апору ўраду яшчэ не маглі. У масе сваёй яны не гаспадарылі самі ў набытых маёнтках, аддаючы перавагу службе у Пецярбурзе і ў цэнтральных расійскіх губернях. Яны аддавалі маёнткі ў кіраванне мясцовым ураджэнцам ці у арэнду. Шмат хто з рускіх пакупнікоў набывалі зямлю ў спекулятыўных мэтах [9, с. 25]. Варта адзначыць, што віленскі генерал-губернатар у гэтым кантэксце скептычна ацэньваў мясцовых рускіх землеўладальнікаў. П. Дз. Святаполк-Мірскі заўважаў: «памешчык рускага паходжання …. частакроць з'яўляецца драпежнікам

зямлі, які ігнаруе ўсе патрэбы ўрада» [8, арк.10 адв.]. Такім чынам, расійская адміністрацыя ў гэты час бачыла у збліжэнні з мясцовымі польскімі землеўладальнікамі магчымасць умацаваць свае пазіцыі ў краі ва ўмовах пашырэння сацыяльнага пратэстнага руху. Сведчаннем «перыяду зычлівасці» ў дзяржаўнай палітыцы мясцовыя палякі лічылі і стрыманую рэакцыю ўладаў на "радыкалізм" і «нягнуткасць» віленскіх каталіцкіх біскупаў С. Зваровіча, а потым і Э. фон Ропа [3, с. 153–154].

Збліжэнне П. Святаполк-Мірскага з мясцовымі буйнымі землеўладальнікамі напэўна паўплывала на лібералізацыю палітыкі ў адносінах да палякаў. У снежні 1904 г. царскі маніфест абвясціў перагляд абмежавальнага заканадаўства у дачыненні да «іншародцаў» [10, с. 1197–1198]. Апублікаваны 17 красавіка 1905 г. «Указ аб умацаванні пачаткаў верацярплівасці» абвяшчаў скасаванне ушчымлівых забаронаў ў дзейнасці каталіцкай царквы і, па сведчанні Э. Вайніловіча, пакінуў вялікае ўражанне на мясцовае польскае грамадства [9, с. 108–109; 11, с. 237–238]. 1 мая 1905 г. былі скасаваны найбольш значныя абмежаванні для палякаў у пазямельнай сферы [12, с. 286–287].

Цікава, што ў выніку збліжэння расійскай адміністрацыі і мясцовых польскіх землеўладальнікаў у Вільні усталяваўся пэўны моўны этыкет, калі на афіцыйных мерапрыемствах прадстаўнікі ўлады размаўлялі толькі па-рускі, але ў прыватнай сітуацыі з мужчынамі-палякамі і заўсёды з жанчынамі, – пераходзілі на французскую мову [7, с. 31].

Вышэйшай праявай «спрыяльнай палітыкі» да польскіх землеўладальнікаў літоўска-беларускіх губерняў сталася прапанова П. Сталыпіна Э. Вайніловічу заняць пасаду таварыша міністра земляробства, ад якой той адмовіўся [9, с. 131]. Як пазней у сваіх успамінах іранічна адзначаў І. Корвін-Мілеўскі: «Пан Эдвард адмовіўся і меў рацыю, бо быў у ім матэрыял на шэфа, а не "таварыша"…» [3, с. 251].

Пачатак думскага перыяду паставіў узаемадзеянне расійскай адміністрацыі і польскага грамадства края ў новыя ўмовы. Першапачаткова, стварэнне асобных дэпутацкіх груповак ад польскіх «прывісленскіх» губерняў і ад беларуска-літоўска-украінскіх губерняў было выразным лаялісцкім сігналам. Як адзначаў дасведчаны І. Корвін-Мілеўскі, і ў Дзяржаўнай радзе польская групоўка набыла ў 1906 г. рэпутацыю кансерватыўнага «асяродка палітычнай раўнаўвагі» [3, с. 251].

У той жа час, ускладненне грамадска-палітычнага жыцця і рэанімацыя «польскага пытання» прывялі да новага ўздыму змагання з праявамі мясцовага сепаратызму. Пры захаванні выразнай антысеміцкай палітыкі, галоўную небяспеку зноў пачалі бачыць у арганізаваных

польскіх колах, якія здолелі мабілізаваць значныя фінансавыя, арганізацыйныя і інтэлектуальныя сродкі для заваёвы прадстаўніцтва ў Думе, у сістэме мясцовага гарадскога самакіравання. У дакладной запісцы, якая была пададзена прэм'ер-міністру У. М. Какаўцову адзначалася, што ў «Паўночна-Заходнім краі гарадское самакіраванне знаходзіцца амаль выключна ў польскіх руках… фізіяномія гарадоў стаецца ўсё больш польскай …а гэта ўплывае на далейшае апалячванне беларускай вёскі» [13, с. 52–53]. Для забеспячэння расійскіх прыярытэтаў была праведзена рэформа выбарчага заканадаўства, якая істотна абмежавала прадстаўніцтва польскай грамады ў Дзяржаўнай Думе.

Вяртанне палітычнага курса да канфрантацыі з палякамі мясцовыя польскія дзеячы кансерватыўнага накірунка звязвалі ў тым ліку са зменай асабістага стаўлення Мікалая ІІ-га: «нашы варшаўскія мудрацы самі наладзілі яму ў 1907 г. грубіянскі афронт, якога аніводны манарх, асабліва аніводны Раманаў, ані забыцца, ані дараваць не мог» [3, с. 193]. Падчас цырымоніі адкрыцця дзейнасці ІІ-й Дзяржаўнай Думы польскія дэпутаты, адначасова з фракцыяй сацыял-дэмакратаў, дэманстратыўна адмовіліся ўстаць на знак пашаны да асобы імператара. У выніку, пазней заўважаў І. Корвін-Мілеўскі, «ад той хвіліны зрабілі сабе з зычлівага да гэтага часу Мікалая ІІ-га непрымірымага ворага…» [3, с. 260].

Відавочна, аднак, што асабістая крыўда Мікалая ІІ-га толькі ўзмацніла тое агульнае ўражанне небяспекі для расійскага панавання, што стварыла хуткая рэстаўрацыя эканамічнага, грамадскага і культурнага ўплыву палякаў на «заходніх ускраінах» імперыі. Пра гэта з думскай трыбуны і на старонках прэсы ўсё гучней казалі расійскія нацыяналістычныя партыі. Змянілася ў гэтым жа накірунку танальнасць паведамленняў беларуска-літоўскіх губернскіх уладаў.

Яскравым сведчаннем заклапочанасці расійскай адміністрацыі ўзростам польскага ўплыву ў краі з'яўляецца падрыхтаваная мінскім губернатарам А. Ф. Гірсам «Докладная записка о мерах, могущих укрепить национальное самосознание белоруссов и противодействовать их полонизации» [14]. А. Ф. Гірс меў дастаткова значны досвед знаёмства з «заходнімі ўскраінамі». Грамадзянская служба яго пачыналася з пасадаў павятовага маршалка Ковенскай, а потым Мінскай губерняў, пасля быў кіеўскім губернатарам. Гэты дакумент, які быў створаны ў студзені 1914 г., відавочна ад пачатку меў праграмны характар. Асобны адбітак запіскі пад грыфам «зусім сакрэтна» быў адрасаваны мінскаму губернскаму маршалку А. С. Далгаво-Сабураву.

Неабходна адразу зазначыць, што, гаворачы пра «нацыянальную самасвядомасць беларусаў», А. Ф. Гірс зыходзіў з афіцыйнай канцэпцыі «трыадзінага рускага народу» і меў на ўвазе ўмацаванне менавіта расійскай свядомасці сярод беларускага насельніцтва.

«Запіска» А. Ф. Гірса пачынаецца з прызнання заслуг М. М. Мураўёва ў стварэнні падмурка для умацавання «рускіх пачаткаў» і развіцця «рускай культуры ў краі за кошт польскай». У гэтым кантэксце мінскі губернатар заўважаў, што скасаванне многіх абмежавальных заканадаўчых норм было заўчасным: «суцэльны шэраг фактаў сведчыць, што рускі элемент у краі яшчэ недастаткова ўмацаваўся, каб уласнымі намаганнямі адстаяць край для Расіі і для рускай культуры» [14, с. 1]. Праз дзесяць гадоў пасля аптымістычных заяў П. Дз. Святаполк-Мірскага мінскі губернатар сумна канстатаваў: «як толькі былі скасаваны ўсе забароны … зараз жа выявілася ўся перавага польскай меншасці і ў культурных і у эканамічных адносінах і недастатковая падрыхтаванасць рускай большасці для супрацьдзеяння польскай гегемоніі ў краі. Польскае жыццё ва ўсіх культурных галінах пачало заўважна перамагаць рускае жыццё…» [14, с. 13]. Дзеля таго, каб «адстаяць край для Расіі», мінскі губернатар прапаноўваў захаваць старыя, а ў шэрагу выпадкаў стварыць новыя абмежавальныя нормы ў дачыненні да польскага насельніцтва края і каталіцкага касцёла. Акрамя таго, А. Ф. Гірс лічыў неабходнымі мерапрыемствы, якія, на ягоную думку, мусілі спрыяць развіццю «рускіх пачаткаў» у краі. Сярод найбольшых значных абмежавальных задач, якія стаялі перад урадам, ён вызначаў спыненне дзейнасці сярод беларускага каталіцкага насельніцтва тайных польскіх школ, жорсткі кантроль за рухам зямельнай уласнасці ў краі. Вялікую небяспеку для рускай прысутнасці ў краі губернатар бачыў у паланізацыйным характары дзейнасці мясцовых біскупаў-палякаў і каталіцкіх семінарый, пашырэнні каталіцкага празелітызма. Губернатар А. Ф. Гірс пераконваў урад, што «у справе паланізатарскай дзейнасці злучаюцца ўсе палякі края незалежна ад стана» [14, с. 7]. Таму, лічыў губернатар, нельга дапускаць «палякаў і католікаў» на пасады, якія забяспечваюць непасрэдны кантакт з народнымі масамі і ўсяляк абмежаваць іх прысутнасць у земскіх установах. Вялікую небяспеку для ўрада губернатар бачыў у фактычным захопе палякамі ўстаноў гарадскога кіравання: «гарадскія ўправы Заходняга края павінны быць забраныя з польскіх рук… і мусіць быць ўведзена курыяльная сістэма выбараў галосных па нацыянальнасцях, рускую большасць сярод галосных патрэбна замацаваць законам» [ 14, с. 12].

Буйным недахопам папярэдняй “ускраіннай палітыкі” мінскі губернатар лічыў ігнараванне «багатага і ўдзячнага этнаграфічнага матэрыялу, якім з’яўляецца беларускае племя. Багата адоранае ад прыроды, незвычайна працавітае, цвярозае, несумненна адданае Расіі і Рускаму Пасаду» [14, с. 14]. Мінскі губернатар прапаноўваў рэфармаваць дзейнасць мясцовых настаўніцкіх семінарый і пачатковых школ, павялічыўшы аб’ём выкладання у іх гісторыі, «асабліва мясцовай», геаграфіі Расіі і рускай літаратуры. На гэтыя навучальныя установы, пераконваў губернатар, «неабходна глядзець не толькі з педагагічнага пункту, але і з пункту гледжання палітычнага, як на адзіны пакуль шлях далучэння найбольш здольных прадстаўнікоў беларускага племені да рускай культуры» [14, с. 15]. Але паўставала праблема забеспячэння навучальных устаноў «правільнымі» падручнікамі. А. Ф. Гірс лічыў такімі творы М. Каяловіча і П. Бранцава, якія з’явіліся яшчэ за мураўёўскім часам. Таму ўраду неабходна было паклапаціцца і дапамагчы «мясцоваму рускаму грамадству у яго памкненні ведаць гісторыю края ў бесстароннім асвятленні» [14, с. 17].

Значным рэсурсам супрацьдзеяння польскім уплывам А. Ф. Гірс ужо традыцыйна лічыў праваслаўную царкву і перад усім прапаноўваў мабілізаваць на барацьбу з «паланізмам» праваслаўныя брацтвы [14, с. 17–19; 23–24].

Сярод прапаноў мінскага губернатара было і стварэнне ў Мінску сельскагаспадарчага інстытута. Патрэба у ім тлумачылася неабходнасцю забяспечыць рускіх землеўладальнікаў, недасведчаных у мясцовых умовах гаспадарання, паслугамі «рускіх аграномаў»: «недахоп рускіх людзей з агранамічнымі ведамі і адначасова знаёмых з умовамі мясцовай сельскай гаспадаркі надта згубна ўплывае на развіццё ў краі рускага землеўладання, ператвараючы яго частакроць у фікцыю». Як за дзесяць гадоў да таго зрабіў П. Дз. Святаполк-Мірскі, мінскі губенатар наракаў: «рускае дваранства, што набыло ў краі зямельныя маёмасці …належыць да разраду людзей…, якія зрэдку маюць магчымасць жыць у сваіх маёнтках і кіраваць імі непасрэдна». У выніку, заўважаў А. Ф. Гірс, у краі распаўсюдзілася з’ява, калі «маёнтак лічыўся ўласнасцю рускага памешчыка, …а фактычна ён знаходзіўся ў руках аканома паляка…» [14, с. 22]. Адначасова, А. Ф. Гірс звяртаў увагу ўраду на неабходнасць развіцця «рускага землеўладання». На думку мінскага губернатара, мясцовае сялянства не магло стацца асноўным суб’ектам рускай зямельнай уласнасці з-за сваёй «некультурнасці». Як заўважаў губернатар, «разлічваць, што сілы гэтыя можа даць рускае дваранства нельга …. нават у цэнтры Расіі дваранскае

землеўладанне пачынае існі да заняпаду». Таму патрэбна «звярнуцца …да мясцовых рускіх культурных сіл недваранскага паходжання, да праваслаўнага духавенства, якое дала значныя кадры мясцовай рускай інтэлігенцыі…, да рускага чынавенства, сярод якога частка элемента прышлага з цэнтра Расіі, частка ж вылучаная мясцовым насельніцтвам, а таксама да той мясцовай рускай інтэлігенцыі, якая вылучана мясцовым беларускім насельніцтвам, дзякуючы паўвекавой дзейнасці тут рускай школы. Гэта інтэлігенцыя, у асяроддзі якой пераважнай па колькасці групай з'яўляюцца настаўнікі народных і царкоўна-прыхадскіх школ, найбольш прыдатная для стварэння з яе рускіх культурных землеўладальнікаў, з прычыны таго, што яна знаёмая з мясцовымі ўмовамі жыцця і сельскай гаспадаркі і безумоўна варожая да паланізатарскіх тэндэнцыяў палякаў» [14, с. 14].

Такім чынам, прапанаваныя А. Ф. Гірсам захады не выходзілі за межы, вызначаныя калісьці яшчэ М. Мураўёвым. Адзіным параўнальна новым сталася дастаткова высокая ўвага да магчымасцей выкарыстання у антыпольскім змаганні беларускага насельніцтва. Што праўда, і тут А. Ф. Гірс падмацаваў свае прапановы аўтарытэтам М. Мураўёва, які быццам быў першы, хто «зразумеў і ацаніў значнасць гэтага багатага этнаграфічнага матэрыяла» [14, с. 15].

Такім чынам, пашырэнне і радыкалізацыя грамадскага руху у канцы XIX і асабліва першыя гады XX ст. прымашала расійскую ўладу да збліжэння з кансерватыўнымі польскімі элітамі края. Наступствам гэтага збліжэння сталася паслабленне антыпольскай рыторыкі і частковае скасаванне абмежавальнага заканадаўства. Аднак хуткае аднаўленне польскімі элітамі сацыяльна-эканамічнага і культурнага лідэрства у «заходнім краі» пасля 1905 г. выклікаў новы ўздым антыпольскіх настрояў, памкненне рэстаўраваць антыпольскае абмежавальнае заканадаўства і выкарыстаць беларускае насельніцтва ў барацьбе супраць палякаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1 Самбук, С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половше XIX в. / С. М. Самбук. – Минск, 1980.
2 Смалянчук, А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты1917 г. / А. Смалянчук. – Спб. : Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.
3 Korwin-Milewski, H. Siedemdziesąt lat wspomnień (1855–1925) / H. Korwin-Milewski. – Poznań, 1930. – 603 s.
4 Об отмене…особого процентного сбора в доход казны с недвижимых имений лиц польского происхождения в девяти западных губерниях //

Полное собрание законов Российской империи. – Собрание 3-е. – Т. XVII . – СПб., 1900. – № 13899.
5 Отчет виленского губернатора за 1903 год / Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 1284. Оп. 194. Д. 52.
6 Отчет минского губернатора за 1902 год / РГИА. – Фонд 1284. Оп. 194. Д. 98.
7 Любимов, Л. На чужбине / Л. Любимов. – Ташкент : Узбекистан, 1979. – 384 с.
8 Отчет виленского генерал-губернатора П.Д.Святополка-Мирского от 20 мая 1904 года / РГИА. – Фонд .1284. Оп.194. Д.136.
9 Woyniłłowicz, E. Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza / E. Woyniłłowicz . – Wilno, 1931. – 365 s.
10 О предначертаниях к усовершенствованию государственного порядка // Полное собрание законов Российской империи. – Собрание 3-е. – Т. 24. – СПб., 1907. – № 25495.
11 Об укреплении начал веротерпимости // Полное собрание законов Российской империи. – Собрание 3-е. – Т. XXV. – Ч. 1. – СПб., 1908. – № 26125.
12 О порядке выполнения пункта седьмого именного указа 12 декабря 1904 г. в отношении девяти западных губерний // Полное собрание законов Российской империи. – Собрание 3-е. – Т. XXV . – Ч. 1. – СПб., 1908. – № 26163.
13 Правые партии 1905–1917. Документы и материалы : в 2 т. – Т. 2: 1911–1917 гг. – М. : Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 1998.
14 Докладная записка «О мерах, могущих укрепить национальное самосознание белоруссов и противодействовать их полонизации» минского губернатора Гирса // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 60. – Воп. 3. – Спр. 114.

УДК 930.(476)

**А. А. САВІЧ**
(Брэст, УА «Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»)

# ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫЯ АСПЕКТЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА КАМУНІСТАЎ І БУНДА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ 1920-х ГАДОЎ

*Айчынная савецкая гістарыяграфія сфарміравала негатыўны вобраз Бунда і яго ролі ў грамадска-палітычным жыцці гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., пазіцыянуючы арганізацыю ў шэрагу*

*прынцыповых апанентаў Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Аднак глыбокае знаёмства з архіўнымі дакументамі ілюструе актыўныя ўзаемаадносіны Бунда і партыйна-дзяржаўных інстанцый БССР, а потым і КПЗБ па фарміраванні апазіцыйных польскаму ўраду настрояў і фарміраванні заходнебеларускага камуністычнага падполля ў пачатку 1920-х гадоў.*

У айчыннай гістарыяграфіі савецкага часу ў дачыненні да Бунда, як і да іншых яэрэйскіх партый і рухаў, назіраліся пэўная насцярожанасць і вядомы недавер, які быў выкліканы наступствамі партыйнага сацыял-дэмакратычнага будаўніцтва ў Расіі ў пачатку XX ст., калі прадстаўнікі яўрэйскай сацыял-дэмакратыі заяўлялі аб сваім імкненні адстойваць правы рабочых менавіта яўрэйскай нацыі. Гістарыяграфічная традыцыя негатыўнага стаўлення да дзейнасці Бунда ў Заходняй Беларусі была сфарміравана яшчэ ў 1920–1930-я гады ва ўмовах актыўнай барацьбы за уплыў у рабочым руху паміж КПЗБ, дзейнасць якой да сярэдзіны 1930-х гадоў у айчыннай гістарыяграфіі падавалася як выключна станоўчая і авангардная ў рэвалюцыйным руху [1, с. 38], і Бундам і Польскай партыяй сацыялістычнай (ППС). Бунд і ППС, як вядома, былі вядучымі палітычнымі сіламі, якія ў асноўным вызначалі змест і актыўнасць рабочых выступленняў, акцэнтуючы ўвагу на эканамічных патрабаваннях, не падзялялі імкненне КПЗБ скіраваць эканамічны рух у рэчышча рэвалюцыйнага і выступалі ў дачыненні да КПЗБ у якасці палітычных апанентаў.

Не дзіўна, што ў міжваенны перыяд за Бундам у кантэксце гісторыі Заходняй Беларусі ў савецкай гістарыяграфіі замацаваліся негатыўныя фармулёўкі, якія адлюстроўвалі асаблівасці, вастрыню і супярэчлівасці заходнебеларускага грамадска-палітычнага руху, які, апрача аб’ектыўных прычын нацыянальнага і ідэйна-палітычнага характару, залежыў ад розных «ухілаў» КПЗБ і Камінтэрна. Імкненне Бунда захаваць сваё аблічча легельнай партыі, арганізацыйную самастойнасць яўрэйскага рабочага руху, у тым ліку стварэнне прафсаюзаў на нацыянальнай аснове, «адцягвала яўрэйскіх рабочых ад сумеснай з польскімі, беларускімі і ўкраінскімі рабочымі барацьбы за агульныя сацыяльныя і палітычныя інтарэсы» [2]. Гэта не магло не прывесці да сутыкненняў з камуністамі, для якіх ідэі інтэрнацыяналізму і арганізацыі «адзінага фронту барацьбы супраць буржуазіі і фашызму» былі асновай палітычнай ідэалогіі. Камуністы часта звярталіся непасрэдна, «над галовамі» бундаўскіх кіраўнікоў, да шэраговых членаў партыі з заклікам да больш цеснага супрацоўніцтва, аднак адчувальнага поспеху такія захады не

маглі забяспечыць. Не дзіўна, што на старонках друкаваных выданняў 1920–1930-х гадоў Бунд кваліфікуецца як згодніцкая, апартуністычная, дробнабуржуазная, сацыя- і нацыянал-фашыстоўская партыя [3–6].

Прынцыпова не змяніліся фармулёўкі ў дачыненні да дзейнасці Бунда ў Заходняй Беларусі і пасля палітычнай рэабілітацыі КПЗБ у час працы ХХ з’езда КПСС, які стаў адпраўной кропкай актыўнага даследавання гісторыі КПЗБ на працягу 1960–1980-х гадоў як «авангарда барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне». Такая гістарыяграфічная канструкцыя не дапускала аб’ектыўнага даследавання гісторыі апазіцыйных камуністам партый. Як і раней, бундаўская гісторыя гэта гісторыя «згодніцкай, рэфармісцкай партыі», якая «распаўсюджвае ў рабочым руху нацыяналізм, апартунізм і згодніцтва». Пры гэтым сустракаюцца і зусім ненавуковыя фармулёўкі аб тым, што «насуперак згодніцкай палітыкі ППС і Бунда… камуністы… імкнуліся ўзняць рабочых на барацьбу за задавальненне паўсядзённых патрэб працоўных» [7, с. 35; 8, с. 45, 66].

Дзеля аб’ектыўнасці адзначым, што ў асобных даследаваннях меліся згадкі пра ўзаемадзеянні камуністаў з бундаўцамі, прысутнічалі намёкі на палітычную значнасць Бунда ў рабочым руху Заходняй Беларусі. Напрыклад, гісторыкі адзначылі ўзаемадзеянне камуністаў, бундаўцаў і пэпээсаўцаў у 1922 г. у Беластоку, дзе ў выніку агульных намаганняў быў створаны агульны з ППС і Бундам першамайскі камітэт. Як адзінкавыя гістарыяграфічныя факты можна прывескі згадкі пра «сектанцкія» рашэнні ІІІ з’езда КПП у 1925 г., які «адмовіў магчымасць якіх-небудзь кампрамісаў з кіраўніцтвам ППС і Бунда і прызнаў магчымым адзінства дзеянняў толькі з нізамі гэтых партый» , а таксама пра «памылковую, сектанцкую ўстаноўку ЦК КПП арганізаваць самастойныя першамайскія дэманстрацыі асобна ад ППС і Бунда». Пры гэтым бездоказна, неабгрунтавана акцэнтавалася ўвага на «рэакцыйнай сутнасці згодніцкай палітыкі» кіраўніцтва Бунда, іх «прыслужніцтва эксплуатататарам» [7, с. 44, 105, 110, 145]. Гэткім чынам павінна было стварыцца ўражанне пра адарванасць кіраўнікоў Бунда ад інтарэсаў яўрэйскіх рабочых, якія паверылі падманлівым абяцанням і павінны былі перайсці пад «правільны» камуністычны ўплыў.

Больш узважаны і памяркоўны тон у дачыненні да Бунда заўважаецца пры асвятленні праблем арганізацыі камуністамі адзінага фронту ў Заходняй Беларусі ў сярэдзіне 1930-х гадоў [7, с. 298–301; 8, с. 251, 258, 259, 265, 267, 276, 278, 290]. Аднак і тут увага акцэнтуецца на нежаданні Бунда наладжваць сапраўднае супрацоўніцтва, «рэфармісцкая, згодніцкая» сутнасць партыі абцяжарвалася згадкай

«недальнабачных» паводзін кіраўніцтва Бунда, якое адмаўляла прапановы камуністаў арганізаваць адзіны рабочы і народны фронт у барацьбе з фашызмам, пры гэтым даследчыкі абыходзілі маўчаннем прычынны, якія адштурхоўвалі ад супрацоўніцтва з КПЗБ. У лепшым выпадку гутарка шла аб непераадоленні часткай камуністаў «астаткаў сектанцтва», няздольнасці і нежаданні шукаць правільны падыход да мясцовых арганізацый Бунда. Але, вядома, што нежаданне Бунда ісці на супрацоўніцтва з камуністамі шмат у чым, акрамя праграмных разыходжанняў, тлумачылася дэструктыўнымі, валюнтарысцкім дзеяннямі, якія КПЗБ дэманстравала ў дачыненні да сваіх палітычных апанентаў-партнёраў.

Аб’ектывізацыя гісторыі Заходняй Беларусі і месца ў ёй Бунда адбылося ва ўмовах незалежнай Рэспублікі Беларусь. Значным крокам у даследаванні праблем узаемаадносін паміж КПЗБ і Бундам сталі кандыдацкія дысертацыі А. Румака, М. Сямёнчыка, А. Машчука, П. Стэцкевіча і В. Шчукі, у якіх пераадольвалася раней усталяванае меркаванне аб безумоўнай гегемоніі КПЗБ у рабочым руху, звярталася ўвага на важнае значэнне Бунда ў грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі [9–13].

Разам з гэтым неабходна адзначыць амаль незакранутую тэму супрацоўніцтва паміж партыйна-дзяржаўнымі органамі БССР і Бундам па фарміраванні камуністычнага падполля ў Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў, галоўнай праблемай якога былі складанасці з падборам кандыдатур для перапраўкі на падпольную работу ў Польшчу. Выхадцаў з заходнебеларускіх абшараў – вопытных і правераных камуністаў, якія добра ведалі б мясцовую спецыфіку, мелі больш шанцаў адаптавацца да ўмоў падпольнай работы і выконваць заданні цэнтра, не хапала. Складаная кадравая сітуацыя падштурхоўвала КП(б)Б да супрацоўніцтва з Бундам, а фактычна да арганізацыйнага ажыццяўлення і фінансавання перакідкі бундаўцаў на тэрыторыю Польшчы са спадзяваннямі на іх наступны ўдзел у падкантрольным Мінску падпольным пракамуністычным руху. Вядома, што член Польбюро ЦК КП(б)Б А. Славінскі ў лютым 1921 г. звяртаўся ў ЦК Бунда з просьбай дазволіць некаторым бундаўцам выконваць канспіратыўную працу на карысць беларускай кампартыі. Да таго ж кіраўнікі Бунда вялі з КП(б)Б тонкую гульню, гаворачы пра сумеснае ажыццяўленне планаў саветызацыі Польшчы, намерваліся выкарыстоўваць арганізацыйныя і фінансавыя магчымасці кампартыі Беларусі, жадалі ажыццяўляць у Польшчы самастойную палітычную лінію, звярталіся да кіраўніцтва БССР з просьбай выдачы пропускаў праз

дэмаркацыйную лінію [14, арк. 7, 8]. Паміж КП(б)Б і Бундам ішлі перамовы аб супрацоўніцтве на тэрыторыі Польшчы, у прыватнасці, на пасяджэнні Замежнага бюро ЦК КП(б)Б 9 красавіка 1921 г. было прынята рашэнне «дамовіцца з Бундам адносна высылкі ў Польшчу накіроўваемых імі людзей, да атрымання вынікаў перагавораў пакінуць пытанне аб высылцы бундаўцаў адкрытым». На гэтым жа пасяджэнні адносна Яўрэйскай камуністычнай партыі, верагодна з-за яе схілення да сіянізму і намагання дыстанцыянавацца ад нелегальнай рэвалюцыйнай працы, было «пастаноўлена не аказваць ім ніякага садзейнічання ў перапраўцы іх людзей» [14, арк. 3 адв.].

Характэрным быў зварот ЦК Бунда з просьбай «у мэтах умацавання колькасці актыўных партыйных работнікаў камуністаў у шэрагах Бунда у Польшчы» забяспечыць бундаўцаў неабходнымі дакументамі і садзейнічаць пры пераходзе дэмаркацыйнай лініі. Бальшавіцкае кіраўніцтва было зацікаўлена ў наладжванні ўваходжання Бунда ў Камінтэрн, таму адгуквалася на просьбы аб перапраўцы бундаўцаў у Польшчу, напрыклад, Т. Канеля, які «па даручэнні Цэка «Бунда» вязе сакрэтныя дакументы для маючага адбыцца з’езда «Бунда» ў Польшчы ў сувязі з яго ўступленнем у Камінтэрн» [14, арк. 13, 23].

Таму пашыранай з’явай узаемаадносін паміж дзвюма партыямі былі частыя лісты ЦК і абласнога камітэта Бунда ў Польбюро КП(б)Б з адпаведнымі зваротамі. Так, 8 лютага 1921 г. Беларускі абласны камітэт Бунда накіраваў у Цэнтральнае бюро КП(б)Б просьбу падтрымаць т. І. Сукеніка, які камандзіраваўся для падпольнай партыйнай працы ў Польшчу, пры пераходзе дэмаркацыйнай лініі і забяспечыць яго адпаведнымі дабротамі і сродкамі. 22 сакавіка 1921 г. ЦК Бунда звярнуўся ў Польбюро з просьбай аказаць садзейнічанне пры пераходзе праз мяжу Г. Штука-Беккерскунсту і П. Мінцу, выезд якіх «з’яўляецца тэрміновай неабходнасцю з-за таго, што ў бліжэйшы час адбудзецца з’езд Бунда ў Польшчы». На функцыянераў з Польбюро канечне ж рабіла адпаведнае ўражанне тое, што дадзеныя бундаўцы накіраваны ў Польшчу «для адказнай партыйнай работы сярод яўрэйскіх рабочых». 9 красавіка 1921 г. Польбюро атрымала паведамленне пра тое, што І. Фінк і П. Разенблюм камандзіруюцца ў Польшчу для нелегальнай партыйнай работы і просьбу адправіць «у першую чаргу і забяспечыць іх дакументамі і грашыма». Такога кшталту звароты тычыліся перапраўкі ў Польшчу Х. Дваржэцкага, З. Кругляка, Л. Сталярчыка, Ферэра і іншых. Мелі месцы звароты, у якіх выстаўляліся цэлыя спісы па 10, 11, 16 чалавек бундаўцаў, якіх трэба было пераправіць праз мяжу [14, арк. 15–19].

Аднак спадзяванні на шчырае супрацоўніцтва з Бундам не апраўдвалі сябе, гэтая партыя ў асноўным стаяла на пазіцыях легальнай парламенцкай дзейнасці. Да таго ж, левае крыло Бунда ў 1922 г. выдзелілася ў самастойную арганізацыю – Камбунд, які арыентаваўся на Варшаву і ў 1923 г. уліўся ў КПП. Таму не дзіўна, што яшчэ вясной 1921 г. з Заходняй Беларусі па канспіратыўных каналах ад асоб, якія былі ўпаўнаважаны праводзіць наладжванне камуністычнай працы, у Мінск паступалі просьбы ад асцярожным стаўленні да бундаўцаў, якія перасылаюцца ў Заходнюю Беларусь. У прыватнасці, даклад і апытанне ў пачатку мая 1921 г. Косавай – Эстэр (верагодна, Р. Д. Вольф. – А. С.) выявіла фактычную адсутнасць камуністычнай ааргнізацыі ў Брэсце («ніякага ўплыву на масы няма з-за адсутнасці арганізацыі»). Да таго ж Косава-Эстэр перадала настойлівую просьбу «таварышаў» з Беластока і Брэста «не палягчаць прыезд у Польшчу розных бундаўцаў, хаця б і левіцы, бо пасля іх прыезду на месца яны становяцца крайнімі правымі бундаўцамі і істотна вельмі тармозяць камуністычную працу і шкодзяць ёй». Іншая невядомая асоба ў сваёй аналітычнай справаздачы аб становішчы на Берасцейшчне перадавала аналагічную просьбу: «Таварышы просяць не садзейнічаць праездут за кардон бундаўцаў і паалей-цыяністаў, як элемента, шкоднага для працы» [15, арк. 25].

Тым не меней, пэўныя падставы для ўзаемадзеяння паміж партыямі на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі ўсё ж такі закладзены, прыклады супрацоўніцтва паміж камуністамі і бундаўцамі пацвярджаюцца архіўнымі дакументамі. У прыватнасці, некаторыя з выкрытых паліцыяй камуністаў, паводле аператыўна выяўленай інфармацыі, мелі шчыльныя кантакты з бундаўскімі арганізацыямі [16, с. 113; 17, арк. 1, 30–31, 37; 18, арк. 14, 18].

Такім чынам, арганізатары камуністычнага падполля ў Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гадоў былі зацікаўлена ў пашырэнні свайго ўплыву за кошт уцягнення ў яго шэрагі яўрэяў, выкарыстоўваючы арганізацыйныя магчымасці Бунда, прадстаўнікі якога актыўна выказвалі жаданне перабрацца ў Заходнюю Беларусь і ўзмацніць сваю легальную прысутнасць у грамадска-палітычным жыцці Польшчы. Супарцоўніцтва паміж камуністамі і бундаўцамі было ўзаемна выгадным. Мясцовыя ячэйкі легальнай арганізацыі Бунд служылі своеасаблівым прыкрыццём для правядзення камуністычных акцый, магчыма атрымліваючы некаторае фінансаванне з савецкага боку. Для самога Бунда гэта было небяспечным, бо наводзіла падазрэнне ў антыдзяржаўнай дзейнасці і магло стаць падставай для спынення

дзейнасці партыі. Відавочна, камуністы Заходняй Беларусі не баяліся падставіць Бунд пад паліцэйскія рэпрэсіі, якія маглі б прывесці да ажыўлення антыдзяржаўнай дзейнасці ў Польшчы, што было на руку бальшавіцка-камінтэрнаўскаму кіраўніцтву. Аднак гэтае супрацоўніцтва да сярэдзіны 1920-х гадоў было скасавана па прычыне ідэйна-палітычных разыходжанняў, якія, акрамя іншага, узмацняліся ўсталяваннем у СССР аднапартыйнай сістэмы.

### Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1 Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2012. – 288 с.

2 Палуян, У. А. Бунд у Заходняй Беларусі / У. А. Палуян. – Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 2. Беліцк – Гімн / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелЭН. – С. 131.

3 Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваньнем Польшчы / М. Лучанін. – Менск : Бел. дзярж. выд., 1926. – 56 с.

4 Западная Белоруссия. Сб. статей. Кн. 1. – Минск : Бел. гос. изд-во, 1927. – 211 с.

5 Тарашкевіч, Б. Заходняя Беларусь – плацдарм імперыялістычнай інтэрвенцыі / Б. Тарашкевіч. – Минск : БАН. Камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі, 1931. – 20 с.

6 Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине / Белорус. акад. наук, Комис. по изучению Зап. Белоруссии; под ред. С. Скульского. – Минск : Беларус. Акад. наук, 1935. – 335 с.

7 Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко, Н. С. Орехво, Т. И. Притыцкая и др.; под ред. А. Н. Мацко, В. Е. Самутина. – Минск : Беларусь, 1966. – 403 с.

8 Полуян, В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В. А. Полуян. – Минск : Наука и техника, 1978. – 359 с.

9 Румак, А. А. Профсоюзы трудящихся Западной Белоруссии в революционно-демократическом движении, 1926–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.01 / А. А. Румак ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1994. – 22 с.

10 Сямёнчык, М.Б. Рабочы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / М. Б. Сямёнчык ; НАН Беларусі. Ін-т гісторыі. – Мінск, 2000. – 16 с.

11 Мощук, А. В. Деятельность Бунда на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А. В. Мощук ; НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2008. – 22 с.

12 Стецкевич, П. Т. Деятельность еврейских политических партий и организаций на территории Западной Беларуси (1918–1926 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / П. Т. Стецкевич ; НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2008. – 23 с.
13 Щука, О. Л. Общественно-политическая деятельность еврейских партий и организаций в Западной Беларуси (1926–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / О. Л. Щука. – Минск, 2015. – 25 с.
14 Нацянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 13. Переписка секретного отдела Центрального Бюро КП(б) Белоруссии с ЦК Бунда о направлении членов партии на подпольную работу, о разрешении на выезд в Польшу и переход госграницы и по др. вопросам (1921 г).
15 НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 2. – Спр. 12. Переписка секретного отдела Центрального Бюро КП(б) Белоруссии с (уполномоченным отдела в Бресте) о положении в Брестской организации КП(б)Б (17.02.–17.07.1921 г.).
16 Брест в 1919–1939 гг. : документы и материалы / сост.: А. Г. Карапузова [и др.] ; гл. ред. Е. С. Розенблат. – Брест : Альтернатива, 2009. – 308 с.
17 Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДзАБВ). – Ф. 92. – Воп. 1. – Спр. 108. Следственное дело на граждан, обвиненных в коммунистической деятельности.
18 ДзАБВ. – Ф. 92. – Воп. 1. – Спр. 109. Следственное дело на граждан, обвиненных в коммунистической деятельности.

УДК 930.2:94:323.11(=162.1)(476) «192/193»

**В. Н. СИДОРЕНКО**
(Гомель, УО «Гомельский государственный
университет имени Ф. Скорины»)

## ОСОБЕННОСТИ ИЗУЧЕНИЯ И ПУБЛИКАЦИИ АРХИВНЫХ ДОКУМЕНТОВ ПО ИСТОРИИ ПОЛЯКОВ БССР (1920–1930-е ГОДЫ)

*Статья посвящена особенностям публикации архивных документов по истории польского населения БССР. В ней рассмотрены археографические достоинства и недостатки различных сборников материалов, опубликованных во второй четверти XX – начале XXI вв. В статье отмечены особенности изучения опубликованных материалов.*

Публикация и изучение документальных памятников, отражающих историю польского населения в БССР началась ещё во второй четверти XX века. В межвоенный период появились работы, в которых были отражены различные стороны жизни польского населения БССР, но прежде всего общественно-политический аспект. Эти работы содержат богатый фактографический материал, в них публиковались различные источники (как документальные, так и повествовательные). В настоящее время работы 1920–1930-х гг. используются не столько в качестве историографических исследований, сколько в качестве историографических источников.

Первые работы о жизни поляков в БССР появились ещё в советский период. В 1927 г. в Минске на польском языке была издана работа Станислава Гельтмана об участии рабочих-поляков в революционных событиях 1917 г. [1]. Станислав Гельтман был видной политической фигурой среди лидеров комунистического движения поляков на территории Беларуси в период Советско-польской войны и первых лет советского строительства. В работе содержатся сведения о политической жизни в Минске в 1917–1918 гг., указаны политические группировки, в которых участвовали поляки, даны подробные характеристики деятелей коммунистического движения (поляков) на территории Беларуси. В брошюру включено Приложение из 28 документов, среди которых статьи из польскоязычной газеты «Polska Prawda», выходившей в Минске в 1917–1918 гг., впоследствии преобразованной в печатный орган польского бюро ЦК КП(б)Б БССР «Orka». Ценность этой работы заключается в том, что её автор сам был в центре событий показанного периода. Она может быть отнесена к группе историографических источников. В 1928 г. из министерства иностранных дел Польши в Генеральное консульство в Минске пришел запрос о приобретении брошюры.

В 1929 г. в Москве была опубликована работа Владислава Тенгоборского о жизни поляков в Советском Союзе. Он приводит сведения об их происхождении, степени участия в Октябрьской революции и социалистическом строительстве [2]. В работу включён статистический материал о количестве польского населения в СССР, его размещении, социальном составе, уровне образования. Тогда же появилась брошюра С. Борского о польскоязычной периодической печати в СССР, материалы в которой характеризовали, в том числе и те периодические издания, которые выходили в БССР [3] . Указанные авторы занимали различные должности в советских и партийных организациях, осуществлявших проведение национальной политики в отношении

польского населения БССР и СССР. Их работы богаты фактическим материалом, но уровень обобщения в них невысокий.

В 1930–1950-е годы в советской историографии проблемам источников по истории поляков в БССР и СССР не уделялось большого внимания. В опубликованных сборниках документов и хрестоматиях отсутствуют даже упоминания и польском населении в БССР в 1920–1930-х гг. Только в конце 1950-х гг. была опубликована дополненная стенограмма публичной лекции, прочитанной М. П. Георгадзе (секретарь Президиума Верховного Совета Союза ССР) в Доме Союзов в Москве [4]. В ней представлен обзор развития национальных отношений в СССР. Большая часть работы посвящена показу марксистско-ленинского пути решения национального вопроса. Автор указывает, что в СССР трудящимся всех национальностей представлены права национально-культурной автономии в местах наиболее компактного проживания, многие смогли создать собственные государственные образования. Автор ставит в заслугу партии преодоление отсталого буржуазного понимания сути нации, подчёркивает, что в СССР формируется социалистическая нация, единый советский народ. Это в свою очередь помогает понять причину утихания интереса в советской исторической науке к «национальной проблематике». Работа построена на марксистско-ленинских позициях, содержит скудный фактический материал. Но при всей ограниченности данной работы, автор называет основные этапы осуществления национальной политики в СССР, формы её реализации, некоторые итоги, в том числе и в БССР.

Следующая работа, затрагивавшая проблемы жизни поляков в БССР, вышла только в 1967 г. Ею стала работа А. Ф. Хацкевича «Польские интернационалисты за власть советов в Белоруссии» [5]. Автор характеризует состояние изученности некоторых проблем в отечественной историографии: «Глубокое научное изучение истории участия трудящихся зарубежных государств в Октябрьской революции и гражданской войне в нашей стране по существу не велось. Только в 1950-х гг. эта проблема привлекла внимание историков». Основой работы А. Ф. Хацкевича выступили брошюры Ст. И. Гельтмана и В. Тенгоборского, что отмечено самим автором во вступительной части. Большую часть содержания работы составляют сведения о коммунистах-поляках, участвовавших в Октябрьской революции, польских революционных батальонах и советско-польской войне. Приводятся сведения о Ф.Э. Дзержинском, Б. Веселовском, Ф. Коне, Ю. Мархлевском, И. Уиншлихте, В. Богуцком, А. Кочаровском (Славинском), С. Пшедецкой и др. Автор приводит информацию о создания

польского бюро при ЦК РКП(б). Раздел о деятельности в Минске газеты «Polska Prawda» содержательно заимствован из работы Станислава Гельтмана. Достоинством работы А. Ф. Хацкевича является попытка актуализировать проблемы истории одного из национальных меньшинств (поляков) в контексте событий 1917 г., 1920–1921 гг.

Большинство современных исследователей связывают актуализацию проблемы истории польского населения БССР 1920–1930-х гг. с именем Миколая Иванова, польского историка с белорусскими корнями, и относят её к началу 1990-х гг. [6]. Однако, несколько серьёзных работ М. Иванова появилось ещё в 1980-х гг. Он начал исследования с изучения демографической характеристики польского населения в СССР, обозначил основные направления политики советской власти в отношении поляков в межвоенный период, несколько статей посвятил польскому автономному району им. Мархлевского в Украине. В 1990-е годы его внимание сконцентрировалось на проблеме репрессивной составляющей в политике советской власти в отношении польского населения в БССР и СССР в целом. Предложенная им концепция, согласно которой поляки первыми из народов СССР попали в жернова тоталитарной машины, подверглись репрессиям по национальному признаку, долгое время господствовала в польской и белорусской историографии. Его исследования содержат богатый архивный материал, который стал доступен на рубеже XX–XXI вв.

Определённый вклад в изучение истории польского населения в БССР внёс Роман Дзвонковский [7-8]. Предметом его исследований является положение католического костёла и католиков в БССР и СССР в 1920–1930-х гг. Опираясь на многочисленные архивные материалы, в том числе архивы Ватикана, Р. Дзвонковский прослеживает взаимосвязь католического вероисповедания и национального самосознания польского населения БССР. Именно вероисповедание, по мнению Р. Дзвонковского, являлось решающим фактором национального самоопределения для поляков, проживавших за пределами этнических польских территорий. Им составлен мартиролог католических священнослужителей, пострадавших в период гонений на церковь. Большая часть его работ содержит приложения. В них автор публикует, обнаруженные в архивах документы (наиболее важные с его точки зрения) по истории католического костёла и польского населения в 1920–1930-х гг.

В конце 1980 – начале 1990-х гг. у белорусских историков появилась возможность существенно расширить проблемное поле своих исследований. Обращение к истории национальных меньшинств началось

с обсуждения на научно-теоретических конференциях положения различных этнических групп на территории Беларуси в межвоенный период. Было обращено внимание на то, что кроме титульного белорусского этноса в стане проживали: евреи, поляки, украинцы, русские, татары, литовцы, немцы, латыши, цыгане, сирийцы-айсоры и другие народы.

Первые работы белорусских исследователей о положении польского населения в 1920–1930-х гг. носили региональный характер, т. е. отражали положение поляков Гомельщины, Могилёвщины. Роли религии, образования в жизни поляков Могилёвщины посвящены работы И. Пушкина В монографии «Нацыянальныя меншасці БССР ў грамадска-палітычным і культурным жыцці. 20-я годы XX ст.», вышедшей в 2004 г. показана роль еврейского, польского, литовского и латышского населения БССР в общественно-политической и культурной жизни в 1920-е гг. [9]. Работа опирается на широкую источниковую базу, обобщает предыдущий опыт исследований историка. Автор осмысляет причины изменения, а впоследствии и сворачивания национальной политики в БССР и СССР.

Среди российских историков, занимающихся проблемами взаимоотношений советского государства и польского населения, необходимо отметить С. М. Стецкевич, П. И. Калениченко, И. И. Белякевич, И. И. Костюшко. Российские историки, кроме вопросов советско-польских отношений, обращаются к теме этносоциальной ситуации в западной части СССР в межвоенный период. С этой точки зрения рассматривается государственно-политическое размежевание 1918–1921 гг. В 2005 г. вышла работа И. И. Костюшко, в которой он показал особенности изменения национальной политики советского государства в отношении поляков в зависимости от советско-польских отношений [10]. Российские исследователи стремятся не обходить острые моменты в проблемах советско-польских взаимоотношений. В преломлении этой темы затрагиваются некоторые аспекты положения поляков в различных регионах СССР [11].

Архивные материалы для исследователей, занимающихся проблемами истории национальных меньшинств, играют огромное значение и представляют наибольшую ценность. Из показанного выше очевидно, что как белорусские, так и российские и польские исследователи часто стараются включить в свои работы в качестве Приложения архивные материалы. Такие дополнения делают их монографии ценными в том числе с точки зрения источниковедческого исследования проблем национальных меньшинств в БССР.

Значимую часть источниковой базы по проблеме государственной политики в отношении польского населения в БССР в межвоенный период составляют документы, опубликованные в сборниках, вышедших в первой четверти XX – начале XXI вв. Законодательные акты, документы высших партийных и государственных органов власти активно публиковались в 1920–1930-х гг. в издании «Собрание Узаконений и Распоряжений рабоче-крестьянского правительства БССР» [12–13]. Выступления и доклады лидеров советской власти и коммунистической партии, в которых раскрывалась сущность проводимой национальной политики, её цели и содержание опубликованы в стенографических отчётах пленумов, съездов РКП(б) и КПБ(б).

В 1920-е гг. публикации источников осуществлялись не только профессиональными историками, но и советскими учреждениями: комиссиями, комиссариатами, бюро. Многие из таких публикаций составлялись для практического использования советскими и партийными работниками. «Шесть лет национальной политики Советской власти и Наркомнац. 1917–1923 гг. (вместо отчёта)» [14], «Пастановы і рэзалюцыі УсеКП(б)Б і КП(б)Б па нацыянальным пытанні» [15], «Восьмы Усебеларусі Зьезд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (Стэнаграфічная справаздача)» [16], «Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Часть 2-я. Работа среди национальных меньшинств» [17], «Асноўныя вынікі работы ўраду БССР. Да перавыбараў Светаў. 1928–1929» [18], «Два гады нацыянальнай работы ў БССР. (Збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальным пытанні)» [19]. Опубликованные в этих сборниках материалы, являются актуальными, т.к. их публикация происходила как раз в момент осуществления и проведения национальной политики, когда принимались важные решения в отношении польской этнической группы БССР. Уровень археографической подготовки названных сборников невелик, т. к. они публиковались для практического, а не научного использования. Однако, стоит отметить, что эти сборники хорошо известны большинству современных исследователей и втянуты в научный оборот.

В 1960–1980-х гг. в белорусском источниковедении господствовал классический подход, в котором главными были позитивистские задачи, т. е. сбор и установление исторических фактов. Отсюда и специфика подбора архивных источников для публикации в сборниках и хрестоматиях. Перед белорусской гуманитарной наукой стояла задача не проанализировать и осмыслить источник, а с его помощью что-либо доказать. Советская археография, безусловно, испытывала на себе

вненаучное влияние (идеологическое, политическое), однако, важной её заслугой является поиск и публикация новых архивных документов. Как правило, публиковались только те документы, которые не противоречили основной исторической парадигме и методологии. Это обусловило то, что многие виды документов оставались без внимания исследователей.

В 1964 г. появилось издание «Документы обличают. Реакционная роль религии и церкви на территории Белоруссии» [20]. Составители в предисловии пояснили, что «сборник является первой публикацией документов о реакционной сущности религиозных организаций и росте атеизма населения Белоруссии. Хронологические рамки сборника ограничены 1883–1962 гг». Сборник составлен тенденциозно. Отсутствуют материалы, позволяющие судить о месте костёла в морально-нравственном, духовном развитии польской этнической группы межвоенной Беларуси. Научная ценность этого сборника невелика, это отмечают многие исследователи, он ориентирован не на научное историческое познание прошлого, а скорее на нужды пропаганды 1960-х гг., когда был издан этот сборник.

В 1970–1980-х гг. появились сборники, которые условно можно объединить в один блок «социально-экономическое развитие 1920–1930-х гг.»: «Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1929–1932)» [21], «Подготовка сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1927 – ноябрь 1929)» [22], «Кооперативно-колхозное строительство в Белорусской ССР (1917–1927)» [23], «Завершение коллективизации сельского хозяйства и организационно-хозяйственное укрепление колхозов БССР (1933 – июнь 1941)» [24]. Обозначенные сборники содержат немногочисленные документы о многонациональной жизни, положении национальных меньшинств, их месте в социально-экономических процессах в БССР в межвоенное время. Например, в сборнике «Кооперативно-колхозное строительство в БССР» помещены 2 документа, в которых содержатся сведения о поляках. Несмотря на утверждение составителей сборника, что «организаторами первых коллективных хозяйств были главным образом передовая, сознательная часть деревенской бедноты, батрачества. Нередко инициаторами и организаторами колхозов были рабочие, служащие, демобилизованные красноармейцы, вернувшиеся с фронта… В колхозном строительстве участвовали трудящиеся всех национальностей населяющих республику» [23, с. 8]. При этом упоминание о национальном составе колхозов имеется всего в двух отчётах. Нет ни одного

документа об отношении поляков к организации и деятельности колхозов. Это тем более странно, что большинство поляков были сельскими жителями.

В 1999 г. вышел совместный труд В. П. Пичукова и М. И. Старовойтова, посвящённый положению поляков, евреев, литовцев, русских и цыган на Гомельщине в межвоенный период [25]. Особенность работы состоит в том, что кроме аналитической части авторы поместили богатый документальный материал. Опубликованные архивные материалы впервые вводились в научный оборот. Авторы подчёркивают тот факт, что регион некоторое время являлся частью РСФСР, что во многом обуславливало осуществление национальной политики на Гомельщине.

В 2009 г. В. П. Пичуков совместно с А. Д. Лебедевым и Сл. Лясковским опубликовали работу «Костёл и власть на Гомельщине. (20–30-е годы XX в.)» [26]. В работе сосредоточены архивные материалы, представляющие политику советской власти в отношении католического костёла в БССР 20–30 гг. XX в. Значительная часть поляков исповедовали католичество, поэтому помещённые в данной работе материалы представляют определённый интерес. Работа снабжена аналитической частью, в которой проанализирована эволюция государственной политики в отношении костёла и верующих в БССР в 1920–1930-х гг.

В 2004 г. был опубликован сборник «Польские военнопленные в РСФСР, БССР и УССР (1919–1922 годы» [27]. Археографический уровень данного сборника весьма велик. Он отличается подробной характеристикой внешнего облика публикуемых документов, их сохранностью и пр. В контексте истории польского населения БССР значимыми представляются документы, отражающие материальное положение и быт польских военнопленных, отчёты политинструкторов И. А. Витковского, В. И. Квятковского И. Врублевского, П. Пяско, письма секретаря Польбюро ЦК РКП(Б) С. Гельтмана (Док. № 83, 154, 159, 166, 171, 172) [27]. Важными представляются и сами авторы документов, т.к. многие из них в 1920–1930-е гг. занимали должности секретарей польбюро, инструкторов польской культуры, начальников различных отделов и секций окружкомов КПБ(б). Эта бюрократия раннего советского периода первый опыт приобретала в должностях политработников лагерей польских военнопленных, что отразилось на стиле их руководства в последующий период.

Таким образом, особенностью сборников документов межвоенного периода, посвящённых осуществлению национальной политики

в БССР, является их практикоориентированный характер. Их публикация не преследовала научные цели, что обуславливает невысокий уровень археографической обработки документальных памятников. В 1940–1960-х гг. наблюдается резкое сокращение публикации материалов по истории национальных меньшинств, что связано с актуализацией других исторических проблем в гуманитарной науке. Заметно возрастает интерес исследователей к истории польского населения БССР в конце 1980-х гг. Это привело к появлению значительного количества публикаций архивных материалов, подготовленных самими архивными учреждениями, отдельными историками и коллективами авторов.

**Список использованных источников и литературы**


1 Heltman, S. Robotnik polski w Rewolucji Październikowej na Białorusi / Stefan Heltman. – Mińsk, 1927. – 136 s. (Centralna Komisja CKW BSSR ku odznaczeniu 10-ej rocznicy Rewolucyi Październikowej)
2 Tęgoborski, Wł. Połacy Związku Radzieckiego, ich pochodzenie, udzial w Rewolucji Październikowej i w budownictwie socjalistycznym / Wł. Tęgoborski. – Moskwa, 1929. – 107 s.
3 Borski, S. Prasa polska w ZSSR. / S. Borski. – Moskwa, 1929.
4 Георгадзе, М. П. Разрешение национального вопроса в СССР / М. П. Георгадзе. – М. : «Знание», 1958. –62 с.
5 Хацкевич, А. Ф. Польские интернационалисты в борьбе за власть Советов в Белоруссии/ А. Ф. Хацкевич. – Минск : Наука и техника, 1967. – 148 с.
6 Iwanow, M. Pierwszy naród ukarany. Polacy w związku radzieckim 1921–1939. / M. Iwanow – Warszawa – Wroclaw, 1991.
7 Dzwonkowski, Roman Sac. Kościoł katolicki w ZSRR 1917–1939. Zarys historii. / Roman Dzwonkowski Sac. – Lublin : TNKUL, 1997.
8 Dzwonkowski, Roman. Postawy katolików obrządku łacińskiego na Białorusi wobiec języka polskiego/ Roman Dzwonkowski, Oleg Gorbaniuk, Julia Gorbaniuk. – Lublin – TNKUL. – 2004. –182 c.
9 Пушкін, Ігар. Нацыянальныя меншасці БССР ў грамадска-палітычным і культурным жыцці. 20-я годы XX ст. – Магілёу, 2004.
10 Костюшко, И. И. Из истории советско-польских отношений. Польское бюро ЦК РКП(б), 1920–1921 гг. / И. И. Костюшко. – М. : Институт славяноведения РАН, 2005. – 143 с.
11 Судьбы национальных меньшинств на Смоленщине, 1918–1938 гг.: Документы и материалы / Арх. упр. Администрации Смолен. обл., Гос. арх. Смолен. обл.; [сост. : Г. Н. Мозгунова и др.; редкол.: Д. И. Будаев (отв. ред.) и др.]. – Смоленск, 1994. – 319 с
12 Постановление 2-й Сессии ЦИК Советов БССР 6 созыва от 15 июля 1924 г. // Собрание Узаконений и Распоряжений рабоче-крестьянского

правительства БССР. – № 11 (6 авг.) – 1924 – Минск : Главлитбел. – С. 324.
13 Постановление 2-ой сессии ЦИК БССР 27 марта 1926 г. 6 созыва «О практических мероприятиях по проведению национальной политики» // Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского Правительства БССР. – № 23–12 июля 1926 г. Отд.1 – Минск : типлит БГИ, 1926 г. – С. 325.
14 Шесть лет национальной политики Советской власти и Наркомнац. 1917–1923 гг. (вместо отчёта). – М. : Литература 1924. – 228 с.
15 Пастановы і рэзалюцыі УсеКП(б)Б і КП(б)Б па нацыянальным пытанні / [тэкст] – Менск, Выданне ЦВК БССР, 1926.
16 Восьмы Усебеларускі Зьезд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (Стэнаграфічная справаздача)/. – Менск : Выданне ЦВК БССР, 1927. – 486 с.
17 Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Часть 2-я. Работа среди национальных меньшинств. – Минск, 1928.
18 Асноўныя вынікі работы ураду БССР. Да перавыбараў Саветаў 1928–1929. – Мінск : Выданне ЦВК БССР, 1928.
19 Два гады нацыянальнай работы ў БССР. (Збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальным пытанні). – Мінск : Выданне ЦВК БССР, 1929.
20 Документы обличают. Реакционная роль религии и церкви на территории Белоруссии – Минск : Беларусь, 1964. – 272 с.
21 Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1929–1932) / под ред.: А. И. Азарова [и др.]. – Минск, 1973. – 422 с.
22 Подготовка сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1927 – ноябрь 1929) – Минск, 1976.
23 Кооперативно-колхозное строительство в Белорусской ССР (1917–1927). – Минск, 1980.
24 Завершение коллективизации сельского хозяйства и организационно-хозяйственное укрепление колхозов БССР (1933 – июнь 1941) ; ред кол. М. П. Костюк, В. В. Лашкевич, М. Е. Стрельцов. – Минск : Беларусь – 1985. – 284 с.
25 Пичуков, В. П. Гомельщина многонациональная (20–30-е годы XX века) / В. П. Пичуков, М. И. Старовойтов. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 1999. – Вып. 1.
26 Лебедев, А. Костёл и власть на Гомельщине (20–30-е годы XX в.) / А. Лебедев, В. П. Пичуков, кс. Сл. Лясковский. – Варшава–Люблин–Гомель : IESW, – 2009. – 459 с.
27 Польские военнопленные в РСФСР, БССР и УССР (1919–1922 годы) / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения. – М. : Ин-т славяноведения, 2004. – С. 403.

УДК 940.5(476)

**А. Г. ТРУБЧЫК**
(Мінск, ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі»)

# БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ НА ПАЧАТКОВЫМ ЭТАПЕ ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ (ЛЮТЫ – ВЕРАСЕНЬ 1919 ГОДА)

*У артыкуле прааналізаваны стратэгічныя планы і асноўныя наступальныя аперацыі польскіх войскаў у лютым–верасні 1919 г., у выніку якіх былі захоплены Віленшчына, Гродзеншчына, Брэстчына і Міншчына. На падставе архіўных крыніц прыведзены колькасныя даныя аб вайсковых стратах з абодвух бакоў, фізічны стан войскаў, акрэслена лінія перамяшчэння фронту.*

У сучаснай польскай гістарыяграфіі пачаткам баявых дзеянняў прынята лічыць з 14 лютага 1919 г., аднак у гэты час вайна не была афіцыйна абвешчанай ні адным з бакоў. З сакрэтных данясенняў III аддзела польскага Галоўнага камандавання вынікае, што менавіта 14 лютага 1919 г. атрад капітана Пятра Мініцкага штурмам авалодаў Бярозай − Картузскай і вымусіў адступіць на ўсход гарнізон Чырвонай Арміі. Асобныя польскія групоўкі сутыкнуліся з чырвонаармейцамі ў раене м. Масты каля р. Неман. Аддзелы Літоўска − Беларускай дывізіі ўвайшлі ў адкрытыя баявыя дзеянні з 3-й брыгадай стральцоў Заходняй дывізіі. Такім чынам у барацьбу былі ўцягнуты рэгулярныя войскі абодвух бакоў.

Галоўнае камандаванне Чырвонай Арміі выдала дырэктыву ад 22 лютага 1919 г., у якой былі вызначаны задачы на Заходнім фронце. Для Заходняй арміі сфармулявана была наступная задача: выйсці на лінію Шаўлі – Велькамір – Ліда – Слонім − р. Шчара − канал Агінскага – Пінск і авангардам ахапіць рубеж Коўна – Гродна – Ваўкавыск − Брэст-Літоўскі. Ю. Пілсудскі лічыў, што для наступлення польскі бок не мае дастатковых сіл, таму 21 лютага 1919 г. выдаў інструкцыю, у якой вызначалася толькі абарончая тактыка. Аднак на практыцы з польскага боку пачалося актыўнае наступленне дзвюма групамі войскаў пад камандаваннем генералаў В. Івашкевіча і А. Лістоўскага. Абодва генералы ўпэўнівалі Ю. Пілсудскага ў тым, што маюць усе магчымасці праводзіць сумесныя баявыя аперацыі і збіраліся працягваць наступленне нават без згоды Галоўнакамандуючага.

Згодна з ацэнкай польскага даследчыка Леха Вышчэльскага, баявыя дзеянні ў лютым 1919 г. праводзіліся дзвюма ізаляванымі адна ад адной групамі войскаў, якія мелі вельмі слабы колькасны склад, не маглі тактычна ўзаемадзейнічаць і карыстацца падтрымкай вышэйшага камандавання [1].

Войскі генерала Івашкевіча перайшлі да наступлення 28 лютага 1919 г. у кірунку р. Шчара. Супраціўленне з боку савецкіх войскаў было аказана толькі ў раене Слоніма, а таксама Быцені − Косава. Уноч з 1 на 2 сакавіка на польскі гарнізон у Быцені напаў савецкі гарнізон, які складаўся з 40 пехацінцаў і 30 кавалерыстаў. Польскі бок меў меншы колькасны склад, таму са значнымі стратамі вымушаны быў адступіць на 2 км. Барацьба за Быцень працягвалася да 6 сакавіка, савецкія войскі адступілі да берагоў Шчары [2, s. 147]. Група генерала Лістоўскага з 27 лютага 1919 г. пачала наступленне на Пінск. Драгічын быў заняты 27 лютага, 5 сакавіка − Пінск. Баі за Пінск цягнуліся больш за 5 гадзін ва ўмовах моцнага дажджу. У рукі палякаў трапілі чыгуначны састаў (200 вагонаў і лакаматыў), 2 кулямёты, акрамя таго, узята 50 палонных. Згодна з данясеннем генерала Лістоўскага, страты палякаў былі нязначныя: 3 забітых і 10 раненых. Разам з тым было налічана 150 трупаў «праціўніка» [3].

У далейшых планах Ю. Пілсудскага было ўсталяванне кантролю над Гродна, з якога адступілі немцы. Гэты горад меў важнае значэнне для падрыхтоўкі будучага наступлення на Вільна. Віленскую аперацыю Ю. Пілсудскі меркаваў распачаць праз тэрыторыю, якая знаходзілася паміж Лідай і Мастамі на паўночным беразе Нёмана. Менавіта там знаходзілася адзіная чыгуначная лінія, якая дазваляла сканцэнтраваць і забяспечыць войскі. Задачай генерала Лістоўскага было наступленне на Баранавічы і ўсталяванне кантролю на чыгунцы Баранавічы − Ліда, а таксама заняцце Лунінца. Падрыхтоўку да наступальнай аперацыі неабходна было завяршыць да 8 красавіка 1919 г.

Першай да выканання Віленскай аперацыі прыступіла група генерала А. Макрэцкага. Наступленне на Навагрудак і Баранавічы пачалося 15 красавіка. Мэтай Ю. Пілсудскага было не столькі заняць гэтыя гарады, колькі сцягнуць сюды моцныя сілы праціўніка, забяспечыўшы тым самым хуткі марш на Вільна. Вечарам 15 красавіка наступленне на Баранавічы было спынена моцным супраціўленнем атрадаў чырвонаармейцаў. Для таго каб працягваць атакі з польскага боку не хапала боепрыпасаў [4].

Наступленне на Ліду пачалося 16 красавіка у 5 гадзін раніцы. З усходу горад акружыла кавалерыя, паралізаваўшы работу чыгункі

па лініі Ліда − Маладзечна. Усю ноч з 16−17 красавіка працягваліся цяжкія баі за горад. Даведаўшыся аб складаным становішчы сваіх войскаў, Пілсудскі загадаў спыніць марш на Вільню і перакінуці частку сіл на Баранавічы і Ліду. Ліда была занята 17 красавіка у 5 гадзін раніцы групоўкай маера Денба − Бернацкага і Сувальскім пяхотным палком. За імі ў горад увайшлі астатнія аддзелы групы генерала Лясоцкага. Ваеннай здабычай сталі танк, некалькі грузавых паяздоў, значная колькасць зброі, боепрыпасаў (30 вагонаў), а таксама 350 ваеннапалонных [5].

У той жа дзень у 10.30 гадзін Пілсудскі выдаў загад аб узнаўленні пахода на Вільню. Кавалерыя палкоўніка Беліны − Празморскага пачала атаку на Вільню 19 красавіка, хутка быў захоплены чыгуначны вакзал, дэзарганізавана работа тэлефоннай і тэлеграфічнай сувязі. Аднак к вечару чырвоныя войскі перайшлі да актыўнай атакі. У польскіх атрадах пачаўся крызіс: нехапала байцоў, зброі, раслі страты, усё больш адчувалася фізічная стомленасць [6]. Пакуль працягваліся баі за Вільню, польскія войскі захапілі Навагрудак (18 красавіка) і Баранавічы (19 красавіка). Баі за Баранавічы працягваліся 5 дзен. Савецкі бок аказваў жорсткае супраціўленне. Дзве ночы працягвалася барацьба на штыках, супраць пехоты былі выкарыстаны польскія танкі «Смелы»і «Пілсудчык». Першымі ў горад прарваліся штурмавы батальен капітана Камероўскага і батальен Віленскага пяхотнага палка.У палон было узята 140 чырвонаармейцаў [7].

У гэты час у Вільні з пераменным поспехам працягваліся вулічныя сутычкі паміж асобным польскім і чырвонаармейскім атрадамі. Поспехі ў Навагрудку і Баранавічах дазволілі значна ўзмацніць польскія войскі. 20 красавіка ў Вільна прыбыла група маёра Стэфана Дэмба-Бернацкага з дзвюма батарэямі палявой артылерыі. Акрамя таго ў Вільні ўжо знаходзіўся легіянальны полк, у яком налічвалася больш за 2 500 штыкоў [8]. Барацьба за горад узнавілася 21 красавіка. К 16 гадзінам атрады Чырвонай Арміі пачалі адступленне з Вільні. Сілы былі вычэрпаны з абодвух бакоў, у палякаў на той момант не было кавалерыі, каб арганізаваць пагоню. Галоўнай задачай з’яўлялася ўтрыманне горада. У Вільна сцягваліся ўсе магчымыя польскія ваенныя сілы, зброя, боепрыпасы, харчаванне. Віленскую аперацыю можна лічыць скончанай не раней 7 мая 1919 г., калі пасля некалькіх няўдалых спробаў вярнуць горад, савецкія войскі адыйшлі ў раён Свянцян, спыніўшы баявыя дзеянні.

Перад ад’ездам з Вільні Ю. Пілсудскі загадаў стварыць Літоўска-Беларускі фронт пад кіраўніцтвам генерала Станіслава Шэптыцкага.

У склад Літоўска-Беларускага фронта ўвайшлі: Віленская група генерала Сміглага-Рыдза, група генерала Ю. Лясоцкага, групы генерала А. Макрэцкага, а таксама Занеманскай групы палкоўніка Ст. Равіча-Дзевульскага. На Палессі па-ранейшаму дзейнічала група генерала Лістоўскага, якая падпарадкоўвалася непасрэдна Галоўнакамандуючаму [9, s. 106].

Польскія войскі увайшлі ў Гродна 27 красавіка 1919 г. У горадзе не было ні нямецкіх, ні савецкіх атрадаў, таму раніцай наступнага дня быў устаноўлены поўны кантроль польскай ваеннай улады [10]. Далейшы накірунак польскага войска быў запланаваны на Маладзечна і Мінск, а таксама на Лунінец. Войскі пад камандаваннем генерала Сміглага-Рыдза былі падзелены на дзве групоўкі. Група Усход капітана Зброўскага кантралявала лінію чыгункі і шашу Вільна − Маладзечна і звязвала групоўкі войск генарала Сміглага-Рыдза з тактычнай групай генерала Лясоцкага, сканцэнтраванай каля Ліды. Група Поўнач падпалкоўніка Карашэвіча-Такашэўскага знаходзілася ўздоўж лініі чыгункі: Вільна − Дзвінск, якая праходзіла праз Свянцяны.

Да сярэдзіны мая польскія войскі кантралявалі значную частку Віленшчыны. Актыўна дзейнічала Палеская група генерала Лістоўскага, якая 30 мая 1919 г. была перайменавана ў Палескі фронт. Войскі генерала Лістоўскага павольна, але паспяхова наступалі на ўсходнім кірунку, што дазволіла да 20 мая выйсці на лініі рэк Стыра і Прыпяць. Да падпісання Версальскага дагавора польскае камандаванне не імкнулася фарсіраваць наступленне на ўсход. Яно аднавілася у канцы чэрвеня 1919 г.

Літоўска-Беларускі фронт атрымаў загад 27 чэрвеня 1919 г. пачаць падрыхтоўку для наступлення на Маладзечна і Вілейку. Былі ўтвораны дзве групоўкі: група генерала Балеслава Роі для наступлення на Маладзечна і, перайменаваная у групу Смаргонь, былая група Усход, якая накіроўвалася на Вілейку. Раніцай 1 ліпеня групоўка Демба-Бернацкага падыйшла да Вілейкі. Палякі пачалі акружэнне з поўначы і праз некалькі гадзін занялі горад. Гэта дало магчымасць перакінуць частку сіл на Маладзечна і захапіць яго 3 ліпеня ў выніку цяжкіх баеў. Пасля працяглай паветранай атакі (бамбардзіроўкі) 7 ліпеня палякі занялі Лунінец. У другой палове ліпеня савецкія войскі некалькі разоў імкнуліся выбіць групоўкі праціўніка з Вілейкі і Маладзечна, але поспеху не мелі. У выніку аперацыі па захопу Вілейкі і Маладзечна палякі здабылі 8 гармат, узялі ў палон 800 чырвонаармейцаў, вялікую колькасць зброі. Чалавечыя страты з савецкага боку былі значныя. Так, згодна з польскімі

аперацыйнымі данясеннямі, былі цалкам знічтожаны 3-я брыгада заходняй дывізіі, 3-я брыгада 17 дывізі [11].

У сувязі з заняццем большай часткі тэрыторыі ЛітБел І. Сталін у тэлеграме ў ЦК РКП(б) і У. Леніну 13 ліпеня 1919 г. паставіў пытанне аб неабходнасці расфарміравання Мінскага савета абароны і ўрада ЛітБел з перадачай грамадзянскай улады губвыканкаму, а ўзброенную абарону ўраду РСФСР. Аргбюро ЦК РКП(б) пагадзілася з ліквідацыяй Мінскага савета абароны і дзяржаўнага апарата ЛітБела. Ліквідацыя ўрада была прызнана несвоечасовай.

Згодна з пастановай ЦК РКП(б) 16 ліпеня 1919 г. на пасяджэнні ЦК КП(б) ЛітБел было прынята рашэнне аб ліквідацыі Савета абароны ЛітБела і перадачы яго функцый адпаведным ваенным органам. Работу СНК часова спыніць, перадаць кіраванне неакупіраваннымі паветамі Мінскаму губрэйкаму, а народных камісараў накіраваць на ваенную працу ў Чырвоную Армію. Урад ЛітБела прыняў пастанову 19 ліпеня 1919 г. аб спыненні сваей дзейнасці. Савет абароны быў скасаваны, а яго функцыі перададзены Рэйваенсавету Заходняга фронту [12, с. 106].

Захоп Маладзечна дало магчымасць польскаму боку заняць выгадныя пазіцыі для наступлення на Мінск. Аднак гэта аперацыя патрабавала ўзмацнення войск Літоўска-Беларускага фронта, што магчыма было зрабіць не раней чым у канцы ліпеня. Нягледзячы на гэта, камандаванне Літоўска-Беларускага фронта запланавала пачатак наступлення на 22 ліпеня 1919 г. Па стану на 15 ліпеня 1919 г. Літоўска-Беларускі фронт налічваў 43 500 чалавек (з іх толькі 19 700 баявых салдат), 56 аддзелаў, 400 куляметаў і 10 самалетаў. Планавалася значнае узмацненне сіламі 8 пяхотнай дывізіі генерала Ст. Макрэцкага і Вялікапольскай групы генерала Д. Канарэўскага [13].

Пакуль ішла падрыхтоўка да Мінскай аперацыі, войскі Палескага фронта генерала Лістоўскага захапілі Лунінец (8 ліпеня) і Давыд-Гарадок (9 ліпеня), выйшлі на лінію Любань − возера Князь і далей на поўнач ад Прыпяці, а на правым фланзе − на поўдзень ад Прыпяці. Слуцк быў заняты 6 жніўня, адначасова сілы былі кінуты на Нясвіж. Значную ролю адыграла кавалерыя, якая 6 жніўня захапіла Нясвіж, Клецк, Мір.

Раніцай 5 жніўня 3 групы польскіх войск пачалі наступальную аперацыю на Мінск. Найбольш моцная група генерала Роі рухалася ўздоўж лініі чыгункі Маладзечна − Мінск. Яна павінна была акружыць Мінск з паўночнага ўсходу і захапіць горад. Групе генерала Лясоцкага адводзілася задача барацьбы з сканцэнтраванымі у мінскім сектары

чырвонаармайскімі атрадамі. Асноўны адпор гэтай групе аказалі байцы і камандзіры 52 стралковай дывізіі, якой камандаваў польскі камуніст Р. Лонгва, а камісарам быў удзельнік польскага рабочага руху А. Славінскі. Праз некалькі гадзін палякі прарвалі лінію абароны савецкіх войскаў і падыйшлі да р. Цна. У 10.45 раніцы штурмавы батальен лейтэнанта А. Ставара ўвайшоў у горад, пачаўшы вулічныя баі. У палон было ўзята некалькі дзесяткаў чырвонаармейцаў, захоплена зброя і боепрыпасы. У 12.30 Мінск быў цалкам заняты польскімі войскамі. Савецкія войскі адступілі на ўсход у накірунку Барысава і Бабруйска. З польскага боку была арганізавана пагоня. Група генерала Лясоцкага 9 жніўня захапіла Койданава і Стоўпцы. У ходзе мінскай аперацыі да гэтага часу палякамі было захоплена 2 880 палонных, 3 танкі, 4 гарматы, 12 лакаматываў, абозы, санітарныя матэрыялы і інш. [14] Пад Смалявічамі 13 жніўня ў польскі палон трапіла больш яшчэ за 300 савецкіх байцоў [15].

З пачатку жніўня пасля ўключэння у склад Літоўска-Беларускага фронта войск Палескага фронту, яго сфера дзеяння была пашырана на Палессе, дзе адну з важнейшых сіл складала 9 пяхотная дывізія. У жніўні − верасні 1919 г. польскія войскі захапілі Бабруйск, Барысаў, Жлобін, Рагачоў і Рэчыцу. Навісла пагроза над Гомелем. У баях за Бабруйск 28 жніўня з савецкага боку былі выкарыстаны танкі і артылерыя. Адступаючы на Жлобін і Рагачоў, чырвонаармейцы спалілі 3 масты праз Бярэзіну, пашкодзілі чыгуначны мост. Палякам дасталіся 500 ваеннапалонных, 2 гарматы, значная колькасць вінтовак. Агульная здабыча Літоўска-Беларускага фронту ў гэты час складала: 50 савецкіх афіцэраў і 8 700 салдат, 24 паравозы, 485 вагонаў, 2 танка, 2 браніраваных аўтамабіля, мноства вінтовак і боепрыпасаў [16].

Пасля таго, як войскі Літоўска-Беларускага фронта занялі лініі Дзвіны, Бярэзіны і Пцічы, генерал Шэпціцкі вырашыў устрымацца на некаторы час ад актыўных наступальных дзеянняў. Аднак ужо 1 верасня Галоўнакамандуючы выдаў загад аб падрыхтоўцы новага наступлення.

Войскі Літоўска-Беларускага фронта былі падзелены на 2 групы пад кіраўніцтвам генералаў Сміглага-Рыдза і Л. Жэлігоўскага. 9-я пяхотная дывізія, якой кіраваў палкоўнік У. Сікорскі, атрымала заданне абароны Палесся. Групоўка палкоўніка Б. Яжвінскага 21 верасня захапіла Полацк, 27 верасня групоўка падпалкоўніка Б. Краўпы пачала наступленне на Лепель.

Польская пяхота пачала атаку на Дзвінск 27 верасня 1919 г. Пасля двух дзен цяжкіх баеў 1-я і 3-я польскія дывізіі захапілі ўсе важнейшыя пункты на паўдневым беразе Дзвіны, знішчылі масты,

узялі ў палон 600 салдат. Палякі страцілі 150 чалавек (разам з раненымі і забітымі, з іх 2 забітых афіцэра) [17].

Галоўнае камандаванне Польскіх войск лічыла, што на беларускім напрамку польскі бок рэалізаваў запланаваныя на 1919 г. стратэгічныя мэты. Беларуска-Літоўскаму фронту быў выдадзены загад 6 кастрычніка аб спыненні баявых дзеянняў і падрыхтоўцы войск да зімоўкі. Аднак ў сувязі з узнаўленнем баеў за Лепель і Полацк, польска-савецкі фронт стабілізаваўся толькі ў канцы кастрычніка 1919 г. Польскае наступленне было спынена на лініі Заходняй Дзвіны, Полацк, Лепель, Барысаў, затым на поўдзень на р. Бярэзіна.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1 Komunikat operacyjny. Litwa i Białoruś, 15.II.1919 // Centralny Archiwum Wojskowy (CAW). – Akta Oddziału III Naczelnego Dowództwa Wojska Polskiego (AO III ND )WP. – Sygn. 301.10.1.
2 Wyszczelski, L. Wojna o Kresy Wschodnije. 1918–1921 / Lech Wzszczelski. – Warszawa : Bellona, 2011. – S. 147.
3 Komunikat operacyjny. Litwa i Białoruś, 7.III.1919 // CAW. –AO III ND WP. – Sygn. 301.10.1.
4 Komunikat operacyjny.Front Litewsko-Białoruski, 15.IV.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.3.
5 Komunikat operacyjny.Front Litewsko-Białoruski, 18.IV.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.3.
6 Komunikat operacyjny.Front Litewsko-Białoruski, 20.IV.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.3.
7 Komunikat operacyjny. Front Litewsko-Białoruski, 20.IV.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.3.
8 Komunikat operacyjny. Front Litewsko-Białoruski, 21.IV.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.3.
9 Krząstek, T. Wojna polsko-rosyjska 1919–1920 / Tadeusz Krzątek. – Warszawa, 1995. – S. 106.
10 Komunikat operacyjny.Front Litewsko-Białoruski, 28.IV.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.3.
11 Komunikat operacyjny. Front Litewsko-Białoruski, 9.VII.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.5.
12 Нарысы гісторыі беларускай дзяржаўнасці / М. П. Касцюк. – Мінск : Беларуская думка, 2008. – С. 106.
13 Komunikat operacyjny. Front Litewsko-Białoruski, 10.VIII.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.5.
14 Komunikat operacyjny. Front Litewsko–Białoruski, 10.VIII.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.5.

15 Komunikat operacyjny.Front Litewsko-Białoruski, 14.VIII.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.5.
16 Komunikat operacyjny.Front Litewsko-Białoruski, 29.VIII.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.5.
17 Komunikat operacyjny.Front Litewsko-Białoruski, 30.IX.1919 // CAW. – AO III ND WP. – Sygn. 301.10.5.

УДК 94:355(476+474.5) «1812»

**С. А. ЧАРОПКА**
(Гомель, УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)

## ЛІТОЎСКАЯ АРМІЯ 1812 ГОДА Ў АСОБАХ

*У артыкуле даследуецца працэс адраджэння арміі ВКЛ падчас франка-расійскай вайны 1812 г. Асноўная ўвага ў артыкуле надаецца постацям афіцэраў літоўскай арміі 1812 г., якія прынялі актыўны ўдзел у адраджэнні войска, фарміраванні яе асноўных падраздзяленняў, паходжанне гэтых людзей, іх папярэдняя баявая кар'ера.*

Падзеі 1812 г. заўсёды прыцягвалі ўвагу прафесійных гісторыкаў і аматараў мінуўшчыны. У савецкія часы нешматлікія беларускія даследчыкі звычайна зыходзілі з агульнарасійскага пункту гледжання на гэтую праблему, звяртаючы ўвагу пераважна на сацыяльна-эканамічныя аспекты вайны. Аднак многія аспекты самой вайны і яе лакальныя перадумовы такія як знішчэнне польска-літоўскай дзяржавы і спробы яе рэанімацыі у розных варыяцыях (Варшаўскае герцагства, План Чартарыйскага, план Агінскага, напалеонаўскае ВКЛ) практычна заставаліся па-за ўвагай [1; 2]. З набыццём незалежнасці Беларусі з'віліся новыя магчымасці да вывучэння тэмы і ўвага айчынных гісторыкаў стала засяроджвацца на ролі жыхароў беларускіх і літоўскіх губерняў у вайне 1812 г., у тым ліку і на тэме стварэння літоўскага войска ў 1812 г. [2–13]. Грунтоўны ўклад у распрацоўку праблематыкі ўнеслі расійскія і польскія гісторыкі [14–24].

Адозва, якую 22 чэрвеня выдаў Напалеон, дзе ён абвясціў аб пачатку «другой польскай вайны не магла пакінуць беларускую шляхту абыякавай [25, с. 14]. Ужо 1 ліпеня была створана Камісія часовага ўрада ВКЛ і фактычна пачаўся працэс аднаўлення літоўскай

дзяржаўнасці. Камісія складалася з сямі камітэтаў, кожны з якіх каардынаваў пэўны від дзейнасці. Адным з іх з’яўляўся Ваенны камітэт, які ўзначаліў генерал Стэфан Грабоўскі, які прайшоў шлях ад харунжага да генерала ў арміі ВКЛ, прыняў удзел змаганні з расійскай агрэсіяй у 1792 г., адзначыўся ў баях пад мірам і Берасцем. У 1794 г. С. Грабоўскі ўзяў актыўны ўдзел у паўстанні пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, менавіта яго атрад вымусіў расійскія войскі пакінуць Вільню, а затым здейсніў адважны паход у Мінскую губернію.

У якасці консулаў у склад камітэта увайшлі кадравыя афіцэры колішняга войска ВКЛ Рамуальд Гедройц, Ксаверы Несялоўскі, Юзаф Ваўжэцкі. 5 ліпеня, падчас уступлення ў Вільню, быў створаны 3 Літоўскі полк уланаў Імператарскай гвардыі [19, с. 481]. Камандзірам быў прызначаны брыгадны генерал Ян Канопка. Малады генерал паходзіў з вёскі Скалодычы каля Слоніма. У 1792 г. ён у званні падпаручніка 2 Украінскай брыгады нарадовай кавалерыі кароннага войска абараняў РП ад расійскай інтэрвенцыі, адзначыўся ў бітве пад Зяленцамі. У званні паручніка знаходзіўся сярод паўстанцаў у 1794 г., быў паранены ў бітве пад Мацяёвіцамі. Пасля падаўлення паўстання працягнуў вайсковую кар’еру ў Францыі. З 1797 г. Я. Канопка ў званні капітана ваяваў у складзе польскіх легіёнаў у Італіі, затым, ужо як маёр удзельнічаў у франка-прускай вайне. За мужнасць у бітве пад Фрыдландам паранены Я. Канопка быў узнагароджаны ордэнам Пачэснага Легіёна асабіста Напалеонам. З 1808 па 1811 г. палкоўнік Я. Канопка ўдзельнічаў у французскай інтэрвенцыі ў Іспанію, падчас якой у 1811 г. атрымаў званне брыгаднага генерала. Улічваючы вайсковы шлях Я. Канопкі, цалкам лагічным выглядае яго прызначэнне камандзірам гвардзейскага палка, які рэпрэзентаваў ВКЛ у «Вялікай арміі» Напалеона.

Асабіста для імператара была сфарміравана Пачэсная гвардыя пад камандаваннем Габрыэля Агінскага, якая складалася з маладых прадстаўнікоў найбольш знатных магнацкіх фамілій ВКЛ. Членам гэтай гвардыі стаў брыгадны генерал арміі ВКЛ, ад’ютант пры імператарскім штабе Юзаф Антоні Касакоўскі, ветэран вайны 1792 г. і паўстання 1794 г. [24].

Каля 10 ліпеня было вырашана стварыць армію ВКЛ у складзе 5 пяхотных і 4 кавалерыйскіх палкоў [19, с. 480]. У канцы жніўня паўстала генеральная інспекцыя арміі ВКЛ. Генерал-інспектарам арміі ВКЛ стаў кадравы афіцэр арміі ВКЛ дывізійны генерал князь Рамуальд Гедройц. Генерал-інспектарам пяхоты быў прызначаны таксама кадравы афіцэр арміі ВКЛ брыгадны генерал граф Ксаверы

Францішак Несялоўскі. Генерал-інспектарам кавалерыі стаў брыгадны генерал Юзаф Ваўжэцкі [13, с. 14].

Прызначэнне гэтых людзей не было выпадковай з'явай. Кожны з іх прайшоў няпросты шлях баявога афіцэра. Ваенная кар'ера Р. Гедрайца пачалася яшчэ ў 1765 г., калі ён пачаў навучанне ў Рыцарскай школе. Падчас вайны 1768–1772 гг. малады афіцэр ваяваў у войсках барскіх канфедэратаў, пад кіраўніцвам М. К. Агінскага прымаў удзел у абароне ВКЛ ад расійскіх войск, удзельнічаў у баях пад Гародняй, Маладзечнам, Бездзежам. За заслугі ў справе абароне Айчыны 22-гадовы князь атрымаў званне маёра, але, з паражэннем барскіх канфедэратаў, ён быў вымушаны пакінуць ваенную службу. У 1778 г. ён вярнуўся ў армію, быў прызначаны віцэ-брыгадзірам літоўскіх гусараў. Падчас расійскай інтэрвенцыі 1792 г. Р. Гедройц атрымаў званне генерал-маёра. Абсалютна натуральна, што ў 1794 г. ён прыняў актыўны ўдзел у паўстанніі пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі. Р. Гедройц стаў адным з лідэраў паўстання ў ВКЛ, з'яўляўся намеснікам Я. Ясінскага, затым ваяваў пад камандаваннем Т. Ваўжэцкага, атрымаў вышэйшую ваенную ступень у ВКЛ – званне генерал-лейтэнанта. Пасля падаўлення паўстання ён быў звольнены і вымушаны пакінуць радзіму. Аднак ў 1796 г. Р. Гедройц вярнуўся на захопленыя Расіяй землі ВКЛ і паспрабаваў падняць паўстанне ў Жамойці.

Будучы генерал-інспектар пяхоты таксама прайшоў няпросты жыццёвы шлях. К. Ф. Несялоўскі нарадзіўся ў Ляхавічах у 1771 г. Ва ўзросце 21 года ён стаў палкоўнікам 6 пяхотнага палка арміі ВКЛ, на чале якога ён ваяваў пад Бярэсцем падчас вайны 1792 г. За мужнасць Ф. К. Несялоўскі быў узнагароджаны ордэнам Virtuti Militari. У 1794 г. ён прыняў актыўны ўдзел у паўстанні, абараняў Вільню, атрымаў званне генерал-маёра.

Разам з генеральнай інспекцыяй быў сфарміраваны штаб арміі ВКЛ, у які ўвайшлі: шэф штабу Р. Гедройца маёр Леанард Казлоўскі, ад'ютант Гедройца капітан Ежы Белапятровіч; шэф эскадрона Гедройца Альберт Ласкарыс, ад'ютант генерала Несялоўскага капітан Антоні Гаўдзюлевіч; ад'ютант генерала Ваўжэцкага паручнік граф Станіслаў Плятэр; шэф батальёна пры штабе генерал-губернатара графа Гагендорпа Антоні Кіркор, ад'ютант з таго ж штабу падпаручнік Міхал Нестар [19, с. 501].

Вынікам праведзенага набору было фарміраванне амаль 6 пяхотных палкоў. У наваколлі Вільні праходзіў працэс фарміравання 18 пяхотнага палка, камандзірам і фактычным мецэнатам якога стаў кадравы афіцэр кароннага войска Аляксандр Хадкевіч, які яшчэ

ў 1794 г. ваяваў пад сцягамі Т. Касцюшкі. 19 пяхотны полк, які камплектаваўся ў этнічнай Літве, узначаліў Канстанцін Тызенгаўз. На чале 20 пяхотнага палка, які фарміраваўся пад Слонімам, камандзірам стаў барон Адам Бішпінг. 21 пяхотны полк, які збіраўся пад Беластокам, узначаліў Караль Дамінік Пшэздзецкі, які пазней стаў камандзірам 18 уланскага палка. Замест яго на чале палка стаў Антоні Гелгуд. 22 пяхотны полк фарміраваўся ў Мінску пад камандаваннем ураджэнца Нясвіжа граф Станіслава Гутэн-Чапскага. 23 пяхотны полк, які не быў запланаваны, сталі камплектаваць вельмі позна, і скончыць яго фарміраванне не паспелі.

У выніку набора ў кавалерыю былі сфарміраваны 4 уланскіх палка. 17 полк, які фарміраваўся пад Купішкамі ўзначаліў Міхаіл Тышкевіч. На чале 18 палка, які збіраўся каля Нясвіжа, стаў першапачаткова Юзаф Ваўжэцкі, а пасля яго прызначэння генерал-інспектарам кавалерыі – былы камандзір 21-га пяхотнага палка К. Д. Пшэздзецкі. Камандзірам 19 уланскага палка, сфарміраванага пад Навагрудкам, стаў Канстанцін Раецкі, а на чале 20 палка, які камплектаваўся каля Пінска, Ксаверы Абуховіч. Таксама 8 полк уланаў Варшаўскага княства Д. Радзівіла складаўся ў асноўным з вы-хадцаў з Беларусі і Літвы [24].

24 жніўня было прынята рашэнне ўтварыць дадаткова 6 стралецкіх (егерскіх) батальёнаў. Рэальна былі сфарміраваны 1 батальён Юзафа Дамініка Корвін-Касакоўскага, 2 батальён маёра Ігната Ракіцкага, 3 батальён маёра Казіміра Плятэра да снежня быў у працэсе фарміравання, а 4 батальён падпалкоўніка Андрэя Курчэўскага ў снежні толькі пачаў збірацца, а апошнія два батальёны так і засталіся на паперы [20, с. 175]. Камандны склад стралецкіх фарміраванняў таксама не быў выпадковым. Напрыклад Ю. Касакоўскі быў кадравым афіцэрам войска ВКЛ. У 1790 г. ён атрымаў званне ратмістра ў 1 брыгадзе нарадовай кавалерыі. У адрозненне ад многіх іншых камандзіраў арміі ВКЛ 1812 г., Касакоўскі ў 1792 г. быў праціўнікам Канстытуцыі 3 мая 1791 г., дзейнічаў у лагеры таргавічан, за што зімой 1793 г. атрымаў з рук караля Станіслава Панятоўскага ордэн Белага арла, а за тым, у маі 1793 г. узначаліў 2 пяхотны полк арміі ВКЛ.

На пачатку жніўня з ініцыятывай фарміравання новых палкоў выступіў сябра Ваеннага камітэту, колішні ад’ютант славутага Якуба Ясінскага Аляксандр Пацей. Ён ахвяраваў каля 180 тыс. злотых на фарміраванне 23 пяхотнага палка, які пачаў збірацца ў Мінску. За свой кошт, з дазволу Ваеннай камісіі, пачаў фарміраванне кавалерыйскага палка Ігнат Манюшка. Сфарміраваны полк атрымаў назву 21 палка конных стралкоў, камандзірам стаў сам І. Манюшка. Штат

гэтага падраздзялення мусіў адпавядаць узору ўланскага палка. Рэальна 21 полк пачаў фарміравацца толькі ў кастрычніку, таму укамлектавацца цалкам ён не меў магчымасці. Быў сфарміраваны толькі 1 эскадрон, які налічваў 10 афіцэраў і 258 падафіцэраў і шарагоўцаў [19, с. 563].

У мястэчку Жалудок Лідскага павета ў верасні – кастрычніку за асабісты кошт Рудольфа Тызенгаўза фарміравалася конна-артылерыйская рота, якая налічвала 124 чалавекі і 131 каня і павінна была атрымаць на сваё ўзбраенне 12 гармат [19]. У Расіенскім павеце пачаў арганізацыю кавалерыйскага палка Юзаф Гедрайц. У Пінскім павеце падобную спробу зрабіў Гедэон Яленскі. [19, с. 561]. У верасні пачаў фарміраванне гусарскага палка Мікалай Абрамовіч, але з прычыны недахопу грошай сабраных жаўнераў далучылі да палка конных стралкоў. Галоўнай праблемай у арганізацыі валанцёрскіх палкоў быў востры недахоп фінансавых сродкаў.

У баку ад грамадска-палітычных падзей на Беларусі не засталося і мясцовае татарскае насельніцтва. Арганізатарамі татарскіх узброеных фарміраванняў сталі былы падпалкоўнік 4 палка пярэдняй варты ВКЛ Мустафа Мірза Ахматовіч [17; 19, с. 559].

1 ліпеня 1812 г. Камісія часовага ўрада абвясціла аб стварэнні нацыянальнай гвардыі ў цэнтрах дэпартаментаў і ў гарадах з магдэбургскім правам. Камандзірам віленскай гвардыі прызначаўся палкоўнік Казельскі [18]. У Беластоцкім дэпартаменце камендантам гвардыі быў прызначаны палкоўнік Францішак Арсеці. У Мінску працэс арганізацыі гвардзейскіх падраздзяленняў зацягнуўся, але яна ўсё ж была створана, што пацвярджае рапарт С. Грабоўскага аб тым, што «Вільня, Мінск, Беласток і Гародня далёка прасунуліся ў працэсе фарміравання гвардыі» [19, с. 620]

Адначасова з нацыянальнай гвардыяй стваралася і жандармерыя ВКЛ. Яна прызначалася для паліцэйскай службы, барацьбы з бандытызмам і марадзёрствам, аказання ўзброенай дапамогі органам улады. На чале віленскай жандармерыі быў прызначаны Антоні Храптавіцкі. Камандзірам беластоцкай жандармерыі стаў Францішак Арэцці. У Гродзенскім дэпартаменце было набрана 856 жандараў на чале з князем Міхалам Радзівілам. У надзвычай сумным становішчы знаходзілася жандармерыя Мінскага дэпартамента камандзірам якой быў Леў Аштроп. У выніку фарміравання жандармерыі было набрана каля двух тысяч чалавек, замест 3,5 тысяч [18].

Ваяры арміі ВКЛ змагаліся ўпарта і самаахвярна. Многія з іх у 1812–1813 гг. атрымалі вышэйшыя ваенныя ўзнагароды РП і Францыі.

Так, камандзір 22 пяхотнага палка С. Чапскі пасля бітвы каля Бярэзіны ў 1812 г. стаў кавалерам ордэна Virtuti Militari, а ў 1813 г. атрымаў ордэн Пачэснага Легіёна. Камандзір 1 стралецкага палка Ю. Касакоўскі пасля ўдзелу ў абароне Шпандаў і ў 1813 г. таксама стаў кавалерам ордэна Пачэснага Легіёна.

Многія з афіцэраў войска ВКЛ у далейшым працягнулі службу ў арміі Каралеўства Польскага, як аўтаномнага дзяржаўнага ўтварэння ў складзе Расійскай імперыі. Генерал-інспектар арміі ВКЛ генерал дывізіі Р. Гедройц увайшоў у склад Ваеннага камітэту Каралеўства Польскага. Генерал-інспектар пяхоты граф Ф. К. Несялоўскі быў прызначаны камадзірам брыгады, А. Хадкевіч у званні палкоўніка быў прызначаны камандзірам штабу гвардыі Каралеўства, Я. Канопка стаў камандзірам 1 брыгады кавалерыі, але не здолеў уступіць на пасаду з прычыны хваробы і хуткай смерці.

Нягледзячы на тое, што сваёй барацьбой у перыяд з 1795 да 1814 г. патрыятычна настроеная шляхта РП шмат чаго дамаглася – аўтаномнага статуса для Польшчы, увядзенне Канстытуцыі і г. д., але мараў аб адраджэнні страчанай у 1795 г. Айчыны многія не пазбавіліся. Калі ў 1830 г. распачалося Лістападаўскае паўстанне шмат хто з афіцэраў войска ВКЛ сталі пад штандары незалежнасці. Ф. К. Несялоўскі, К. Д. Пшэздзецкі, А. Гелгуд, С. Чапскі ўпарта змагаліся ў шэрагах інсургентаў за адраджэнне РП, звязываючы будучыню беларускіх зямель толькі з гэтай краінай.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1 Антонаў, В. В. Агінскага план 1811 / В. В. Антонаў, С. С. Рудовіч, В. В. Швед // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск, 1993. – Т. 1. – С. 31–32.

2 Лукашевич, А. М. Проекты восстановления Речи Посполитой и Великого княжества Литовского и их место в военно-стратегическом планировании Российской империи (1810–1812 гг.). [Электронны рэсурс] / А. М. Лукашевич // Интернет-проект «1812 год». – Рэжым доступа: // http://www.museum.ru/1812/ Library/Lukashevich/index.html. – Дата доступа: 26.06.2017.

3 Корнейчик, Е. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года / Е. Корнейчик. – Минск : Наука и техника, 1978. – 267 с.

4 Ружанец, А. Літоўска-беларускае войска цэсара Напалеона / А. Ружанец // Беларуская мінуўшчына 1995. – № 1. – С. 29–30.

5 Таляронак, С. Апошняя армія ВКЛ (1812–1814) / С. Таляронак, А. Блінец // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 2. – С. 22–34.

6 Лукашэвіч, А. Ваеннае становішча ў Беларусі ў 1812 г. [Электронны рэсурс] / А. Лукашэвіч / Бібліятэка гістарычных артыкулаў «Жыве Беларусь» – Рэжым доступа: http://www.jivebelarus.net/history/gistografia/war-situation-in-belarus-at-1812.html. – Дата доступа: 26.06.2017.
7 Швед, В. В. Фарміраванне і дзейнасць арміі ВКЛ (1812–1815 гг.) / В. В. Швед // Веснік Брэсцкага дзярж. ун-та. – 2000. – № 1. – С. 49–57.
8 Швед, В. Вялікае княства Літоўскае ў 1812 годзе / В. Швед // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – № 3. – С. 9–15.
9 Швед, В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады / В. Швед, С. Данскіх. – Гродна, 2006. – 252 с.
10 Ерашэвіч, А. У. Уплыў напалеонаўскіх войнаў на грамадска-палітычнае жыццё Беларусі (1799–1815 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. У Ерашэвіч; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2003. – 21 с.
11 Філатава, А. Вайна 1812 г. і Беларусь / А. Філатава // Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч і інш.; рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск, 2005. – С. 75–86.
12 Крывіцкая, К. В. Прафранцузскія настроі насельніцтва Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай воласці напярэдадні вайны 1812 года / К. В. Крывіцкая // Весці БДУ, № 3(49), 2006. – С. 34–37.
13 Крывіцкая, К. В. Арганізацыя ўзброенных сіл вялікага Княства Літоўскага ў перыяд вайны 1812 года / К. В. Крывіцкая // Весці БДУ, № 1(51), 2007. – С. 12–15.
14 Орловский, Е. Ф. Гродненская губерния в 1812 году. Ист. Очерк / Е. Ф. Орловский. – Гродно : губернская типография, 1912. – 50 с.
15 Тарле, Е. В. Нашествие Наполеона на Россию, 1812 год / Е. В. Тарле. – М. : Наука, 1992. – 304 с.
16 Жилин, П. А. Гибель наполеоновской армии в России / П. А. Жилин. – М. : Наука, 1974. – 451 с.
17 Шереметьев, О. В. Литовские татары в составе Императорской гвардии Наполеона [Электронны рэсурс] / О. В. Шереметьев // Военно-исторический Форум (XV, XVII–XVIII–XIX века). – Рэжым доступа: http://www.reenactor.ru/ARH/PDF/Cheremetiev_00.pdf. – Дата доступа: 12.08.2017.
18 Кудряшов, И. Ю. Вооруженные силы Литовского княжества 1812 года / И. Ю. Кудряшов. – М., 1991. – 19 с.
19 Nawrot, D. Litwa i Napoleon w 1812 roku / D. Nawrot. – Katowice, wyd. Uniwersitetu Slanskiego, 2008. – 790 s.
20 Nawrot, D. Bataliony strzelców na Litwie w 1812 r. / D. Nawrot // Wschodni rocznik humanistzczny. – 2005. – T II. – S. 169–190.

21 Kukiel, M. Zarys historji wojskowości w Polsce /M. Kukiel. – Kraków, nakładem Krakowskiej spółki wzdawnicyej, 1929. – 356 s.
22 Gembarzewski, B. Rodowody pułków polskich i oddziłów równorzędnych od r.1717 do r. 1831 /B. Gembarzewski. – Warszawa. nakładem tow.wiedzy wojskowej, 1925. – 100 s.
23 Staszewski, J. Generał Dominik Dziewanowski / J. Staszewski. – Poznan, członkami druk. wydaw. w Kaliszu, 1933. – 80 s.
24 Gaidis, H. L. Napoleon's Lithuanian forces [Electronic resource] / H. L. Gaidis // Lithuanian quarterly journal of arts and sciences. Vol. 30. – 1984. – № 1. – Mode of access: // http://www.lituanus.org/1984_1/84_1_01.htm. – Date of access: 15.08.2017.

УДК 94(476+271)+726.52

**Т. В. ГАБРУСЬ**
(Мінск, ДНУ «Цэнтр даследаванняў
беларускай культуры, мовы і літаратуры
НАН Беларусі»)

## МАСТАЦТВАЗНАЎЧАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ПАХОДЖАННЯ ТРАДЫЦЫЙНЫХ ДРАЎЛЯНЫХ ЗВАНІЦ БЕЛАРУСІ

*Артыкул прысвечаны асвятленню генезісу і эвалюцыі традыцыйных беларускіх драўляных асобна пастаўленых званіц і сучаснага стану помнікаў.*

Гісторыя званоў як музычнага ўдарнага інструмента налічвае каля 4000 тысяч гадоў. Першымі хрысціянамі яны ўспрымаліся як язычніцкія артэфакты. І толькі з пачатку V ст. званы пачалі ўжывацца для розных рэлігійных патрэб: апавяшчэнні аб пачатку набажэнства, небяспецы, смутку па памерлых і інш. Ініцыятыву, каб званы сталі голасам хрысціянскай царквы, згодна паданню, прыпісваць св. Паўліну (353–431 гг.), які жыў у італьянскай правінцыі Кампана, дзе ўпершыню было ўзведзена асобнае вышыннае збудаванне для званоў, якое з гэтай прычыны атрымала назву «кампаніла». Выкарыстанне для будаўніцтва мясцовага прыроднага каменю ў Італіі дазваляла рабіць кампанілы значна больш высокімі за саборы. Звычайна кампанілы былі пастаяннага квадратнага сячэння з падвойнымі ці патройнымі арачнымі праёмамі ўверсе, дзе месціліся званы. Па-за межамі Італіі ў сярэднявечнай Еўропе для размяшчэння званоў

звычайна прыстасоўваліся магутныя вежы раманскіх і гатычных сабораў.

На ўсходнеславянскія землі царкоўныя званы прыйшлі ў XI ст., пасля хрышчэння Русі, але не з Візантыі, дзе званы з'явіліся толькі пасля захопу Канстанцінопаля крыжаносцамі ў 1204 г., а з Заходняй Еўропы, праз Вялікі Ноўгарад, які меў гандлёвыя стасункі з Ганзейскім саюзам. Менавіта мураванае пскоўска-наўгародскае дойлідства старажытнарускага перыяду данесла да нас далучаныя да храмаў арачныя сценкі для званоў. Характэрна, што час будаўніцтва мураванага Сафійскага сабора ў Полацку на падставе розных гістарычных звестак даследчыкі вызначаюць 1044–1066 гг., што адпавядае храналагічным рамкам паміж пачаткам княжання Усяслава і яго паходам на Наўгарад, з якога ён прывёз званы і іншыя трафеі для полацкай Сафіі. Пра адданасць князя Ўсяслава сваёй святыне зазначае аўтар «Слова аб палку Ігараве»: «Тому в Полотьске позвониша заутренюю рано у святыя Софеи в колоколы, а он в Кыеве звон слыша». Тэкст ускосна сведчыць пра тое, што нават у Кіеве на той час званоў не было. Да пачатку XVI ст. для азначаных мэт часцей ужывалі металічныя білы, якія падвешвалі на перакладзіне, умацаванай на апорах розных канструкцый на ўзроўні чалавечага росту. І толькі з развіццём званаліцейнай справы на ўсходнеславянскіх землях з'явілася неабходнасць у асобных пабудовах для званаў.

Пытанні генезісу і эвалюцыі асобна пастаўленых драўляных званіц закраналіся шматлікімі даследчыкамі храмабудаўніцтва ўсходнеславянскіх народаў канца XIX – пачатку XX стагоддзяў: рускімі (Ф. Волкаў, Ф. Гарнастаеў, І. Забелін, М. Красоўскі, А. Паўлінаў і інш), украінскімі (Г. Паўлуцкі, Ф. Белавус, Я. Галавацкі, М. Драган, В. Шчарбакіўскі і інш.), польскімі (З. Глогер, І. Зубрыцкі, В. Дзедушыцкі, К. Маклоўскі, М. Сакалоўскі і інш.). У кантэксце драўлянага дойлідства Цэнтральна-Усходняй Еўропы іх прыцягвалі непараўнальныя па сваёй прыгажосці храмавыя ансамблі са званіцамі Галіцыі, Валыні, Падолля, Лемкаўшчыны, якія кожны з даследчыкаў імкнуўся далучыць да культурна-гістарычнай спадчыны свайго народа. Адпаведная спадчына Беларусі, тагачаснага «Северо-Западного края» Расійскай імперыі, у той час нікога не цікавіла. Між тым, адметную частку беларускага сакральнага дойлідства складаюць па-мастацку выразныя драўляныя званіцы-вежы пры храмах розных хрысціянскіх канфесій, якіх, нягледзячы на пажары і розныя іншыя перыпетыі лёсу, на шчасце, ацалела яшчэ даволі шмат. Даследчыцкая цікавасць да іх праявілася толькі з пачаткам станаўлення айчыннага мастацтвазнаўства (У. Краснянскі,

В. Ластоўскі, У. Чантурыя, Т. Хадыка-Габрусь, Ю. Якімовіч, С. Сергачоў, А. Лакотка). Гэтае ж кола артэфактаў для свайго рэгіёна грунтоўна прааналізавана літоўскай даследчыцай А. Янкавічэне.

Аднак пытанні, калі з'явіліся асобна пастаўленыя драўляныя званіцы як адметны архітэктурны тып, з якой прычыны і які характар іх эвалюцыі, вырашаюцца даследчыкамі па-рознаму, што невыпадкова з прычыны шматвектарнасці іх паходжання. Выдатны беларускі гісторык і краязнаўца, член Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, пазней супрацоўнік Інбелкульта, У. Краснянскі лічыў, што эвалюцыя асобна пастаўленых званіц ішла ад прымітыўных слупковых канструкцый, якія паступова ўскладняліся [1, с. 86]. Гэтая канцэпцыя эвалюцыі званіц храналагічна залішне прамалінейная і не адпавядае сапраўднасці. Наяўнасць архаічных слупковых званіц зафіксавана, напрыклад, у альбоме Мейерберга пачатку XVII ст. (у Дуброўна) [2, с. 141] і праз два стагоддзя ў малюнках Д. Струкава 1864 г. (пры цэрквах св. Ганны ў сяле Крысава Слуцкага павета, св. Юр'я ў Новым Сяле Бабрускага павета, у Прылуках Мінскага павета), што сведчыць пра стабільнасць іх разначасавага існавання ў праваслаўных прыходах. Экспедыцыямі «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» 1970-х гадоў падобныя аднаярусныя слупковыя званіцы зафіксаваны ў былых уніяцкіх цэрквах у вёсках Лобча Пінскага р-на, Ражкоўка Камянецкага р-на, Стрыгінь Бярозаўскага р-на, Голдава Лідскага р-на і інш. Выкарыстанне прасцейшых аднаярусных слупковых званіц залежала, хутчэй, ад эканамічных магчымасцей прыходу ці парафіі альбо лакальнай традыцыі.

З другога боку, сярод гісторыкаў архітэктуры пашырана меркаванне, што драўляныя царкоўныя званіцы як развітае функцыянальна-канструкцыйнае цэлае генетычна паходзяць ад баявых вежаў драўляных крапасных умацаванняў, што яны і ў храмах дадаткова служылі дазорнымі вежамі і выкарыстоўваліся ў абарончых мэтах. Аднак, асобная пастаноўка званіцы, наадварот, зніжае фартыфікацыйныя якасці збудавання. Дастаткова прыгадаць, што ўсе абарончыя храмы Беларусі мелі баявыя вежы, якія былі шчыльна далучаны да асноўнага аб'ёма ці надбудаваныя над ім. Гэта тычыцца і праваслаўных чатырохвежавых цэркваў-крэпасцей, і готыка-рэнесансных касцёлаў і рэфармацкіх збораў з адной магутнай вежай-вестверкам на галоўным фасадзе. Пазней, у XVII–XVIII стст., у перыяд сталага і позняга барока, пад уплывам узораў мураванай айчыннай архітэктуры атрымалі пашырэнне каталіцкія і ўніяцкія драўляныя храмы базілікальнай канцэпцыі з двухвежавым галоўным фасадам. Пры гэтым вежы ў іх не

мелі ніякага функцыянальнага прызначэння, не былі ні баявымі, ні сігнальнымі, а выконвалі толькі архітэктурна-кампазіцыйную ролю. У фасадных вежах барочных храмаў рэдка месціліся важкія званы, для якіх звычайна ставілася асобная двух- ці трох’ярусная званіца. У вежачках пры храмах ці над імі часам размяшчалі малыя званы (сігнатуркі). Літоўская даследчыца А. Янкявічэне лічыць, што прычынай пашырэння асобна пастаўленых званіц была менавіта вялікая вага званоў, якая ўяўляла небяспеку для канструкцый надбудаваных над храмамі вежаў [3, с. 296].

Намі прапанавана ўласная мастацтвазнаўчая канцэцыя паходжання і эвалюцыі асобна пастаўленых айчынных драўляных званіц, заснаваная на ўздзеянні на гэты працэс эстэтычнай канцэпцыі стылю барока, што была прыўнесена ў беларускую архітэктуру з Італіі [4, с. 91]. Адным з самых важных мастацкіх прынцыпаў барока з’яўляецца стварэнне разгорнутага архітэктурна-прасторавага храмавага ансамбля. Асобная пастаноўка званіцы адпавядала новым ансамблевым прынцыпам барока, спрыяла больш шчыльнаму ўзаемадзеянню архітэктуры і асяроддзя, адчуванню прасторава-часавага рытму. І на гэтым узроўні ў іх генезісе можна адзначыць не толькі ўплыў крапаснога дойлідства, але італьянскіх кампаніл. У перыяд ранняга барока вылучэнне з кампазіцыі храма готыка-рэнесанснага тыпу аб’ёма бабінца з шмат’ярусной вежай над ім рабілася з мэтай займець у драўляным храме базілікальнай канцэпцыі плоскі галоўны фасад накшталт тагачасных мураваных базілік. Храм заўжды займаў дамінуючае становішча ў планіровачнай структуры населенага пункта, ля гандлёвай плошчы горада, мястэчка ці сяла. Яго тэрыторыя з невялікімі могілкамі-цмянтаром вылучалася драўлянай ці муравaнай агароджай з брамай, якая часам спалучалася са званіцай.

Калі разглядаць архітэктурна-мастацкія характарыстыкі айчынных званіц XVII—XX стст., то відавочна, што яны творча вар’іраваліся і канструкцыйна, і кампазіцыйна, і рэгіянальна. Для даследавання намі прыцягнуты звыш 100 помнікаў, вядомых паводле натурных абследаванняў і архіўных крыніц. Апошнія ўключаюць старажытныя інвентары, мастацкія выявы званіц ў творах Н. Орды, Д. Струкава, А. Ромера, Ф. Рушчыца, Я. Драздовіча, фотаздымкі пачатку XX ст. Я. Балзункевіча, 1920-х гг. з архіва Інбелкульта, 1970-х гг. з архіва сектара «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» ІМЭФ НАН Беларусі і сучаснага «Глобуса Беларусі» А. Дыбоўскага [5]. Базавыя архітэктурныя характарыстыкі беларускіх драўляных званіц як асобнага цэнтрычнага вышыннага збудавання, бясспрэчна, запазычаны

з традыцыйных будаўнічых прыёмаў узвядзення баявых чацверыкоў («столбцаў») драўляных крэпасцей сярэднявечнай Беларусі. На «Чарцяжы Віцебска 1664 г.» бачна, што званіца Увядзенскай царквы мела непасрэднае падабенства з крапаснoй Дзвінскай вежай Верхняга замка. Для забеспячэння устойлівасці асобна пастаўленага збудавання найбольш раннія званіцы часам мелі нахіленыя да цэнтра сцены ніжняга чацверыка і навясны верхні ярус, які імітаваў падсябіцце.

Для большасці традыцыйных асобна пастаўленых званіц Беларусі XVII–XVIII ст. характэрны устойлівыя агульныя кампазіцыйна-канструкцыйныя архітэктурна-будаўнічыя прыёмы. У архіўных інвентарах неаднаразова адзначаецца, што званіцы пабудаваны «на вязанні ў квадрат» (г.зн. гарызантальнымі вянкамі, з квадратным планам) ці «аб чатырох слупах» (каркасныя), альбо былі змяшанага тыпу з ніжнім зрубавым і слупковым верхнім (ці двума верхнімі) ярусамі, якія ўверсе звычайна былі накрыты пакатым шатром-«каўпаком» з крыжам. Ярусы падзяляліся шырокімі прычолкамі, пакрытымі серабрыстым гонтам. Для беларускага дойлідства не ўласцівыя званіцы з колькасцю ярусаў большай за тры. Ніжні ярус званіцы часта, хаця і не заўсёды, выкарыстоўваўся як уваходная брама на тэрыторыю храма – прыём, які таксама генетычна паходзіць з мясцовага крапаснога будаўніцтва.

Прыблізна 1/10 частка разгледжаных помнікаў прадстаўляюць лапідарныя прызматычныя аб’ёмы каркаснай канструкцыі з вузкімі акустычнымі адтулінамі ўверсе, накрытыя пакатым чатырохсхільным шатром, званым «каўпаком». Пад шатром зроблены адкрытыя перакладзіны, на якіх мацуюцца званы. Найбольш пашыранымі былі двух’ярусныя званіцы з ніжнім зрубным чацверыком і верхнім, каркасным, з разнастайна афармленымі акустычнамі праёмамі. Для іх характэрная цотная колькасць праёмаў, якая выразна выяўляе структуру каркаса, напрыклад, званіцы касцёла ў Багданаве Валожынскага р-на, уніяцкіх цэркваў у Вяльцы Глыбоцкага р-на, Шарашова Пружанскага р-на. Пралёты паміж слупамі каркаса ўмацоўваліся перакрыжаванымі, дыяганальнымі і рамбічнымі падкосамі, што павялічвалі прасторавую жорсткасць канструкцыі і стваралі арнаментальны дэкор.

Найбольш шыкоўныя драўляныя званіцы перыяду барока былі звычайна трох’ярусныя. Адначасова з удасканаленнем кампазіцыйных і пластычных характарыстык сакральнай архітэктуры ў цэлым асаблівая маляўнічасць надавалась і архітэктурнаму вобліку званіц. Згодна эстэтычным прынцыпам віленскага барока, памеры ярусаў выразна скарачаліся ўгору, што аптычна рабіла вежу званіцы больш высокай і стройнай. У трох’ярусных званіцах верхнія ярусы з няцотнымі

шэрагамі праёмаў імітавалі ажурныя арачныя галерэі (падсені). Відавочна, што іх мясцовая назва »падсені» акцэнтуе той светлаценевы эфект, які стваралі арачныя галерэі ў мастацкім вобразе збудаванняў. Малюнак арачных праёмаў дасягаўся з дапамогай фігурна габляваных вуглавых падкосаў. Другім спосабам стварэння падсеняў на верхніх ярусах званіц было вырэзванне арачных перамычак у шырокай дошцы-падзорыне, размешчанай над праёмамі. Гэты прыём зафіксаваны В. Ластоўскім у шэрагу званіц былой Бабруйскай акругі, напрыклад, у вёсках Толы, Ворсічы, Шыпілавічы, Урэччы, але сустракаецца і ў іншых месцах, напрыклад, у вёсках Валеўка Навагрудскага р-на, Муравана Ашмянка Астравецкага р-на. Ніжнюю частку скразнога яруса званіц звычайна закрываў глухі парапет альбо балюстрада ў разьбянымі балясінамі ці перакрыжаванымі падкосамі. Іншы раз шырокі гонтавы прычолак пластычна пераходзіў на парапет верхняга яруса ў выглядзе «кажухавання», г.зн. абшыўкі вертыкальнай сценкі парапета гонтам, што з’яўляецца вынікам уплыва на будаўніцтва Беларускага Палесся украінскіх узораў [6, с. 210].

Стылявой і канструкцыйнай характарыстыкай традыцыйных званіц Беларусі з’яўляецца наяўнасць і тып шалёўкі. Для часоў барока найбольш характэрна вертыкальная шалёўка пілаванымі дошкамі з нашчыльнікамі званіц markup рознай канструкцыі. Але ў адрозненне ад уласна храмаў, ніжні зрубны з брусоў чацверык не заўсёды быў ашаляваны, а заставаўся адкрытым, нават у дастаткова рэпрэзентатыўных помніках: званіцы касцёлаў св. Юр’я ў Янаве Сакольскім і св. Андрэя ў Кабыльніку (г.п. Нарач), уніяцкай царквы ў Серніках на Піншчыне. Традыцыйную вертыкальную шалёўку мелі звычайна званіцы каркаснай канструкцыі, відавочна, з эстэтычных патрабаванняў ансамблевага адзінства. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай пад уплывам эстэтыкі рускага класіцызма атрымалі пашырэнне гарызантальная шалёўка драўляных цэркваў і званіц, іншы раз з вертыкальнай цокальнай панеллю, выкарыстанне ў дэкоры вуглавых пілястраў, прафіляваных карнізаў і ліштваў. Чацверык верхняга яруса пачалі замяняць васьмерыком, накрытым купалам ці высокім псеўдарускім шатром з цыбулістай галоўкай.

Параўнанне рознадасовых графічных матэрыялаў адлюстроўвае пэўныя змены, якія адбыліся ў архітэктурна-мастацкіх вобразах драўляных званіц на працягу XIX – пачатку XXI ст. У наш час з адраджэннем рэлігійнага жыцця ў карыстанне вернікаў розных канфесій перададзены шэраг раней закінутых драўляных храмаў XVII–XVIII стагоддзяў са старымі званіцамі. На жаль, іх аднаўленне

адбываецца валюнтарысцкім шляхам, непрафесійна, з тэндэнцыйным грэбаваннем традыцый нацыянальнага драўлянага дойлідства. Паўсюдна гонтавыя пакрыцці заменены бляшанымі, зменена форма і вышыня дахаў, увянчаных цыбулістымі галоўкамі, знішчаецца традыцыйная шалёўка, зашкляюцца скразныя праёмы. Усё гэта кардынальна мяняе выпрацаваны пакаленнямі майстроў-дойлідаў мастацкі вобраз помнікаў і мэтанакіравана дэфармуе эстэтычны густ нацыі.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1 Краснянскі, В. «Чарцёж» места Віцебску 1664 г. як дакументальны помнік да гісторыі беларускага драўлянага будаўніцва / В. Краснянскі // Запіскі аддзела гуманітарных навук Інбелкульта. – Кн. 1. – Т. 1. – Сш. 1. – Менск, 1928. – С. 39–93.

2 Красовский, М. Энциклопедия русской архитектуры: Деревянное зодчество / М. Красовский. – СПб., Изд-во «Сатисъ», 2002. – 384 с.

3 Jankevichiene, A. Lietuvos medines baznycios, koplycios ir varpines / A. Jankevichiene. – Vilniaus dailes akademijos leidykla, 2007. – 351 s.

4 Хадыка, Т. В. Аналіз станаўлення стылю барока ў манументальным драўляным дойлідстве Беларусі XVII ст. / Т. В. Хадыка // Весці акадэміі Навук БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1974. – № 1. – С. 95–103.

5 Глобус Беларусі. Проект Андрея Дыбовского. Архитектурные и иные достопримечательности Беларуси [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: www.globus.tut.by. – Дата доступа: 15.08.2017.

6 Тарас, Я. Українська сакральна дерев’яна архітектура / Я. М. Тарас. – Львів: Інститут народознавства НАН України, 2006. – 583 с.



УДК 7.091.4(476.2):793.31:394



**В. В. ГАРДЗЕЙ**
(Гомель, УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)


# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ Ў РАМКАХ МІЖНАРОДНАГА ФЕСТЫВАЛЮ ХАРЭАГРАФІЧНАГА МАСТАЦТВА «СОЖСКІ КАРАГОД»


*Артыкул прысвечаны пытанням пашырэння ведаў аб традыцыйнай культуры Беларусі на сучасным этапе. Разглядаецца міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод», які праводзіцца ў Гомелі. Папулярызацыя традыцыйнай культуры Беларусі*

*дэталізуецца праз правядзенне ў рамках фестывалю конкурсных мерапрыемстваў па народным танцам і арганізацыі выстаў-кірмашоў традыцыйных рамёстваў. Аўтарам вызначана, што святы і фестывалі з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі формамі папулярызацыі беларускай традыцыйнай культуры, неад'емнай часткай якой выступае беларускае народнае харэаграфічнае мастацтва.*

На сучасным этапе ва ўмовах глабалізацыі свет успрымаецца як адзінства разнастайнасці, таму перад ім паўстала неабходнасць шанаваць унікальнасць, арыгінальнасць, самабытнасць і непаўторнасць культур, пачала актуалізавацца ідэя талерантнасці і міжкультурнага дыялогу ва ўзаемадзеянні розных культур. Выяўляецца культурная разнастайнасць у шматлікіх формах самабытнасці і культурнага самавызначэння народа. У глабалізаваным свеце менавіта культурны суверэнітэт (захаванне ўнікальнасці, самабытнасці культуры) нацыі становіцца гарантам развіцця культуры і будучыні краіны. Сацыякультурным феноменам беларускай культуры з'яўляецца захаванне аўтэнтычнай традыцыйнай культуры. У Беларусі захаваўся ў рэальным існаванні ўнікальны архаічны каляндарна-абрадавы пласт традыцыйный культуры. Пазіцыянаванне, рэфлексія, інтэрпрэтацыя і прасоўванне беларускай культуры (традыцыйнай, класічнай, сучаснай) як у краіне, так і за яе межамі можа выклікаць цікавасць да яе, умацуе яе імідж. Няма задачы больш важнай, чым уключэнне традыцыйнай культуры ў сучасную беларускую культуру, стварэнне крэатыўнай культурнай прасторы [1, с. 18].

У кантэксце развіцця сучаснай беларускай культуры разгарнуўся шырокі фестывальны рух, які праводзіцца на міжнародным, рэспубліканскім і рэгіянальным узроўнях. Міжнародныя фестывалі садзейнічаюць развіццю культурных сувязей, што вельмі важна для краіны. На сённяшні дзень фестывалі ўспрымаюцца як сапраўднае свята, дзе адбываецца паказ дасягненняў у розных галінах мастацтва. Асабліва адметнымі становяцца менавіта фестывалі традыцыйнай культуры Беларусі. Апошнім часам арганізатары некаторых фестываляў ў праграмы таксама змяшчаюць конкурсныя мерапрыемсты ці выставы беларускай традыцыйнай культуры. Фестывалі становяцца сапраўды значнымі культурнымі падзеямі ў жыцці насельніцтва, што садзейнічае шырокай папулярызацыі традыцыйнай культуры Беларусі.

Адной з найбольш яркіх культурных падзей горада Гомеля з'яўляецца Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацта «Сожскі карагод». Упершыню гэты фестываль быў праведзены ў 1997 г. і з таго

часу нязменна праходзіць у абласным цэнтры адзін раз у два гады на працягу некалькі дзён у сярэдзіне верасня.

Галоўная мэта фестывалю – развіццё харэаграфічнага мастацтва, пашырэнне і ўмацаванне творчых сувязей, узаемадзеянне нацыянальных культур, павышэнне выканаўчага майстэрства калектываў і асобных выканаўцаў, развіццё фестывальнага руху ў вобласці харэаграфіі. Эмблемай Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» быў абраны вобраз лятучага бусла ў высокім небе, які лічыцца сімвалам надзейнасці, спакою, утульнасці.

На аснове правядзення Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» аўтарам даследаваліся асноўныя формы і спосабы папулярызацыі традыцыйнай культуры Беларусі. Асноўны акцэнт быў здзейснены менавіта нвядзенне ў конкурсную праграму фестывалю намінацыі «Фальклорна-бытавы танец». З’яўляючыся неад’емнай часткай традыцыйнай культуры, беларускае народнае харэаграфічнае мастацтва на сучасным этапе становіцца адным з найбольш яркіх спосабаў яе папулярызацыі. Неабходна адзначыць, што ўвага аўтара надавалася таксама правядзенню ў рамках фестывалю выстаў-кірмашоў па традыцыйнай культуры Беларусі, майстар-класаў па розных відах народных рамёстваў, якія былі арганізаваны на шэрагу пляцовак горада Гомеля. Акрамя гэтага, аўтарам прасочаны вызначаны ўклад сродкаў масай інфармацыі ў папулярызацыю фестывалю ў цэлым і ў тым ліку канкрэтных намаганняў арганізатараў і удзельнікаў па прэзентацыі беларускіх народных танцаў.

Складванне беларускага танцавальнага мастацтва праходзіла непасрэдна ў працэсе фарміравання і развіцця беларусаў і іх культуры. Кожная значная падзея ў жыцці беларускага народа заўсёды суправаджалася танцамі. Вяселле, калядкі, купалле, зажынкі, дажынкі і іншыя святы ніколі не абыходзілася без танцаў. Таму беларускія народныя танцы, у якія са старажытных часоў былі закладзены тэмперамент, характар беларускага народа, з’яўляюцца яскравым адлюстраваннем традыцыйнай культуры Беларусі [2, с. 22].

За дваццацігадовую гісторыю існавання Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» няспынна змяняўся, пашыраючы і ўключаючы ў праграму новыя намінацыі і мерапрыемствы. Штогод павышаецца і колькасць удзельнікаў, якая перавышае 1 500 чалавек. У 2016 г. быў праведзены VIII Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод». Ён стаў самым маштабным за ўсю гісторыю яго правядзення. У фестывалі

прынялі ўдзел творчыя калектывы з 22 краін свету, сярод якіх былі прадстаўлены творчыя калектывы з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Малдовы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Сербіі, Балгарыі, Францыі, Італіі і іншыя. Упершыню прынялі ўдзел танцавальныя калектывы з такіх краін як Гана, Нігерыя, Кот-д’Івуар, Шры-Ланка, Індыя.

Асноўная праграма Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» уключае цырымонію адкрыцця і закрыцця фестывалю, тэатралізаванае касцюміраванае шэсце ўдзельнікаў фестывалю, якое прадугледжвае прэзентацыю харэаграфічных калектываў, выступленні калектываў удзельнікаў фестывалю на канцэртных пляцоўках горада Гомеля, конкурс балетмайстарскіх работ, конкурсныя выступленні калектываў народна-сцэнічнага, эстраднага, фальклорна-бытавога танца, сучаснай харэаграфіі, конкурсныя выступленні тэатраў вогнішча, міжнародны турнір па бальна-спартыўным танцам на Кубак горада Гомеля «Залатая Рысь», спектаклі балетных тэатраў, выступленні прафесійных калектываў. Ладзіцца «Круглы стол» па пытаннях развіцця харэаграфічнага мастацтва.

Конкурсныя мерапрыемствы фестывалю праводзяцца ў тры тура. Першыя два туры з’яўляюцца адборачнымі. Трэці заключны тур конкурса – фінал, які праводзіцца публічна. Пляцоўкай для фінальнага конкурсу выступае гарадскі цэнтр культуры. Пераможцу фестываля ўручаецца Гран-пры. Па выніках конкурных праграм I, II, III месца прызначаюцца ў намінацыях «Народна-сцэнічны танец», «Эстрадны танец», «Сучасная харэаграфія», «Фальклорна-бытавы танец», «Тэатр вогнішча», «Конкурс балетмайстарскіх работ (народна-сцэнічны танец)», «Конкурс балетмайстарскіх работ (сучасная харэаграфія)» з прысваеннем звання «Лаурэат» і «Дыпламант» адпаведна [4].

Аднак намінацыя «Фальклорна-бытавы танец» з’яўляецца новай для фестывалю і была ўпершыню ўключана толькі ў 2016 годзе ў конкурсную праграму VIII Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод». Раней у праграме была толькі намінацыя «Народна-сцэнічны танец», але трэба разумець, што гэта не народны танец, які танцавалі са старажытных часоў продкі беларускага этнасу, перадавалі яго з пакалення ў пакаленне і захавалі да нашых дзён. Народна-сцэнічны танец ставіцца балетмайстарам і ўключае толькі элементы традыцыйнага танца. Таму ўвядзенне ў конкурсную праграму фестывалю намінацыі «Фальклорна-бытавы танец», дзе творчыя калектывы дэманструюць аўтэнтычныя беларускія народныя танцы стала важным крокам для папулярызацыі беларускага народнага танца, які з’яўляецца адной з найважнейшых частак традыцыйнай

беларускай культуры. Улічваючы геаграфічную разнастайнасць удзельнікаў фестывалю, гэта намінацыя была ўведзена для таго, каб больш поўна раскрыць і паказаць нацыянальны каларыт усіх творчых калектываў праз традыцыйны танец. У многіх народаў ёсць танцы, так званыя рэпрэзентанты этнічнай ці нацыянальнай культуры, культурныя сімвалы, прызнаныя іншымі этнічнымі супольнасцямі. Таму менавіта намінацыя «Фальклорна-бытавы танец» і была ўведзена ў конкурсную праграму фестывалю для таго, каб кожная краіна мела магчымасць прадэманстраваць гэтыя асаблівасці. Сярод такіх традыцыйных танцаў у беларусаў у цэлым, у тым ліку і на Гомельшчыне, найбольш вядомыя два: «Лявоніха» і «Полька». Пры тым, у кожным рэгіёне склалася шмат розных варыянтаў і асаблівасцей іх выканання, што і імкнуцца перадаць народныя калектывы падчас конкурсных мерапрыемстваў.

Аднымі з пераможцаў па выніках VIII Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод», прадстаўляўшых Беларусь і атрымаўшых III месца ў намінацыі «Фальклорна-бытавы танец» сталі танцавальныя пары народнага ансамбля песні, музыкі і танца «Лявоніха» і ўзорнага ансамбля танца «Верасок» Капаткевіцкага гарадскога Дома культуры Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Дзіцячым і дарослым калектывамі былі выкананы такія танцы як «Полька-мост» і «Конкавіцкая кадрыль» [5].

Супрацоўнікамі Капаткевіцкага гарадскога дома культуры вывучаюцца і апісваюцца фальклорныя традыцыі Палескага рэгіёна, народныя святы, праводзяцца сустрэчы з носьбітамі фальклора, а ўзорны калектыў «Верасок» з'яўляецца пераемнікам пакаленняў, у якім дзеці развучваюць народныя бытавыя танцы, песні, легенды, гульні, прымаўкі і лічылкі.

Калектыў выконвае беларускія народныя танцы «Лявоніха», «Мікіта», «Вяночкі», «Таўкачыкі», полька «Весялуха». Таксама калектывам былі адноўлены такія бытавыя танцы як полька «Шчабятуха», «Нарэчанька», «Матлет». Полька «Мост», «Мелкая», «Троіца», «Конкавіцкая кадрыля», якія бытавалі толькі ў іх мясцовасці, былі даследаваны і адноўлены [3, с. 14]. Матэрыялы даследавання былі ўнесены ў кнігу «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», том 6 «Гомельскае Палесе і Падняпроўе». Гэтыя танцы з поспехам выкарыстоўваюцца танцавальнымі калектывамі вобласці.

Трэба адзначыць, што ў рамках фестывалю «Сожскі карагод» арганізоўваюцца такія выставы-кірмашы народных ўмельцаў як «Горад майстроў», «Беларускія нацыянальныя абрады і традыцыі», якія прадстаўляюць вырабы з ткацтва, ганчарства, саломапляцення і іншых

рамёстваў. Арганізацыя такіх выстаў-кірмашоў таксама складае адну з асноўных форм папулярызацыі традыцыйнай культуры Беларусі.

Акрамя гэтага, народныя ўмельцы на розных гарадскіх пляцоўках праводзяць разнастайныя майстар-класы па пляценню паясоў, лепцы з гліны, саломапляценню і шмат іншых. Так, напрыклад, на пляцоўцы беларускіх народных звычаяў і абрадаў «Калейдаскоп святочных цудаў» была створана сапраўдная майстэрня дзіцячых творчых вынаходак і рамёстваў пад назвай «Беларускі каларыт». Адна з гарадскіх пляцовак «Ствараем узоры ручніка» прадставіла сумесную творчасць усіх удзельнікаў свята і ўключала майстар-класы, інтэрактыўныя заняткі, выставы-экскурсы. Таксама быў арганізаваны гульнёвы падворак са старажытнымі народнымі гульнямі, жартоўнымі спаборніцтвамі «Забаўлянкі ад Яся ды Янкі» ўстаноў адукацыі Гомеля. Арганізацыя такіх пляцовак далучае наведвальнікаў фестывалю ў гульнёвай форме, асабліва дзяцей малодшага ўзросту, да традыцыйнай культуры Беларусі. Майстар-класы і гульні, захапляючы дзяцей, тым часам знаёмяць іх з культурнымі традыцыямі Беларусі. Некаторыя з дзяцей цікавяцца і пачынаюць займацца пляценнем, ці лепкай больш на прафесійным узроўні, тым самым захоўваючы і працягваючы традыцыйную культуру. З гэтай прычыны майстар-класы з’яўляюцца найбольш актыўнымі спосабамі папулярызацыі традыцыйнай культуры, так як яны даюць магчымасць дакрануцца прысутным да традыцыйнай культуры ў прамым сэнсе гэтага слова, паспрабуючы самастойна вырабіць нейкую рэч, ці сувенір.

Папулярызацыі традыцыйнай культуры Беларусі садзейнічаюць сродкі масавай інфармацыі. Найбольш актыўную пазіцыю сярод якіх займаюць газеты, тэлебачанне, радыё. Найбольш значную ролю сярод газет, якія асвячаюць галоўныя падзеі фестывалю, выконваюць такія газеты як «Гомельская праўда», «Гомельскія ведамасці», «Вячэрні Гомель». Тэлерадыёкампанія «Гомель» і тэлеканал «Першы гарадскі канал» заўсёды асвятляюць асноўныя моманты фестывалю. Нельга не адзначыць і дзейнасць радыё «Гомель FM», радыё «Гомельскае гарадское радыё», якія таксама паведамляюць слухачам асноўныя мерапрыемсты, якія праводзяцца ў Гомелі. На афіцыйных сайтах Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта і Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта размяшчаюць асноўную інфармацыю па правядзенню фестывалю «Сожскі карагод», яго праграму і ўсе мерапрыемствы, якія ладзяцца ў яго межах. Пасля заканчэння фестывалю на гэтых сайтах можна азнаёміцца са завесткамі аб пераможцах фестывалю.

Такім чынам, дзякуючы правядзенню Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» адбываецца папулярызацыя традыцыйнай культуры Беларусі. Гэта стала магчымым у тым ліку і таму, што ў конкурсную праграму была ўведзена намінацыя «Фальклорна-бытавы танец». Такі падыход дае магчымасць нараду з прадстаўнікамі іншых народаў, якія ўдзельнічаюць у фестывалі, у поўным маштабе прадэманстраваць беларускую традыцыйную культуру праз народную харэаграфію. Таксама папулярызацыі традыцыйнай культуры садзейнічаюць выставы, кірмашы і майстар-класы, якія плануюцца на фестывалі. Усе мерапрыемствы па папулярызацыі традыцыйнай культуры шырока прадстаўляюцца сродкамі масавай інфармацыі. Актыўную пазіцыю ў правядзенні дзейнасці па папулярызацыі традыцыйнай культуры Беларусі займаюць такія ўстановы культуры як гарадскія і раённыя цэнтры культуры, дамы рамёстваў, дамы народнай творчасці. Дзякуючы названым установам, традыцыі народных танцаў і рамёстваў працягваюць не толькі захоўвацца ў культуры Беларусі, але і эфектна дэманструюцца публіке. Створаны ўмовы для сучаснага развіцця народных танцаў, рамёстваў, навучання моладзі, падтрымкі народных майстроў, што у пэйнай ступені адлюстроўвае фестываль «Сожскі карагод». Папулярызацыя традыцый беларускіх народных танцаў сярод насельніцтва ўвогуле садзейнічае сувязі пакаленняў, умацаванню родных каранёў.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1 Культура Беларусі: 20 год развіцця (1991–2011) / С. П. Вінакурава [і інш.]; І. І. Крук (навук. рэд.). – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2012. – 327 с.

2 Чурко, Ю. М. Белорусский народный танец. Историко-теоретический очерк / Ю. М. Чурко. – Минск : Наука и техника, 1972. – 196 с.

3 Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш]. – Мінск : Вышэйшая школа, 2013. – 1231 с.

4 Условия проведения конкурсов в рамках VIII Международного фестиваля хореографического искусства «Сожскі карагод» [Электронны рэсурс] // Гомельский городской исполнительный комитет. – Рэжым доступа: http://gomel.gov.by/Files/kultura/2016/ Usloviya2016.doc. – Дата доступа: 20.09.2017.

5 Победители VIII международного фестиваля хореографического искусства «Сожскі карагод» [Электронны рэсурс] // Гомельскі гарадскі выканаўчы камітэт [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.gorod.gomel.by/Culture/sogskikaragod/fotoalbom/VIIIFestival / Pobediteli2016.aspx. – Дата доступа: 20.09.17.

УДК 327(4) 351.852

**А. А. ГУЖАЛОЎСКІ**
(Мінск, УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт»)

## ПАЛІТЫКА ЕЎРАІНТЭГРАЦЫІ І МУЗЕІ

*Аўтар спрабуе вызначыць музейную палітыку, якая праводзіцца кіраўніцтвам Еўрапейскага Саюза ў кантэксце яго важнейшых культурных ініцыятыў. Аналізуецца шэраг афіцыйных дакументаў ЕС, дзе разглядаюцца культурныя аспекты еўраінтэграцыі, у т. л. Маастрыхцкі дагавор. Аб'яднаная Еўропа адкрыла новыя перспектывы для ўсіх накірункаў дзейнасці існуючых музеяў. Адначасова інтэграцыйныя працэсы абумовілі ўзнікнне шэрагу новых важных музейных устаноў.*

Аўтары, якія пішуць пра культурную палітыку Еўрасаюза часта спасылаюцца на фразу, сказаную адным з ідэёлагаў ЕС – французскім палітыкам Жанам Манэ. Маючы на ўвазе тую акалічнасць, што архітэктары ЕС бралі ў разлік пераважна эканамічныя і тэхнічныя аспекты інтэграцыі, не разглядаючы ўсур'ёз праблему стварэння новай еўрапейскай культурнай ідэнтычнасці, ён сказаў: «Калі б нам давялося рабіць усё нанова, дык трэба было б пачынаць з культуры» [9, p. 157]. Сёння думку пра важнасць фарміравання новай культурнай палітыкі для сбалансаванага сацыяльнакультурнага развіцця краін Еўрасаюза падзяляюць большасць калег Ж. Манэ па Еўрапарламеце. Культура з'яўляецца адной з 35 афіцыйна вызначаных сфер дзейнаці кіруючых структур Еўрасаюза.

Раздзел, прысвечаны культуры Дагавора аб Еўрапейскім Саюзе, падпісанага ў 1992 г. у Маастрыхце і дапрацаванага ў 1997 г. у Амстэрдаме і ў 2009 г. у Лісабоне выглядае наступным чынам:

1. Еўрасаюз, паважаючы нацыянальную і рэгіянальную ўнікальнасць, спрыяе культурнаму развіццю краін-сябраў і ў той жа час фарміруе агульнаеўрапейскую культурную спадчыну.

2. Еўрасаюз умацоўвае супрацоўніцтва паміж краінамі-сябрамі па наступных накірунках: а) распаўсюджванне ведаў пра гісторыю і культуру еўрапейскіх народаў; б) абарона і захаванне культурнай спадчыны еўрапейскага значэння; в) культурны абмен некамерцыйнага характару; г) літаратурная і мастацкая дзейнасць, у т. л. аўдывізуальнае мастацтва.

3. Еўрасаюз і краіны-сябры прасоўваюць супрацоўніцтва з трэцімі краінамі і адпаведнымі міжнароднымі арганізацыямі ў сферы культуры.

4. Еўрасаюз падчас заключэння ўсіх дамоваў улічвае іх культурны аспект, у прыватнасці культурную разнастайнасць народаў.

5. Еўрапарламент і Еўрасавет пасля адпаведных кансультацый на нацыянальным узроўні дзейнічае ў напрамку гарманізацыі заканадаўства ў галіне культуры краін-сяброў [12, p. 48].

Першая спроба пастуліраваць у сціслым выглядзе асноўныя прынцыпы культурнай палітыкі ЕС была зроблена ў дакуменце пад назвай «Еўрапейскі план для культуры ў глабалізуючымся свеце» (2007). У гэтым дакуменце ідзе размова пра важнасць захавання культурнай разнастайнасці Еўропы, наладжвання міжкультурнага дыялогу, а таксама разумення культуры як важнага каталізатара сацыяльнага развіцця. Апошняя думка з’явілася пасля апублікавання статыстычных дадзеных пра ўнёсак культурных устаноў еўрапейскіх краін у ВУП ЕС, які складае прыкладна 2, 5 %. У снежні 2014 г. міністры культуры ЕС скарэкціравалі прынцыпы культурнай палітыкі аб’яднанай Еўропы ў дакуменце пад назвай «Праграма культурнага развіцця ў 2015–2018 гг.». У ім вызначаюцца наступныя чатыры прыярытэныя напрамкі ў культурнай палітыцы ЕС: даступнасць здабыткаў культуры для ўсіх без выключэння членаў еўрапейскай супольнасці; захаванне, вывучэнне і папулярызацыя культурнай спадчыны; новыя крэатыўныя культурныя формы і інавацыі; культурная разнастайнасць, міжнародныя сувязі, мабільнасць [1].

У бягучы час сярод палітыкаў ЕС існуюць два пагляды на культурную палітыку: ліберальны, які прадугледжвае мінімальны ўдзел дзяржавы ў «кіраванні» культурай, а таксама сістэму яе фінансавання праз гранты і кансерватыўны, прыхільнікі якога прапануюць усталяваць цэнтралізаваны кантроль культурнай дзейнасці, а таксама яе стабільную падрымку з боку дзяржавы. Прыхільнікі першага погляду жывуць у заможных краінах поўначы Еўропы, прыхільнікі другога – у значна бянейшых паднёваеўрапейскіх краінах. Выпрацоўка адзінай еўрапейскай культурнай палітыкі ўскладняецца тым, што культурныя інстытуцыі саюза трапілі ў сферу кантроля трох розных дырэктаратаў ЕС – адукацыі і культуры, інфармацыі, грамадства і медыя, а таксама рэгіянальнай палітыкі.

Нягледзячы на тое, што прадуманай, моцнай культурнай палітыкі ЕС сёння не існуе, музейныя праекты, разам з адукацыйнымі, а таксама аўдыёвізуальнымі шчодра фінансуюцца. Некалькі агульнаеўрапейскіх культурных праектаў, у якіх актыўна ўдзельнічалі музеі,

былі накіраваны на канкрэтныя рэгіёны, напрыклад, «Захаванне міжземнаморскай спадчыны» (2002). Важную ролю музеі адыгралі ў рэалізацыі шэрагу тэматычна арыентаваных праектах кшталту «Навука і тэхналогія для дзяцей» (2007), «Вывучаць мінулае для будучыні» (2010).

Важную ролю ў разуменні месца і ролі сучаснага музея ў сацыяльна-культурным развіцці кантынента з 2002 г. адыгрывае Еўрапейская група па музейнай статыстыцы (EGMUS). У распараджэнні групы знаходзяцца ўсебаковыя статыстычныя дадзеныя аб музеях 30 еўрапейскіх краін. Не менш важнай мэтай за збіранне статыстычных дадзеных для групы з'яўляецца гарманізацыя нацыянальных статыстычных паказчыкаў з агульнаеўрапейскімі [4].

Увосень 2003 г. быў афіцыйна прэзентаваны інтэрнэт-партал «Euromuse.net», які змяшчае інфармацыю пра выставы, што праводзяцца ў музеях мастацкага і гістарычнага профілю на ўсім еўрапейскім кантыненце. Партал быў распрацаваны лонданскай Нацыянальнай галерэяй, Луўрам, Аб'яднаннем нацыянальных музеяў Францыі, Венскім гісторыка-мастацкім музеем, амстэрдамскім Рыйксмузеўмам, Дзяржаўным мастацкім музеем у Капенгагене і Аб'яднаннем дзяржаўных музеяў Берліна. Адмініструе партал Інстытут музейных даследаванняў у Берліне. Акрамя інфармацыі пра каля 3 тыс. мінулых музейных выстаў, а таксама бягучыя выставачныя праекты, на партале сабрана інфармацыя пра фондавыя зборы 540 мастацкіх і гістарычных музеяў 28 еўрапейскіх краін [3].

Пачынаючы з 2000-х гадоў вялікія адміністрацыйныя намаганні і грошы кіраўніцтва ЕС укладае ў абмен музейнымі калекцыямі і музейным персаналам. Гэтае пытанне некалькі разоў было тэмай абмеркавання на самым высокім узроўні, у т. л. на Радзе міністраў культуры ЕС. У 2006 г. па выніках гэтых абмеркаванняў паўстала спецыяльная структура – «Экспертная рабочая група па мабільнасці калекцый». Яна распрацавала спецыяльны дакумент, дзе прапаноўваўся набор канкрэтных дзеянняў па інтэнсіфікацыі абмену музейнымі калекцыямі ўнутры ЕС з прыцягненнем трэціх краін. У ім прапаноўваліся: ідэя стварэння міжнародных і міжрэгіянальных сетак музеяў-партнёраў (мастацкіх, ваенна-гістарычных, навукова-тэхнічных і інш.), юрыдычныя і эканамічныя мадэлі страхавання калекцый, забеспячэння іх бяспецы, рэстытуцыі. Экспертная рабочая група прапанавала міністрам культуры ЕС запусціць спецыяльныя праграмы абменаў, накіраваныя на малые музеі, а таксама музеі новых цэнтральнаеўрапейскіх краін. Нарэшце, была звернута ўвага на важнасць абмену

музейным персаналам, як інструмента стварэння новай еўрапейскай культурнай ідэнтычнасці [8].

У XXI стагоддзі кіраўніцтва ЕС прафінансавала шэраг важных культурных праектаў, па якіх выразна прасочваецца яго прыярытэты ў дадзенай галіне. З 2003 г. у структуры галоўнай міжнароднай арганізацыі – Міжнароднага савета музеяў (ICOM) пры фінансавай падтрымцы ЕС дзейнічае рэгіянальная арганізацыя ICOM–Europe. У якасці сваёй галоўнай мэты гэта арганізацыя абрала ўмацаванне сувязяў і лепшага паразумення паміж музеямі і музейнымі супрацоўнікамі геаграфічнай Еўропы [7, p. 62].

З Мірскага гета ўдалося выратавацца, па розных крыніцах, ад 200 да 300 чалавек. Ратаванне стала магчымым дзякуючы перакладчыку каменданта Міра Освальду Руфайзэну. Руфайзэн выпадкова пачуў размову па тэлефоне каменданта Міра з начальнікам жандармерыі ў Баранавічах, які паведаміў дату ліквідацыі гета – 13 жніўня 1942 г. Будучы звязаны з людзьмі з гета, Руфайзэн папярэдзіў іх аб запланаванай акцыі і змог перадаць больш за дзесяць вінтовак.

У дзень ўцёкаў – 10 жніўня 1942 г. – Руфайзену ўдалося адправіць большасць паліцэйскіх па фальшывай наводцы ў антыпартызанскі рэйд, і вязні гета змаглі збегчы, не скарыстаўшыся зброяй. Так ці інакш, змаглі гэта зрабіць толькі маладыя. Як успамінае адзін з тых, хто выжыў у Мірскім гета, Эля Міранскі, прыйшлося выскокваць з вельмі высока размешчаных вокан на замкавы вал:

– «Все молодые были, все старые осталися у гетто, мама, папа, всех убили, всех стариков убили. … Жили в замке, а кругом была гора такая. Из окон мы падали прямо на землю. … Окна были высокие, гора была вот так, скатились вниз. Через окна мы вышли. Там побитые окна. … Я убежал из братом, но много кто убегали. 200 с чем-то человек. … Не я один, прыгнули много. Мы были вначале все вместе, потом разделились по группам» [11].

На наступны дзень пасля ўцёкаў бургамістр абвясціў, што яўрэі могуць вярнуцца, гэта бяспечна. Уцекачы не мелі ні ежы, ні адзення, не маглі спадзявацца на дапамогу сялян. Зусім разгубленыя, не ўяўляючы, як яны могуць выжыць, некаторыя вярнуліся ў гета [12, с. 107].

Выжыўшыя ў Мірскім гета пакінулі страшныя ўспаміны пра апошнія дні, калі яго насельнікі ўсведамлялі непазбежнасць надыходзячай смерці, развітваліся, рыхтаваліся, хтосьці наклаў на сябе рукі. Некаторыя змаглі прарвацца праз ачапленне, спрабавалі схавацца ў замку ад катаў… [5; 12, с. 107].

У бліжэйшым лясным урочышчы загадзя былі падрыхтаваныя ямы. За суткі да ліквідацыі гета было ачэплена. На дапамогу мясцовым

паліцыянтам прыехала паліцэйскае падраздзяленне з Баранавічаў. Тых, хто застаўся ў гета, а гэта былі ў асноўным жанчыны, дзеці і старыя, усяго 560 чалавек, вывезлі ў Яблонаўшчыну і расстралялі. Неяўрэйскае насельніцтва, вядома ж, не магло ня ведаць, што адбывалася ў гета, падчас экспедыцыі мы запісалі сведчанні пра тое, як яўрэяў вывозілі з замка.

– «Усё было абкручана калючай провалкай, вал стаяў, будачка стаяла, дзе паставы стаяў… ужэ кагда вывозили, на вярху стали пулямёты кругом, па валу» [4].

– «Когда расстреливали евреев, их садили в грузовые машины и везли в лес. Там ручеек протекал, в нем вода красная была от крови. Скота так не б'ют, як білі яўрэяў» [13].

З болем успамінаюць знаёмых, якія мелі магчымасць выратавацца, але не маглі пакнуць сваіх родных:

– «Вот с нами работал Ицко шорником. А у него была жена и дочка у этым гете. И он приходил к нам, так и мы ему приносили что-нибудь покушать. И я говорил ему: «Ицко, уцякай оттудова, там же можно, вот днем выйди, днем никакой охраны. Ежели вот так напрямую в Володерово иди, там найдешь партизан». – «Нет, не пойду, а куда жена, дочка? Не пойду, я вместе с ними. Так Бог решил, что мы должны погибнуть». Настолько религиозные, что они добровольно шли» [14].

– «Один из наших хлопцов, Ромэк Жабик. Погрузили его вести на расстрел, и его погрузили с женой и с дочкой. Ему, видимо, специально дали, чтобы утечи. Тот, который вез на расстрел, дал бумажку: занеси в контору. А машина стояла – даже не видно было от конторы. И этот принес в контору бумажку, и сам пришел в машину, сел. Потому что жена там с дочкой. Да и я бы сам не смог бы» [14].

Акрамя ўцекачоў з гета, мала ў каго атрымалася пазбегнуць смерці, схаваўшыся ў падвалах замка або прарваўшыся праз ачапленне, калі грузілі на машыны. Засталася ў жывых аптэкар Ганна Хаймович з дачкой Сарай. Ёй удалося вывесці дачку з гета і схавацца ў аптэцы. Пазней, атрымаўшы папярэджанне, што іх збіраюцца расстраляць, Ганна і Сара Хаймович збеглі ў лес [12, с. 107]. Таксама немцы пакінулі ў жывых краўца Песаха Жухавіцкага.

Уцекачы заставаліся па-ранейшаму ў вялікай небяспецы. Паўстала праблема фізічнага выжывання ў лесе без ежы, без даху над галавой, часта без неабходнай вопраткі і абутку. Пастаяннай была пагроза паліцэйскіх аблаў, з іншага боку, партызанскія атрады таксама неахвотна прымалі не маючых зброі, непадрыхтаваных да

ваеннага жыцця яўрэяў. Не апошнюю ролю ў гэтым нежаданні прымаць яўрэяў адыгрываў антысемітызм у партызанскіх атрадах.

Пасля ліквідацыі гета на працягу некалькіх месяцаў паліцыя праводзіла рэйды ў пошуках ўцекачоў. У данясенні ў баранавіцкую жандармерыю ад 15 лістапада 1942 г. гаворыцца пра тое, што ляснік далажыў ў паліцыю аб бункеры, у якім хавалася «хеўра яўрэяў». Туды адправілі трох жандарскіх афіцэраў і 60 шуцманаў, якія выявілі ў бункеры траіх яўрэяў і расстралялі іх на месцы [15]. Мірыям Лідэр успамінае, што іх хованка ў лесе было выяўлена немцамі 15 сакавіка, то бок, праз сем месяцаў пасля ліквідацыі гета [5].

У такіх ўмовах немагчыма было выжыць без дапамогі мясцовых сялян, хоць гэтая дапамога ставіла іх ў рэальную небяспеку. Як сказаў адзін з нашых рэспандэнтаў, «былі такія, каторыя пратaлі... Но кажды баяўся за сваю шкуру, яго бы растралялі. Былі случаі, кагда іх і скрывалі, хоць сабою жэртвавалі, былі такія случаі, хоць і сабою жэртвавалі» [16].

Тыя, хто перажыў Халакост, з удзячнасцю ўспамінаюць пра дапамогу. Піша Сара Ландэр: «А дальше была война, страшная и дикая, не на жизнь, а на смерть. И в этой войне мы с мамой остались живы только благодаря семье Вильчицких, которые, рискуя собственной жизнью, помогали нам избежать гибели от рук фашистов. И мне очень горько осознавать, что из-за некоторых нюансов я не смогла их представить на присвоение звания «Праведник мира», ныне учрежденного в Израиле» [12, с. 103].

Мірыям Лідэр ўспамінае пра сваё ратаванне сям’ёй Стэльмашык [5].

Жыхары Міра Соф’я і Ігнат Ермаловічы выратавалі шэсць яўрэяў ад растрэла 9 лістапада 1941 г., схаваўшы іх у хляву. Адна з іх, Цыля Капелевіч, збегла разам з іншымі з гета ў замку 10 жніўня 1942 г. Прабадзяўшыся 3 дні ў лесе без вады і ежы, яна зноў прыйшла да Ермаловічаў, якія змаглі пераправіць іх у сямейны партызанскі атрад братоў Бельскіх. 26 лістапада 1995 г. Яд ва-Шэм прызнаў Соф’ю і Ігната Ермаловічаў Праведнікамі народаў сусвету [17; 18].

Нашы інфарманты ўспаміналі пра свой удзел у ратаванні яўрэяў:

– «В замке было гетто. Однажды еврей пришел ко мне и попросил спрятать его. Я сказала, что не могу этого сделать, но отправила его на глухое место, где он мог отсидеться» [1].

– «У нас тут еврейка во время войны прятались, Зоя Мироновна. Да как пряталась, это только в начале! Потом ушла в партизаны с двумя грудными детьми. Она была врач. Прятали мы и других евреев, потом отправляли в партизаны. Потом уцелевшие евреи, как освобождали Мир, приносили нам одежду да еду. Как-то два еврея,

когда уезжали в Польшу, обещали моему отцу: если мы доберемся туда, куда хотим, мы тебя озолотим! Но они как-то быстро умерли. Мы потом их детей здесь видели» [18].

– «Яўрэі ў лясу хаваліся. З дзеткамі малымі прыбягалі. Іх пабілі і мала уцякло. Помню, дзве девачкі малыя, бедна то дзіцятка [плача], дык дасі ім. Яны картошачку ў лупінах – дык рукі ў іх трасуцца, так і самі мы елі. Не дай Бог, дзеці, вайны. Бывае, што дзеткам тым шматку якую дасі (яўрэйскім), бо босыя зімой хадзілі. Яно ж ці рускія, ці яўрэі, ці палякі – усе ж чалавек той» [19].

Многія яўрэі знайшлі ратаванне ў партызанскіх атрадах. Улічваючы бежанцаў, Мірскае гета за ўсю гісторыю існавання налічвала 6 тысяч чалавек [20, с. 272]. Пасля вайны ў Міры засталося каля 40 яўрэяў. Насельніцтва ж Мірскага раёна за гады нацысцкай акупацыі скарацілася з 6 тысяч да 1,85 тысяч чалавек [21, с. 605].

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1 Інтэрв’ю з Б. Соф’яй Якаўлеўнай, 1925 г.н.
2 Інтэрв’ю з Б. Пятром Аляксеевічам, 1922 г.н.
3 Інтэрв’ю з Н. Верай Якаўлеўнай, 1922 г.н.
4 Інтэрв’ю з М. Верай Сідараўнай, 1935 г.н.
5 Swirnowski-Lieder, Miriam. The German Occupation and Liquidation of Mir / M. Swirnowski-Lieder // Mir Memorial Book [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.jewishgen.org/yizkor/mir/mir013.html #INTRODUCTION. – Дата доступа 16.07.2015.
6 Дын, М. Мікракосм: Халакост, калабарацыя і супрацiў у Мірскім раёне, 1941–1944 гг. / М. Дын // Arche. – 2013. – № 1. – С. 324–362.
7 Дин, М. Пособники Холокоста. Преступления местной полиции Белоруссии и Украины, 1941–1944 / М. Дин. – СПб. : Академический проект: Изд-во ДНК, 2008. –268 с.
8 Архіў Яд Вашем. – М.49. Е. ZIH. – С. 727.
9 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 845. Воп. 1. Спр. 6. Л. 53.
10 Tec, Nechama. In the Lion's Den: The Life of Oswald Rufeisen / N. Tec. – Oxford University Press, 1990.
11 Архіў Мемарыяльнага Музея Халакоста ў Вашынгтоне (USHMMA). – RG-50.106*0206.
12 Новицкая, О. В . Материалы о Великой Отечественной войне из частных архивов и музейных коллекций для экспозиции Мирского замка / О. В. Новицкая, Л. Е. Прокопенко // Мірскі замак. Крыніцы стварэння музейных экспазіцый / рэд. Н. М. Усова. – Мінск : Мэдысонт, 2013. – 244 с.
13 Інтэрв’ю з С. Алегом Мікалаевічам, 1935 г.н.

14 Інтэрв'ю з Л. Уладзімірам Уладзіміравічам, 1922 г.н.
15 Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 995. Оп. 1. Д. 4. Л. 211.
16 Інтэрв'ю з К. Мікалаем Лявонцявічам, 1923 г.н.
17 Навіцкая В. Пра дачку каваля / В. Навіцкая // Культура. – 2012. – № 12. – С. 14.
18 Інтэрв'ю з М. Міхаілам Паўлавічам, 1926 г.н.
19 Інтэрв'ю з Н. Марыяй Антонаўнай, 1921 г.н.
20 Ботвинник, М. Памятники геноцида евреев Беларуси / М. Ботвинник. – Минск, 2000. –326 с.
21 Холокост на территории СССР / гл. ред. И. А. Альтман. – Москва, 2011. – 1143 с.

УДК 391(11)

**М. А. МІХАЙЛЕЦ**
(Мінск, УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт»)

# РАМАН ФЛАРЫЯНА ЧАРНЫШЭВІЧА «НАДБЯРЭЗІНЦЫ» ЯК КРЫНІЦА ВЫВУЧЭННЯ КУЛЬТУРЫ ПАЛЯКАЎ УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

*У артыкуле дадзена характарыстыка рамана Фларыяна Чарнышэвіча «Надбярэзінцы» як крыніцы вывучэння культуры дробнай польскай засцянковай шляхты Магілёўшчыны пачатку XX ст. Робіцца вывад, што найлепш у творы апісана сацыяльная культура гэтай групы, прадстаўленая ў шырокім кантэсце тагачаснай культурнай і палітычнай сітуацыі на беларускіх землях.*

Мэта артыкула – ахарактырызаваць раман Фларыяна Чарнышэвіча «Надбярэзінцы» як крыніцу па культуры дробнай польскай шляхты Магілёўшчыны пачатку XX ст.

Асноўная крыніца даследавання – тэкст рамана «Надбярэзінцы», які ў 2017 г. быў апублікаваны ў перакладзе на беларускую мову. Аўтар карыстаўся як арыгінальным польскім тэкстам, так і перакладам на беларускую мову. Спасылкі пададзены на беларускі тэкст, як на нашмат больш даступны.

Раман Ф. Чарнышэвіча «Надбярэзінцы» упершыню апублікаваны ў 1942 г. у Буэнас-Айрэсе. Яго аўтар нарадзіўся ў Бабруйскім павеце ў 1900 г. і паходзіў з дробнай шляхты. Ён правёў на беларускіх землях

сваё дзяцінства і юнацтва, ўдзельнічаў у тагачасных бурлівых ваенных і палітычных падзеях. Як першыя рэцэнзенты (Марыя Чапска, Чэслаў Мілаш, Міхал Крыспін Паўлікоўскі) [1–3], так і сучасныя даследчыкі (Лешек Беднарчук, Ірыда Грэк-Пабіс, Марыя Задэнцка, Аляксандр Пашкевіч) падкрэсліваюць дакументальную дакладнасць твораў Ф. Чарнышэвіча [4–7]. І. Грэк-Пабіс нават склала слоўнік з 710 слоў і выразаў, характэрных для польскай мовай «усходніх крэсаў». Не толькі лінгвісты могуць разглядаць раман Ф. Чарнышэвіча ў якасці крыніцы, але і этнолагі знойдуць у ім шмат каштоўнай інфармацыі аб розных баках культуры дробнай засцянковай шляхты усходнебеларускіх зямель. Апошнім часам цікавасць да творчай спадчыны Ф. Чарнышэвіча ўзрасла. Прыхільнікі яго творчасці нават здзяйсняюць падарожжы па мясцінах, якім прысвечаны ягоныя творы [8].

Перш за ўсё «Надбярэзінцы» малююць шырокую карціну унутранага свету польскіх шляхецкіх асяродкаў на Магілёўшчыне і адначасова агульнай культурнай і палітычнай сітуацыі на гэтых землях у 1917–1920 гг. Таму ў творы найбольш дакладна адлюстравана сацыяльная культура ў шырокім значэнні: рэшткі самакіравання шляхецкай супольнасці пры ўсё большым аслабленні ўнутрыгрупавых сувязей, адносіны з беларускімі сялянамі, «абеларушванне» часткі шляхецкіх сем'яў і нават цэлых засценкаў. Вельмі выразна апісана сітуацыя ў мястэчковай школе, дзе навучаліся і беларусы, і палякі і рускія, і яўрэі. Часта ў рамане сустракаюцца сцэны, у якіх адлюстраваны адносіны польскай меньшасці з беларускімі сялянамі. Даволі часта сустракаюцца ў Ф. Чарнышэвіча апісанне асобных элементаў сацыяльнай культуры. Напрыклад, пачынаецца раман са сцэны сустрэчы дзеда і ўнука з леснікам: «…павітаўся, здымаючы шапку: – Хай будзе пахвалёны Езус Хрыстус!

Ён схіліўся да рукі старога і гучна прыцмокнуў, цалуючы.

– На вякі вякоў! – азваўся стары і пацалаваў лесніка ў патыліцу.

Ляснік, у сваю чаргу, падаў руку для пацалунку хлопчыку. […]

Развіталіся як заўсёды – малодшыя пацалавалі рукі старэйшым – і разышліся…» [9, с. 26–29].

Ёсць у «Надбярэзінцах» апісанне вячорак [9, с. 181–185, 262, 378], мужчынскіх і жаночых заняткаў, сватання [9, с. 268–285] і вяселля [9, с. 287–290], хаўтураў [9, с. 247, 472–488] і інш.

Надзвычай добра ў рамане адлюстравана культура матэрыяльная. Так, неаднаразова ў творы апісваецца адзенне персанажаў:

«Пад сярэднім подкурам спыніўся барадаты сівы стары ў будзённай засцянковай апратцы: цесная шляхецкая шапка, чорны крамны пінжак,

даматканыя клятчастыя штаны і вялікія боты з халявамі гармонікам. У адной руцэ вясло, у другой – торба з рыбаю. Побач з ім – хударлявы хлопчык гадоў дзевяці, босы, у паношанай канфедэратцы і зрэбным споднім» [9, с. 25]. Крыху далей так апісаны ляснік: «Гэта быў мужчына пад сорак, рослы, мажны, з чырвоным як буряк тварам і рудаватай кароткай барадой. Насіў ён палінялую канфедэратку, кароткую бурую світку, шэрыя ваўняныя даматканыя штаны і лапці. На грудзях перакрыжоўваліся два шырокія рамяні: адзін – ад стрэльбы, руля якой вызіралася з-за пляча, другі – ад паляўнічай, з казінай скуры, торбы, што матлялася каля левага сцягна. На рамяні ад торбы насупраць сэрца – жоўтая бляха шырынёй з далонь і з выбітым надпісам па-руску: «Лѣсной сторож»» [9, с. 26].

Адзенне на свята: «Назаўтра ён устаў на світанні, хутка ўмыўся, надзеў крамны гарнітур, новую чорную канфедэратку, паклаў у торбу боты, вузялок з ежай – каб колькі разоў падсілкавацца, завязаў, начапіў на кій, закінууў на плечы…» [9, с. 95]. «Убраныя ўсе былі святочна і па-польку: хлопцы – у крамных гарнітурах, пашытых па-местачковаму, у канфедэратках ці кепі, дзяўчаты – у гладкіх цёмных спадніцах, муслінавых кофтачках і квяцістых хустках, завязаных пад косамі, альбо ў ядвабных шалях. Усе, апроч дарослых хлопцаў, ішлі басанож, несучы абутак у руках» [9, с. 101].

Адзенне дзяўчыны: «На ёй была гладкая блакітная спаднічка і белая як снег блузка, шырокая ўнізе. Каса была скручаная ў акуратную куклу, густа ўсаджаную грабеньчыкамі, на лоб спадала маленькая грыўка, закручаная па модзе. На шыі паблісківалі дзве ніці буйных пацерак з крыштальнага шкла. Да грудзей яна прычапіла букецік з палявых браткаў» [9, с. 378].

Дадзена ў рамане і характарыстыка асобных бакоў народнай архітэктуры. Перш за ўсё, аўтар апісаў шляхецкі засценак: «У выглядзе Аколіцы не было ні парадку, ні прыгажосці. Тут пераважалі старыя і нізкія будынкі, што грувасціваліся без аніякага ладу. Там, дзе ў аднаго гаспадара стаяла хата, другі прыбудаваў хлеў ці стадолу – і наадварот. Падворкі і завулкі, якімі быў аплецены ўвесь засценак, размяжоўваліся жардзяннікам. Сады – якія ў каго былі – хаваліся паміж будынкамі. Адзінай аздобай вёскі былі старыя дубы і яліны з буслінымі гнёздамі наверсе – іх у засценку было больш за дзесяць. Тым не менш вялізныя стадолы і шматлікія стагі сена ці збожжа ля іх сведчылі пра заможнасць мясцовых гаспадароў» [9, с. 179].

Вось так выглядала леснічоўка: «Гэта была палянка моргаў на шэсць, якая, з усіх бакоў акружаная пушчай, выглядала нібыта

агромністая скрыня паміж высокімі й цёмнымі сценамі лесу. Збожжа на полі расло толькі яравое (бо землі нізкія), але буйное. Пабудовы старыя, крытыя саломай і сасновым дзёрнам. Хата з адным пакоем і вялікімі сенцамі. Дзядзінец агароджаны парканам, а клумбы пад вокнамі – частаколам, пераплеценым яловымі галінкамі» [9, с. 96].

Так выглядала хата на Сёмуху: «Падлога вышараваная, чысцюткая, ні пылінкі. Грубка, як снег, свежапабеленая. Зверху балдахін з густа натыканых пад бэлькі кляновых галінак. Сцены ў арабіне, бярозках, абразы ў вяночках з кветак, на канапах і вокнах вазоны, на стале побач з распяццем, літым з жалеза, два букеты лясных кветак. […] У вокнах з боку дзядзінца віднеліся клёны, бярозкі, арабіны, якімі звычайна напярэдадні Сёмухі абсаджваюць падворкі і вуліцы» [9, с. 440–441].

У агульных рысах апісана мястэчка: «Цяпер Вонча – мястэчка, такіх на крэсах шмат. Драўляныя пабудовы, вуліцы без бруку і без ходнікаў. Шмат габрэяў, крамы, рамеснікі, млын, царква, манаполька, пошта, сінагога і народная школа на чатыры класы, адзіная на трыста пяцьдзесят квадратных вёрст. Будынак – невялічкі, старасвецкі, амаль такі самы, як дыхтоўная гаспадарская хата: па адным баку – навучальны клас з нізкай столлю, па другім – настаўніцкае памяшканне з вялікай печкай пасярэдзіне, сенцамі і кладоўкай» [9, с. 48].

А вось як выглядала ідэальная сядзіба на думку аднаго з галоўных герояў: «Я папрашу, каб мне далі той пагорачак каля старыцы, што насупраць смалярскага Чуба, адкуль яна будзе бачыць свой родны засценак. У старыцы добрага поля з восем дзесяцін будзе, а калі ў ляску, што яе атачае, роў выкапаць, то, як той казаў, і вада будзе пранне паласкаць, і лугавіна.

Будынкі пастаўлю шырока – дзядзінец будзе вялікі. Хата стане каля той купы бяроз, якія я ад усяго лесу спецыяльна для аздобы пакіну. Падмурую яе камянямі высока, як у Пятроўскага, сцены будуць сасновыя, часаныя, пакрытыя гонтай, вокны зраблю светлыя і прыстаўлю разьбяны ганачак, з лаўкамі па баках для сядзення і фігурнымі ліштвамі пры дашку.

Святліцу пастараюся зрабіць як для князёў. Столь падаб’ю дошкамі, сцены атынкую, як у камяніцы, падлогу выгаблюю і да таго ж яшчэ высцелю … чым высцелю? Сукном? Не. Футрам? Так, футрам … Воўчым футрам… Усю святліцу высцелю воўчымі скурамі…» [9, с. 435].

Ёсць у Ф. Чарнышэвіча і апісанне жылля беднякоў: «Усярэдзіне ўсё было старое і зусім убогае. Нізкую столь, якая ў цэнтры

прагіналася ўніз, падпіралі жардзіны. Вокны былі маленькія, як у лазні, многія шыбы заторкнулі старызнай. Замест зэдлікаў – калоды і стольчыкі на разнародных ножках, замест ложкаў – доўгая ляжанка ад печкі аж да супрацьлеглай сцяны. Адно печка з выведзеным на дах комінам і стол пад абразамі выглядалі па-людску. Абразы былі каталіцкія» [9, с. 210].

Не абмінуў Ф. Чарнышэвіч і такую важную частку культуры, як харчаванне, галоўным чынам святочнае: «Сняданак кабеты сёння зладзілі надзвычай шчодры: шатраваныя ячменныя бліны, мачанка з яйкамі, густа пасыпанымі скваркамі, і вэнджанымі скабкамі, на закуску – картапляныя клёцкі на малацэ і кіслае малако са смятанай і сырам» [9, с. 33]. «…потым вярталіся да радасцяў Вялікадня ў Смалярні, да яек свянцоных, варэнікаў, вэнджанай свініны, фаршыраваных парсюкоў, салодкіх сырнікаў і макароны на малацэ, да гульні ў біткі, да музыкі, танцаў і да суседскіх гавэндаў» [9, с. 93].

Вельмі цікавым з’яўляецца апісанне стаўлення акалічан да Стаха пасля таго, як ён прадставіўся семінарыстам: «Пасля сходу ў пуні акалічане пачалі ўшаноўваць Стаха як ксяндза. Вылучылі яму асобны, найлепшы ва ўсім засценку пакой – высокі, патынкаваны, з двайнымі вокнамі, з відам на садок, што падыходзіў да самага дома, на алешыну на лузе – да яго ад дома трохі менш за стаю, – і на сасновы бор удалечыні. У пакоі павысцілалі палатном сцяжынкі, каб Стах, ходзячы, не стукаў па падлозе. На ложак паклалі падушкі пад галаву і пад бок. Кожны дзень у Стаха былі свежыя парцянкі для ботаў. Ваду для ўмывання яму падавалі злёгку падагрэтай у меднай місе, а разам з ёй – барскае мыла і заўсёды свежы, толькі з-пад качалкі ручнік. Што да ежы, дык у яго надышлі сапраўдныя велікодныя святы. На сняданак была гарбата, пшанічная булка, свежы падсалажаны сыр, а часам яшчэ і блінцы, на абед – фаршыраванае парася альбо курыца, пшанічныя варэнікі, што аж плавалі ў тлушчы, прасяная каша, звараная на малацэ і прыпраўленая маслам і змяшанай з тварагом смятанай, на вячэру – шатраваныя грачаныя бліны, верашчака са свінымі рабрынкамі і макарона на малацэ. У серады і пятніцы, посныя дні, замест мяса і малочных прадуктаў яму прыносілі свежую рыбу найлепшай якасці, падсмажаную на алеі, селядцоў, аўсяны і журавінавы кісель, што запіваўся разбаўленым мёдам, мак, варэнне і пячэнне» [9, с. 193–194].

Знайшлося ў рамане месца і для характарыстыкі некаторых заняткаў і гаспадаркі ў цэлым. Так выглядала вельмі заможная гаспадарка: «Вось красуе ніва – дзесяцін на дванаццаць – буйнога,

як чарот, і густога, як шчотка, жыта. А вунь там – яшчэ адно такое ж поле шуміць яравым збожжам. Наўкола разлеглыя, як стэп, тлустыя лугі. У лесе сорак пяць галоў іхнага быдла пасецца, на папары – столькі ж свіней і ў два разы болей авечак. У іх тры пары коней, каб араць, і адна на стайні – каб выязджаць. На пасецы – 25 старых раёў. Пабудовы драўляныя, але выгодныя, усім патрэбным абсталяваныя» [9, с. 32].

Заняткі на пачатаку лістапада: «Людзі, загадзя падрыхтаваўшы хлеб, соль, дровы і смалякі на падпалку, у душы былі нават радыя гэтаму часу, калі акрамя клопатаў пра худобу, амаль ніякай работы ў гаспадарцы не было, кожны мог рабіць што яму толькі падабаецца. Усе выкарыстоўвалі гэты адпачынак: паляўнічыя цэлымі днямі ганялі па свежым снезе за зверам, старыя і хваравітыя па дваццаць гадзін на суткі адаграваліся на печы, падлеткі, якія не хадзілі ў школу, з ранку да вечара кідаліся снежкамі, бабы даймалі адна адну плёткамі, закаханыя мілаваліся пад плятнём або за печкай, рамантыкі сушылі здароўе чытаннем раманаў, пабожныя па два разы на дзень спявалі гадзінкі або з розных нагодаў чыталі Ружанец, палітыкі штодзень збіраліся ў кампаніі, спрачаючыся пра канец вайны і перамены, з імі звязаныя» [9, с. 404].

Апісаны розныя сельскагаспадарчыя культуры: «Ішло лета. Жыта выкаласілася, адквітнела і налівалася Божым дарам. На яравым полі авёс, ячмень, картопля былі ўжо па калена. У агародах вырасла з валовае вока на пажытак людзям рэпа, за гумнамі ў багнавых імхах даспявала смуродзіна. На лугах закалыхалася высокая густая трава, якая прасілася пад касу» [9, с. 448]. Садзілі бульбу, грэчку, ячмень, авёс, проса [9, с. 30], збіралі ў лесе арэхі, зімой рабілі цэбры з вёдрамі, палявалі [9, с. 31].

Такім чынам, раман Ф. Чарнышэвіча «Надбярэзінцы» з’яўляецца важнай крыніцай не толькі для вывучэння мовы польскай шляхты зямель усходняй Беларусі, але і асаблівасцяў яе культуры. Найбольш шматгранна ў рамане паказана сацыяльная культура гэтай групы ў шырокім кантэксце тагачаснай сітуацыі на беларускіх землях у цэлым.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1 Czapska, M. «Chłopcy z Nowoszyszek» Floriana Czarnyszewicza / M. Czapska // Kultura. – 1965. – № 1–2.
2 Czapska, M. Florian Czarnyszewicz / M. Czapska // Pamiętnik Wileński. – 1972. – S. 255–268.

3 Pawlikowski, M. K. Głos nadberezyńca / M.K. Pawlikowski // Wiadomości. – 1950. – № 196.
4 Пашкевіч, А. Засцянковая Атлантыда Фларыяна Чарнышэвіча / А. Пашкевіч // Чарнышевіч, Ф. Надбярэзінцы : раман у трох частках, заснаваны на рэальных падзеях / Ф. Чарнышэвіч ; пер. з пол. К. С. Маціеўскай [і інш.] ; пад рэд. М. А. Мартысевіч. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. – С. 7–21.
5 Bednarczuk, L. O języku polskim nad Berezyną / L. Bednarczuk // Stosunki językowe na ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego. – Kraków, 1999. – S. 204–215.
6 Grek-Pabisowa, I. Słownictwo kresowe z powieści Floriana Czarnyszewicza «Nadberezyńcy» : mało znane świadectwo zaginionej polszczyzny przełomu XIX i XX w. / I. Grek-Pabisowa // Acta Baltico-Slavica. – 2009. – № 33. – S. 205–228.
7 Zadencka, M. W poszukiwaniu utraconej ojczyzny: obraz Litwy i Białorusi w twórczości wybranych polskich pisarzy emigracyjnych: Florian Czarnyszewicz, Michał Kryspin Pawlikowski, Maria Czapska, Czesław Miłosz, Józef Mackiewicz / M. Zadencka // Acta Universitatis Upsaliensis. – 1995. – № 35. – 223 s.
8 Siedlar-Kołyszko, T. W Bobrujsku i Smolarni, czyli śladami «Nadberezyńców» / T. Siedlar-Kołyszko // Strona Winged Hussar. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://hussar.com.pl/artykuy-wszystkie/33-w-bobrujsku-i-smolarni-czyli-ladami-qnadberezycowq.html.
9 Чарнышевіч, Ф. Надбярэзінцы : раман у трох частках, заснаваны на рэальных падзеях / Ф. Чарнышэвіч ; пер. з пол. К. С. Маціеўскай [і інш.] ; пад рэд. М. А. Мартысевіч. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. – 664 с.

УДК 39:303.442.23(476)(091)

**Т. А. НОВОГРОДСКИЙ**
(Мінск, УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт»)

## ИСТОРИЯ ПОЛЕВЫХ ЭТНОЛОГИЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЙ В БЕЛАРУСИ

*В статье рассмотрена история полевых этнографических исследований Беларуси в середине XIX – начале XXI вв., показан вклад белорусских этнологов в развитие полевых этнографических исследований, рассмотрена роль Института исскусствоведения, этнографии и фольклора НАН Беларуси и кафедры этнологии,*

*музеологии и истории искусств БГУ в сборе и публикации полевых материалов.*

Специфику этнологических исследований составляет использование в качестве источника материалов полевых этнографических исследований или экспедиционных материалов. Использование в научных этнологических трудах полевых материалов, собранных самим исследователем, значительно повышает научную значимость таких работ. Белорусская этнология с самого своего возникновения активно и успешно проводила полевые исследования по различным этнологическим проблемам.

Первыми полевыми исследованиями на территории Беларуси можно считать этнографические экспедиции под руководством И. Лепёхина и В. Севергина. Систематическая и планомерная работа по этнографическому изучению Беларуси связана с деятельностью Русского географического общества, основанного в 1845 г. в Петербурге. В 1847 г. оно разослало этнографическую программу во все губернии Российской империи, в том числе три белорусские. В ответ на программу было собрано большое количество этнографических материалов, которые были отосланы в Русское географическое общество и хранятся в его архиве. Часть материалов была напечатана в трех выпусках «Этнографического сборника» на протяжении 1853–1858 гг. усилиями И. Юркевича, Н. Анимелле и А. Киркора.

Успешно проводил этнографические экспедиции на территории Беларуси в середине XIX века известный этнограф, краевед и путешественник П. М. Шпилевский. Результаты своего трёхлетнего путешествия он опубликовал в работах: «Путешествие по Полесью и Белорусскому краю» (1853–1855) и «Беларусь в характеристических описаниях и фантастических её сказках» (1853–1856).

В конце 50-х годов XIX века Генеральный штаб выделил офицеров, которым был поручен сбор материалов по географии, статистике и этнографии западных губерний России. В результате в 1860-х гг. появилось многотомное издание «Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба». Материалы о белорусах помещены в томах, которые посвящены Виленской, Гродненской, Минской, Смоленской и Черниговской губерниям [1, с. 55].

В 60–70-х гг. XIX в. РГО направило в Беларусь этнографические экспедиции во главе с М. Я. Дубенским, С. В. Максимовым, П. П. Чубинским, которые собирали сведения о традиционной культуре,

национальном и конфессиональном составе населения, записывали обряды, фольклор. Активизации полевых этнографических исследований содействовала деятельность Российской академии наук и Общества любителей естествознания, антропологии и этнографии, созданного при Московском государственном университете в 1864 году [2, с. 73–83].

Собирательская деятельность значительно оживилась после создания в 1867 году в Вильно Северо-Западного отдела Русского географического общества, с которым тесно сотрудничал белорусский этнограф П. В. Шейн. Заслуга П. Шейна состоит в том, что он создал на территории Беларуси сеть собственных корреспондентов на местах, котрые собирали там этнорафические материалы и отсылали их П. Шейну, а тот их активно издавал. В 1867 г. с позиций мифологической школы он разработал и издал в Витебске «Программу для сбора памятников народного творчества», котрую разослал по всей Беларуси. Она состояла из введения и трёх разделов: «Что записывать?», «От кого записывать?», «Как записывать?». Учёный в ней рекомендовал записывать в первую очередь обряды крестин, свадьбы, именин и похорон, далее – праздники календарного года. В отдельный пункт программы выделены поверья, суеверия, предания, заговоры. Сюда же включены и сказки, загадки, игры, а также разные обряды и названия мест и урочищ. В последнем (третьем) пункте перечисляются группы песен, которые необходимо записывать в первую очередь. При описании обрядов П. Шейн предлагает приводить тексты песен, которые поются в тот или иной момент исполнения обряда. На средства Академии наук этнограф совершил несколько поездок по Беларуси, найбольшую в 1877 г.

В 80–90-х гг. XIX в. сбором этнографичекого материала занимались Н. Я. Никифоровский, Е. Р. Романов, А. Е. Богданович, М. В. Довнар-Запольский, В. Н. Добровольский и др. Работа Н. Я. Никифоровского «Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности: этнографические данные» написана на источниках, которые сам автор на протяжении многих лет скурпулёзно собирал на Витебщине [3]. Современники её назвали «энциклопедией народной жизни». Она состоит из четырёх разделов. Первый раздел посвящён основательному изучению традиций питания витебского крестьянина, во втором разделе дана всесторонняя характеристика народного костюма, третий раздел посвящён подробному анализу жилища, а четвёртый – производственной деятельности белорусского крестьянина. Е. Р. Романов вместе с многочисленными фольклорно-этнографическими сведениями, собрал на Витебщине и Могилёвщине коллекцию сельскохозяйственных орудий,

рыболовных снастей, народного костюма, домашней утвари, которую передал в этнографический отдел Русского музея в Петербурге. Он внёс большой вклад в создание Этнографического отдела при Русском музее в С.-Петербурге. Учёному было поручено также присылать в музей этнографические предметы и коллекции из Беларуси: всего Е. Р. Романов передал более 1100 этнографических предметов. Причём преобладающее большинство было в оригиналах. К представленым предметам были сделаны исследователем подробные и основательные описания, которые имеют научную значимость.

В музейных коллекциях и описаниях Е. Р. Романова есть богатые материалы для изучения крестьянского жилища, костюма, традиций питания и предметов домашней утвари, а также ценные сведения по хозяйственным занятиям, орудиях труда, промыслах и ремёслах и др.

Полевые этнографические исследования на Полесье систематически проводили И. А. Сербов и А. К. Сержпутовский. Этнографические поездки И. Сербова способствовали привлечению местной интеллигенции к изучению родного края. Он был постоянным участником всех фольклорных и этнографических экспедиций Академии наук БССР. За почти сороколетний период научной деятельности учёный собрал большой фактический материал по всем проблемам этнографии белорусского народа, в том числе ценные фотографии, рисунки, нотные записи, музейные коллекции. Из них только незначительную часть он успел опубликовать до войны. Большая часть его научных записей погибла в годы фашистской аккупации Минска. Однако богатая коллекция этнографических фотографий И. А. Сербова сохранилась в рукописном отделе Национальной библиотеки в Вильнюсе. А. К. Сержпутовский разработал программу для сбора этнографических предметов в Беларуси, в которой обратил внимание на необходимость прилагать подробное описание той местности и жизни того населения, где собраны коллекции. По поручению Этнографического отдела Русского музея за десять лет учёный организовал тринадцать экспедиций и собрал свыше 2000 предметов традиционной культуры, сделал свыше 700 фотографий народного зодчества, предметов костюма, орудий труда и др.

В Западной Беларуси плодотворно работал М. Федоровский, который почи за тридцать лет собрал свыше 200 тысяч этнографических и фольклорных записей.

Значительно оживились этнографические исследования в 20-х гг. XX в., когда к сбору материалов были привлечены краеведы. Важную роль в этом сыграл печатный орган Центрального бюро краеведения –

журнал «Наш край», на страницах которого печатались программы и инструкции по описанию и изучению населенных пунктов, элементов материальной, духовной и социальной культуры, этнических групп Беларуси. После ликвидации краеведческого движения в 1930-х гг. этнографические исследования сократились. С 1931 г. главную роль в полевой этнографической работе сыграла секция этнографии Института истории АН БССР, объединенная позже с фольклорной комиссией. Сбор материалов в основном проводился узким кругом научных сотрудников. В это время появился новый метод экспедиционной работы: экспедиции стали комплексными. На всё отделение гуманитарных наук в год формировалась одна экспедиция, в состав которой входили археологи, этнографы, фольклористы, лингвисты, социологи. Наиболее типичной в смысле комплексности явилась Полесская экспедиции 1932 г. [1, с. 276]. Всего до Великой Отечественной войны в Академии наук было накоплено свыше 70 тысяч единиц этнографических описаний и фольклорных текстов, до 10 тысяч фотоснимков и 2 тысячи этнографических экспонатов. Все они были уничтожены в годы войны [4, с. 380].

После войны сотрудники возобновленного сектора этнографии и фольклора начали изучение традиционных земледельческих орудий труда, жилища, народного костюма, традиций питания, а также новых явлений в культуре сельских жителей.

В 1950–1951 гг. с помощью стационарного метода М. Я. Гринблат и Л. А. Молчанова изучали новые явления в культуре жителей деревни Велятин Хойникского района Гомельской области. Результаты своих шестимесячных исследований были ими опубликованы в «Белорусском этнографическом сборнике». Седьмой раздел «Пища и домашняя утварь» посвящён традициям питания [5]. Авторы отмечают изменения, которые произошли в культуре колхозного крестьянства, подробно описывают хлеб и мучные блюда, картофель и блюда из него, крупу и крупяные блюда, молоко и молочные продукты, мясо и мясные блюда, овощи и блюда из овощей, напитки, посуду, которая использовалась для приготовления пищи. М. Я. Гринблат и Л. А. Молчанова подчеркивают, что в меню местных жителей появились новые, ранее почти неизвестные в деревне блюда: мясные котлеты и винегрет. На завтрак местные жители пекут блины или драники, яичницу с салом, варят картофель, подают кислое молоко. К обеду готовят капусту, бульон с мясом, молочные крупники. Вторым блюдом на обед бывают каши, картофельные и мучные блюда: налисники, вареники, бабка, жароники и т. д., а в качестве напитков пьют парное молоко или взвар

(компот из сухофруктов). На ужин готовят солоники, комы, смажоники, которые едят или с растопленным салом, или с кислым молоком. Вечером едят также творог со сметаной. Изменения отмечали этнографы и в наборе кухонной утвари: предметы домашнего употребления, посуда почти исключительно покупные. Каждый член семьи кушает из отдельной посуды. Также подробно описаны изменения в других элементах культуры в послевоенной деревне.

Систематические полевые этнографические исследования во всех историко-этнографических регионах Беларуси начали проводиться после создания в 1957 году Института искусствоведения, этнографии и фольклора АН БССР с отдельным сектором этнографии. Сотрудники сектора (В. К. Бондарчик, М. Я. Гринблат, Л. А. Молчанова, Л. И. Минько, В. Н. Белявина, И. П. Корзун, Н. И. Бураковская, И. Н. Браим, В. С. Титов, А. Н. Курилович, Г. И. Касперович, Т. И. Кухаронок, Л. В. Ракова, С. А. Милюченков и др.) на протяжении 1960–1980-х гг. активно собирали материалы по актуальным проблемам белорусской этнологии. В 1965–1970 гг. была выполнена специальная программа исследований в связи с подготовкой регионального атласа Беларуси, Украины и Молдавии. Во время этнографических экспедиций было обследовано свыше 140 населенных пунктов Беларуси, в каждом из которых детально изучались народное жилище, сельскохозяйственная техника и костюм. Учёные составили 1 234 единицы этнографических описаний, накопили богатый иллюстративный материал. После обработки собранных материалов было издано три коллектиные монографии: «Белорусское народное жилище» (1975), «Народная сельскохозяйственная техника» (1974), «Белорусская народная одежда» (1975) [1, с. 287].

Во второй половине 1970-х гг. белорусские этнологи приступили к изучению изменений в культуре сельского и городского населения с использованием социологических методов. Результатом исследований стали работы «Изменения в быту и культуре сельского населения Беларуси» (1976) и «Изменения в быту и культуре городского населения Беларуси» (1976). В них затрагивается вопрос изменений, которые произошли в культуре белорусов в 20–70-я гг. XX ст. Источниками послужили материалы проведённых анкетирований и статистические данные.

В 1977 году этнографы Академии наук и музейные сотрудники начали проводить полевые этнографические исследования в связи с созданием Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта [1, с. 288]. Совместно с украинскими коллегами белорусские этнологи проводили этнологические исследования на

территории Полесья. Результатом коллективной работы явились две монографии « Общественный, семейный быт и духовная культура населения Полесья» (1987) и «Полесье. Материальная культура» (1988).

В конце XX – начале XXI вв. во время работы над многотомным изданием под общим названием «Белорусы» этнологи собирали материал во всех регионах Беларуси, который послужил ценнейшим источником для написания обобщающих томов по промыслам и ремёслам, народному зодчеству, семье, общественным традициям, фольклору и др. [6, с. 23–24].

В наше время сотрудники отдела народоведения ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы» продолжают успешно заниматься полевыми этнографическими исследованиями. На материалах полевых этнологических исследований написаны работы А. И. Локотко, В. Н. Белявиной, А. В. Гурко, Г. И. Касперович, Т. И. Кухаронок, Л. В. Раковой и др.

Полевые этнографические исследования на историческом факультете БГУ начали проводиться с июля 1998 г. вместе с археологами на Браславщине. Была создана группа, которая занималась сбором этнографических материалов. Изучались такие темы как традиции питания, родильные обычаи и обряды белорусов, народная педагогика, традиционные знания и др. Результаты исследования были изложены на научно-практической конференции в городе Браслав и напечатаны в «Браславской тетради [7].

После создания в июне 2001 года кафедры этнологиии, музеологии и истории искусств, начали проводиться самостоятельные этнографические исследования. На протяжении 20 лет руководителем экспедиций является Т. А. Новогродский. В этнографических экспедициях работали И. С. Маховская (2001–2007), С. А. Захаркевич (2008–20017), И. Г. Бочило (2016–2017). Преподаватели кафедры этнологии, музеологии и истории искусств с самого начала её создания ежегодно вместе со студентами проводят полевые этнографические исследования во всех историко-этнографических регионах Беларуси. Материалы этнографических экспедиций были напечатаны в ряде этнографических сборников [8–13]. Полевыми исследованиями зани-маются также учёные-этнологи Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины (О. Г. Ященко, Т. А. Шкрабова, Н. В. Корникова), Полоцкого государственного университета (В. А. Лобач, В. Е. Овсейчик) и др.

Таким образом, проведение полевых этнографических исследований остается актуальным и в наше время. Важно успеть зафиксировать от пожилых людей полезную для науки информацию, т. к. с каждым

годом носителей этой информации становится всё меньше. Необходимо обратить внимание на изменения во многих элементах культуры, их эволюцию и трансформацию.

### Список использованных источников и литературы

1 Беларусы : у 13 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 1995–2012. – Т. 3 : Гісторыя этналагічнага вывучэння / В. К. Бандарчык [і інш.]. – 1999. – 365 с.
2 Бандарчык, В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. / В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1964. – 282 с.
3 Никифоровский, Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности : этногр. дан. / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. тип., 1895. – [4], VIII, 552, CLIV с.
4 Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.
5 Грынблат, М. Я. Ежа і хатняе начынне / М. Я. Грынблат, Л. А. Малчанава // Беларускі этнаграфічны зборнік / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: І. С. Краўчанка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1958. – С. 40–51.
6 Навагродскі, Т. А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стагоддзях / Т. А. Навагродскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2015. – 243 с.
7 Навагродскі, Т. А. Народная кулінарыя Браслаўшчыны (на матэрыялах палявых этнаграфічных даследванняў) / Т. А. Навагродскі // Браслаўскія чытанні : матэрыялы V навук.-краязн. канф., прысвеч. 935-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьм. крыніцах, Браслаў, 27–28 крас. 2001 г. / Брасл. музейн. Аб'яд-не, Брасл. краязн. т-ва ; рэд. рада: К. Шыдлоўскі [і інш.]. – Браслаў, 2001. – С. 68–70.
8 Навагродскі, Т. А. Народная кухня маталян / Т. А. Навагродскі, І. У. Алюніна, С. А. Захаркевіч. – Мінск : [б. в.], 2009. – 99 с. ;
9 Навагродскі, Т. А. Народная кухня тышкаўцоў / Т. А. Навагродскі, І. У. Алюніна, С. А. Захаркевіч. – Мінск : [б. в.], 2010. – 195 с. ;
10 Навагродскі, Т. А. Кулінарная спадчына Белавежжа = Kulinarne dziedzictwo Białowieży / аўт. тэкста Т. А. Навагродскі; пер. А. У. Ветрава. – Мінск : [б. в.], 2010. – 51 с. ;
11 Навагродскі, Т. А. Народная кухня Гервятаў / Т. А. Навагродскі, І. У. Алюніна. – Мінск : Послед. слово, 2011. – 172 с. ;
12 Навагродскі, Т. А. Народная кухня Семежава / Т. А. Навагродскі, С. А. Захаркевіч, І. У. Алюніна. – Мінск : Вішнёўка, 2013. – 248 с. ;
13 Навагродскі, Т. А. Народная кухня Лепельшчыны / Т. А. Навагродскі, С. А. Захаркевіч, І. У. Алюніна. – Мінск : Колорград, 2017. – 528 с.

УДК 94(=162.3) (476.2) «18/19»:316.7

**В. П. ПИЧУКОВ**
(Гомель, УО «Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины»)

# ЧЕХИ БЕЛОРУССКОГО ВОСТОЧНОГО ПОЛЕСЬЯ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – ПЕРВОЙ ТРЕТИ XX ВЕКА: ФОРМИРОВАНИЕ ДИАСПОРЫ

*Рассматривается процесс складывания чешской этнической общности в регионе Восточного Полесья Беларуси. Обозначены причины формирования диаспоры, описаны некоторые аспекты ее жизнедеятельности.*

Устойчивое и массовое переселение чехов на белорусские земли началось во второй половине XIX в. В основном это было связано с глубоким экономическим кризисом, аграрным перенаселением, безработицей, «земельным голодом» в чешских землях, вынуждавшим искать места более комфортного проживания. В свою очередь, дефицит рабочей силы для помещичьих имений Беларуси, сложившийся после отмены крепостного права, способствовал активному привлечению чешских рабочих рук.

Некоторые исследователи считают, что, в первую очередь, чехи массово прибывали в южную часть Беларуси с Украины (Волынь) [1, с. 241; 2, с. 187]. Так, С. Кедярова отмечает три массовые волны немецко-чешской эмиграции с украинских земель на белорусское Полесье: в середине XIX в., в 1870 г. и в начале XX в. [3, с. 132].

Образование в Украине многотысячной чешской диаспоры сопровождалось формированием нормативно-правовой базы ее жизнедеятельности. На переселившихся чехов распространялось действие закона от 18 декабря 1861 г. «О правилах для найма землевладельцами иностранных рабочих и водворении сих иностранцев в России» с предоставлением различных льгот, особенно в случае «принятия их в русское подданство». Речь шла как о чехах, становившимися как сельскохозяйственными рабочими, так и крестьянами – собственниками земли. Отдельные законодательные акты конкретизируют практику чешского водворения: указ от 10 июля 1870 г. о чехах, «выселившихся в Волынской губернии, в числе 8 000 душ обоего пола» и указ от 31 декабря 1871 г. о чехах в Киевской губернии [4, с. 31].

Известный нам комплекс документов дает основание предположить, что основной массив чешских переселенцев прибывал на белорусское Восточное Полесье в пореформенный период непосредственно из чешских земель, входивших в состав Австро-Венгерской империи. Так, на 30 июня 1862 г. в имениях помещиков Станислава Горватта (имение Головчицы) и Александра Горватта (имение Барбаров) в Речицком уезде Минской губернии имелось 50 семейств (185 человек), «австрийских подданных, прибывших сюда по паспортам тамошнего Правительства для занятия хозяйственных работ у помещиков». Фамилии: Вахек, Карасек, Протывенский, Бачина, Богач, Поточка, Прохаска, Сынек, Шеда, Венцель, Доброва, Воженешк, Ружичка и др. [5, с. 131–136].

Применительно к данному сюжету уместно мнение инструктора Нацкомиссии ЦИК БССР Свотялиса, изложенное в документе «Материалы обследования чехов Головчицкого с/с, Наровлянского района от 19-го февраля 1931 г.». Он отмечает, что «появление чехов в местности Белоруссии происходит не от основавшихся военнопленных, как некоторые рассказывают, а привезенные батраки помещиками из Чехо-Словакии». После 1861 г. «ряд помещиков, видно, очутился без рабочей силы и начали выписывать батраков из Чехо-Словакии» [6, с. 19].

Сельскохозяйственные рабочие, в том числе и чехи, нанимались крупными землевладельцами Кеневичами в Мозырском уезде: «Wkrotce potem zarówno dziad mój, jak i ojciec sprowadzili z Czech, Sląska i Słowacji kilkanaście rodzin i osadzili ich przy folwarkach w pięciu koloniach. Po dwie kolonie przy folwarkach bryniowskich i łopczańskich, zaś jedną w Dereszewiczach. Każda rodzina otrzymala na własność dwie dziesięciny gruntu, dobrą chalupę z przyległościami» [7, s. 34].

Как отмечает известный белорусский историк-аграрник В. П. Панютич, помещики Беларуси, особенно в первое время после отмены крепостного права, часто нанимали сельскохозяйственных рабочих за границей, главным образом – в прусских и австрийских владениях [8, с. 49–50].

Прибытие чехов на Полесье непосредственно из своей материнской территории подтверждается и устными источниками – информацией местных жителей, передаваемой из поколения в поколение [9; 10].

По данным Первой Всероссийской переписи населения 1897 г. в Минской губернии из 652 жителей с родным чешским языком 522 человека проживали в Речицком и Мозырском уездах, то есть, в Восточном Полесье. Из них, «по сословиям и состояниям», «мещан»

было 63 человека, «крестьян» – 38, «иностранных подданных» – 421. При этом «по группам занятий» абсолютно преобладало «земледелие» [11, с. 80, 198–201, 228–229, 232–233].

Перепись зафиксировала, что в Мозырском уезде на хуторе Чехи Осовецкие проживало 17 человек, в поселке Чехи Каролинские – 61 человек [12, л. 93, 206]; в Речицком уезде на хуторе Чехи Барбаровские – 50 человек, на хуторе Чехи Головчицкие – 74 [13, с. 61].

Формировавшаяся в Восточном Полесье чешская диаспора была весьма разнородной по характеру хозяйственных занятий ее членов. Н. М. Филюта представляет их широкий спектр на конец XIX в. по Минской губернии в целом: хлебопашцы, поденщики, чернорабочие, прислуга, кучера, садовники, плотники, столяры, печники, сапожники, сторожа, лесничие, кузнецы, кожевенные мастера, мастера по производству стекла, мастера на железной дороге, торговцы, музыканты, учителя «сокольской» гимнастики, машинисты, техники, инженеры, пивовары, приказчики, управляющие имений и заводов и т. д. [14, с. 220].

Конкретизируем данную ситуацию на рассматриваемую территорию. В выше отмеченном документе 1931 г. отмечалось, что чехи в имении Головчицы «были скотниками, садовниками, огородниками, конюхами и кучерами, только в последнее время начали выполнять полевые работы». В целом, «чехи сгруппировались вокруг бывших усадеб помещиков» [6, с. 19].

Часть местных чехов пополняли ряды местного крестьянства, даже если до этого крестьянами не являлись. Данный сюжет наглядно иллюстрируется историей образования д. Горохов (ныне – Калинковичский район). В начале 60-х гг. XIX в. в Карповичскую волость, имение Липово, Речицкого уезда прибыло около 10 семей чехов, по устной информации, ткачей из Праги [9]. Как почти и все остальные прибывшие чехи, они были католиками по вероисповеданию. Намереваясь прочно водвориться на новом месте и иметь благоприятную перспективу для развития своих хозяйств, 28 июля 1864 г. они ходатайствуют о разрешении им перейти из австрийского в русское (российское. – В.П.) подданство и «о присоединении их к православной церкви». Данная просьба 17 семейств, насчитывающих 93 человека (фамилии: Почицкий, Паначек, Ундрачек, Моравек, Субботка, Гаек, Ружичка, Леничко, Карлик, Слезак, Смейкаль и др.), в 1865 г. была удовлетворена. В 1867 г. чехам были «предоставлены участки» казенной земли и сформировалась «новообразованная дер. Горохова» из «австрийских выходцев, принявших православие и русское

подданство». Аналогичная картина была с чехами, поселившимися в это же время в д. Волчья гора Ровенско-Слободской волости Речицкого уезда [5, с. 144–147, 309–312].

Полесские чехи были устойчивыми приверженцами римско-католической церкви. На 1897 г. из 652 человек населения Минской губернии с родным чешским языком – 473 – католики. В Речицком и Мозырском уездах совместно – из 522 – 397 [11, с. 84–85, 96–97, 104–105].

